КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 14 (1244) 2 красавіка 2016 г.

Актуальна

Профі ці вольны мастак?

30 красавіка ў Мінску ў прэс-цэнтры Беларускага тэлеграфнага агенцтва адбылася прэс-канферэнцыя "Праект Кодэкса Беларусі аб культуры: асаблівасці і навацыі".

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Навацый у "Кодэксе…" сапраўды даволі шмат. Пра многія з іх "К" ужо неаднойчы пісала, а пра некаторыя было згадана падчас мерапрыемства ўпершыню. Напрыклад, праект Кодэкса аб культуры прадугледжвае, што статус творчых работнікаў — членаў творчых саюзаў — будуць пацвярджаць самі гэтыя саюзы. А вольныя мастакі маюць звяртацца па пацвярджэнне статусу ў экспертную камісію пры Міністэрстве культуры краіны. У яе склад уваходзяць старшыні або прадстаўнікі творчых саюзаў, спецыялісты вышэйшых навучальных устаноў краіны ў галіне культуры ды Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Галоўным крытэрыем пры выдачы сертыфіката творчым работнікам будзе найперш прафесіяналізм, зазначыла падчас прэс-канферэнцыі першы намеснік міністра культуры Ірына Дрыга.

— Будзе звяртацца ўвага на высокі мастацкі і прафесійны ўзровень творчасці, — сказала Ірына Дрыга. — Акрамя таго, важна, каб работы прэтэндэнтаў былі прэзентаваны публічна.

Таксама адна з новых нормаў Кодэкса аб культуры прадугледжвае, што грамадскія назіральныя камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны будуць надзелены правам уносіць уласніку (уладальніку) гісторыка-культурнай каштоўнасці прапановы аб ліквідаванні парушэнняў заканадаўства і інфармаваць пра такія парушэнні дзяржаўныя органы. Такім чынам значна пашыраецца ўдзел грамадства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны краіны, зазначыла намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Наталля Кучынская. Акрамя таго, дакументам прадугледжана стварэнне рэестру археалагічных артэфактаў, якія на 18 сакавіка 2016 года знаходзіліся ў валоданні грамадзян і юрыдычных асоб.

— Варта сказаць, што на сённяшні дзень усе нормы Кодэкса, якія тычацца аховы археалагічнай спадчыны, прыведзены ў адпаведнасць з Указам Прэзідэнта краіны № 485 ад 14 снежня 2015 года, — паведаміла Наталля Кучынская. — Да таго ж дакументам рэгламентаваны пытанні ўліку археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў, прадугледжана стварэнне абласных камісій па археалагічных аб'ектах і артэфактах, якія будуць упаўнаважаны прымаць рашэнні аб аднясенні матэрыяльных аб'ектаў да археалагічных аб'ектаў і (або) артэфактаў.

Сярод іншых навацый, якія прагучалі падчас прэс-канферэнцыі, варта адзначыць і такую: у якасці абавязковай умовы для стварэння музея ў нашай краіне Кодэксам вызначана магчымасць заснавальніка падобнай установы культуры ўвесці штатную адзінку (адзінкі) музейнага работніка. Таксама дакументам уводзіцца паняцце "цэнтралізаванае мерапрыемства", да якога аднесена культурнае мерапрыемства, якое ладзіцца па рашэнні дзяржаўных органаў і поўнасцю або часткова фінансуецца з рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў.

Нагадаем, дэпутаты разгледзяць Кодэкс аб культуры ў другім чытанні на сёлетняй вясновай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

"ЛІЧБАВЫ" ШЛЯХ СКАРЫНЫ: З КЭМБРЫДЖА Ў БЕЛАРУСЬ

На здымках, прадастаўленых Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, інтэр'еры і экстэр'еры будынка, дзе размяшчаецца бібліятэка Траецкага каледжа ў Кэмбрыджы; форзацны аркуш з экслібрысам каледжа, прычым да самой кнігі маюцца вельмі цікавыя тлумачэнні даўніх супрацоўнікаў бібліятэкі: напрыклад, "Bible: White Russian".

Працяг тэмы — **на старонцы 5.**

Соцыум

Зніжкавая "ліхаманка"

Нікога не здзівіш гучнымі акцыямі ў шоу-бізнесе. Каб лепш разыходзіліся білеты, менеджары ды піяр-агенты гатовы на многае: і ранняе браніраванне па больш танным кошце, і распродаж рэшткаў білетаў па "салодкай" цане перад самым канцэртам. Нават могуць прапанаваць купіць адзенне ў пэўнай краме на вызначаную суму ў чэку і атрымаць магчымасць патрапіць на выступленне артыстаў. Прафесійныя тэатры доўгі час трымаліся ў баку ад такіх прыёмаў. Аднак няпростыя фінансавыя ўмовы ды жорсткія законы рынку змушаюць і іх звяртацца да найноўшых маркетынгавых хітрыкаў.

Настасся ПАНКРАТАВА

Ліст з тэатра

Сухая статыстыка даводзіць тэндэнцыю мінулага года: беларусы працягваюць эканоміць на забавах, у прыватнасці радзей наведваюць храмы Мельпамены. Па даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта, летась, у параўнанні з 2014 годам, нашы тэатры не далічыліся 100 тысяч наведвальнікаў. І сапраўды, глядзельныя залы пачалі непрыемна раз-пораз свяціцца пустымі месцамі нават на тых спектаклях, якія не так даўно рабілі поўныя зборы. План напаўняльнасці залаў для тэатраў ніхто не адмяняў, таму адміністрацыі творчых калектываў і даводзіцца шукаць нестандартныя варыянты прыцягнення публікі.

Першы намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Уладзімір Рылатка мяркуе, што ў час эканамічных складанасцяў можна нешта скараціць, на нечым эканоміць, але нельга згубіць галоўнае — продажы. Справа ў тым, што традыцыя хадзіць у тэатр напрацоўваецца гадамі, але звычка абыходзіцца без яго замацоўваецца куды хутчэй. Таму гледача нельга адпускаць, у барацьбе за яго неабходна выкарыстоўваць усе магчымасці і бонусы. Напрыклад, Вялікі прапануе сертыфікаты на пакупку білетаў. "Сёння хуткасць зносін з аўдыторыяй павінна быць у дзесяць разоў вышэй. Глядач патрабуе індывідуальнай працы, — запэўнівае Уладзімір Пятровіч. — Прынамсі, калі зазначаем, што той ці іншы прыйшоў пяць разоў у тэатр, пачынаем пісаць яму лісты, індывідуальна запрашаем, часам дасылаем друкаваную прадукцыю. Каб чалавек адчуў увагу да сябе".

Час ад часу тэатр ладзіць акцыю "Білет за паўцаны": у дзень спектакля пасля 16.00 у касе Вялікага можна набыць "пропуск" у залу танней. На маё хваляванне, ці не справакуюць такія імпрэзы спад папярэдніх продажаў і, адпаведна, чэргі ля касы перад пачаткам дзеяння, першы намеснік дырэктара Вялікага тэатра зазначыў, што на любую іх назву ў афішы ў першую чаргу разыходзяцца самыя дарагія месцы. Тыя, хто можа дазволіць сабе іх набыць, не будуць адкладваць справу на апошні момант. "Сёння людзі хочуць не толькі далучыцца да прыгожага, але гэтае прыгожае яшчэ разгледзець ва ўсіх падрабязнасцях. Таму наша зніжкавая акцыя хутчэй сацыяльная, накіраваная на падтрымку не такіх заможных тэатралаў", — запэўніў суразмоўца.

Спроба — не хвароба

Не ўсе тэатральныя дзеячы пазітыўна ставяцца да вышуку новых маркетынгавых хадоў. Напрыклад, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Валерый Анісенка з запалам адстойваў меркаванне, што тэатр на першае месца мае ставіць творчасць.

Заканчэнне чытайце **на старонцы 4.**

Праекты развіцця

Савет — пра аналітыку

Наша газета стала трымае сувязь з прафесіяналамі сферы культуры, імкнучыся не толькі пачуць і зразумець сталічных і рэгіянальных спецыялістаў, але і данесці іх думкі да шырокай грамадскасці. Не менш цікава рэдакцыі ведаць меркаванне чытачоў пра наша выданне. Для дыскусіі 29 сакавіка быў сабраны рэдакцыйны савет "К" (удзельнікаў яго мы вылучылі з ліку членаў нашага вялікага — з 45 асобаў — Экспертнага савета).

Аліна САЎЧАНКА

Гэтым разам рэдакцыю "К" наведалі для размовы, якая перайшла ў фармат "круглага стала", заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь, фатограф Юрый Васільеў, старшыня Беларускага фонду культуры, старшыня Беларускага бюро ICOMOS Уладзімір Гілеп, першы намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, старшыня Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі Алена Далгаполава, народны артыст Беларусі, галоўны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя Іосіфа Жыновіча Міхаіл Казінец, дырэктар Мінскай абласной бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна Аксана Кніжнікава, дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Ляшковіч, старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца, старшыня Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, прафесар Яўген Сахута, дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы, старшыня Рэспубліканскага савета дырэктараў абласных метадычных цэнтраў народнай творчасці Алег Хмялькоў. Многія з членаў савета да пасяджэння перадалі свае пажаданні.

Кантэкст размовы будзе выкладзены ў наступных нумарах, але пазначым закранутыя на сустрэчы праблемы. Хвалююць культурную грамадскасць кадравыя пытанні ва ўстановах, стан беларускай мовы ў грамадстве, абясцэньванне традыцыйнай культуры і нават падмена паняццяў у шэрагу выпадкаў, тэндэнцыя закрыцця бібліятэк і музеяў ў выніку аптымізацыйных працэсаў, разбурэнне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, становішча з гістарычнай часткай Полацка...

Што да газеты, савет падкрэсліў вострую неабходнасць у яшчэ большай колькасці аналітычных матэрыялаў, праз якія работнікі сферы маглі б арыентавацца адносна стану спраў у галіне. Таксама ўзнімалася пытанне прыярытэтаў на палосах "К". Наогул жа ўдзельнікі пасяджэння падтрымліваюць рэдакцыйную палітыку газеты і застаюцца яе чытачамі.

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. / З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Афіцыйна

Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 сакавіка 2016 года № 110, вялікая група работнікаў розных сфер удастоеная дзяржаўных узнагарод за шматгадовую плённую працу, у прыватнасці, за заслугі ў развіцці навукі, адукацыі і культуры.

Так, медалём "За працоўныя заслугі" ўзнагароджана першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Святлана Баранок. Медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаныя акцёр кіно, тэлевядучая, член грамадскага аб'яднання "Беларуская гільдыя акцёраў кіно" Святлана Бароўская, дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вячаслаў Даніловіч і вядучы майстар сцэны тэатра-студыі кінаакцёра Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" Вера Палякова-Макей.

Акрамя таго, згодна з Указам, ганаровага звання "Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь" удастоены вядучыя майстры сцэны Тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Тамара Мужэнка і Ірына Нарбекава.

29 сакавіка падпісана пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 252, паводле якой, у прыватнасці, Ганаровай граматай за актыўную творчую дзейнасць і высокі ўзровень выступлення на пляцоўцы Нацыянальнага павільёна Рэспублікі Беларусь на Сусветнай выстаўцы "ЭКСПА-2015" у Мілане (Італьянская Рэспубліка) заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля народнай музыкі "Выцінанка" ўзнагароджана дзяржаўная ўстанова культуры "Столінскі гарадскі Дом культуры".

35 гадоў без антракту

30 сакавіка Тэатр-студыя кінаакцёра Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" адзначаў 35 гадоў з дня заснавання.

Віншаванне Кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі зачытвае віц-прэм'ер Наталля Качанава.

Майстры сцэны ў час імпрэзы. / Фота Аліны САЎЧАНКА

Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь павіншаваў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. Цёплыя словы ў дзень урачыстасцей зачытала намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Наталля Качанава. У віншаванні адзначаецца, што высокі прафесіянальны ўзровень і патрабавальнасць да фарміравання рэпертуару дазволілі тэатру стварыць шэраг яскравых спектакляў, якія выклікаюць інтарэс шматлікіх гледачоў.

Міністр культуры Барыс Святлоў уручыў шэраг узнагарод калектыву і прызнаўся, што гэтая ўстанова блізкая да Міністэрства не толькі ў прамым значэнні (месціцца трупа ў будынку кінатэатра "Масква" — акурат ля шматпавярховіка, дзе знаходзіцца Мінкультуры), але і ў самым узнёслым. Міністэрства замежных спраў у асобе намесніка яго кіраўніка Алены Купчыной таксама павіншавала акцёраў з юбілеем калектыву. Пасля афіцыйнай часткі госці імпрэзы прасякнуліся атмасферай цёплага дамашняга свята, што падрыхтавалі для іх артысты.

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь прыняў удзел ва ўрачыстасцях з нагоды Міжнароднага дня тэатра, якія адбыліся 27 сакавіка на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Пасля ўрачыстай часткі, падчас якой былі ўручаны ўзнагароды Міністэрства культуры служкам Мельпамены, адбыўся паказ капусніка "жАрт to you".

Грамату з рук міністра атрымаў галоўны рэжысёр Новага драматычнага тэатра Сяргей Кулікоўскі.

Сцэна са спектакля "жАрт to you".

Крытычная маса

Кант і такт...

XI Міжнародны маладзёжны тэатральны форум "M.@rt.кантакт", што прайшоў у Магілёве 21 — 27 сакавіка, даў не толькі мастацкія ўражанні, але і нагоду для разважанняў. Да заўсёдных пытанняў — як глядзеліся беларускія спектаклі на фоне пастановак з 9 краін і як фэсту развівацца, куды рухацца далей — далучыліся больш ёмістыя: які штуршок можа даць форум нашаму мастацтву, якія ідэі, тэхнікі ці прыёмы, заяўленыя ў спектаклях, можна падхапіць.

Надзея БУНЦЭВІЧ,
Мінск — Магілёў — Мінск

Формула форуму

За тыдзень — 20 спектакляў (і іх 23 паказы, некаторыя ішлі двойчы), штодзённыя іх абмеркаванні, эскіз да будучага спектакля "Даты" Сяргея Анцалевіча, падрыхтаваны з артыстамі Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра ў дні форума. Прытым, што некаторыя спектаклі праходзілі адначасова на розных пляцоўках, паўсюль білеты прададзены, гасцям і прэсе даводзіцца сядзець на падлозе ці стаяць. Так што "камерцыйнае заданне" (а без гэтага цяпер ніяк) выканана. І ўзнімаць яго не мае сэнсу: у пагоні за рублём (які магчыма зарабіць і інакш) можна страціць духоўныя і мастацкія каштоўнасці, набыць якія наноў каштуе куды даражэй.

Заканчэнне — **на старонках 6 — 7.**

Сітуацыя

Музыканты этна-трыа "Троіца" б'юць у званы: на бліжэйшы мінскі канцэрт калектыву білеты прадаюцца так сабе...

Алег КЛІМАЎ

Не час "Троіцы"?

Лідар этна-трыа "Троіца". / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Горш калектыў спяваць ды граць не стаў, кожны яго альбом — падзея ды адкрыццё, на замежных фэстах народ на сэтах ансамбля "каўбасіца" так, што дзесьці ў гэты момант Мік Джагер ікае. А вось на айчыне, з якой "Троіца" звязана і прыналежнасцю музычна-спеўнага матэрыялу, цікавасць да творчасці каманды... Няўжо ўсё ж такі падае? І калі так, то чаму?

— Мо не наш час, не час нашай музыкі?.. — задумваецца лідар трыа Іван Кірчук.

— Чаго ж тады, бы грыбы пасля дажджу, растуць у краіне ансамблі — эстрадныя ды альтэрнатыўныя, якія выконваюць фольк і этна? — палемізую з ім. — Праўда, пераважная іх большасць ніколі аншлаг на пляцоўцы ў 300 месцаў не збярэ…

— Можа, слухач не гатовы ўспрымаць нашы новыя песні? — варожыць Кірчук. — Не трохвілінныя, а пяці-, дзесяці хвілінныя?.. Або крызіс вінаваты і 280 — 350 тысяч рублёў за білет для людзей сума непад'ёмная? Альбо мы сапраўды дрэнна рэкламуем свае канцэрты?

Адказу ён не знаходзіць, не знаходжу і я, а таму звяртаюся па кансультацыю да тых, хто калісьці шчыльна супрацоўнічаў з гуртом. Першы з іх папрасіў не называць яго. Інкогніта ў якасці адной з версій таксама спыніўся на той, што цэннік па цяперашніх часах аказаўся высакаватым. І накідаў яшчэ некалькі меркаванняў: нецікавая (?) для публікі зала Маладзёжнага тэатра эстрады; адсутнасць нагоды (гм…) накшталт прэзентацыі новай праграмы, альбома; этна-музыка не карыстаецца сёння такім попытам, як раней (а чаго ж тады, бы грыбы, калектывы растуць?). "Але гэта ўсё "вяршкі", — рэзюмаваў мой суразмоўца. — Хутчэй за ўсё, з "карэньчыкамі" нешта не так, з самой "Троіцай", з тым, як яна вядзе свае справы ў названым кірунку. Напрыклад, я быў здзіўлены таму, што абедзве свае кнігі (для шырокага кола чытачоў) Іван Кірчук выдаў толькі на рускай мове. Частка накладаў, на маю думку, павінна была быць на беларускай".

І меркаванне другой асобы — у мінулым выпускаючага прадзюсара некалькіх альбомаў "Троіцы" Дзмітрыя Безкаравайнага. На яго думку, гаворка ідзе пра негатыўную дынаміку: за 5 гадоў гурт з вялікай аўдыторыі канцэртнай залы "Мінск" (1350 месцаў) праз Белдзяржфілармонію (650) перайшоў у Маладзёжны тэатр эстрады (250). Прытым, што рэпутацыя ў "Троіцы" па-ранейшаму ёсць, а ўзровень музыкі — тым больш. Праблема заключаецца ў слабым менеджменце, характэрным для многіх беларускіх артыстаў. Няма прасоўвання, няма якаснай працы ў сацсетках. Трыа тут досыць пасіўнае. Так, яно грае канцэрты час ад часу, але распавесці, чым адзін выступ адрозніваецца ад іншага, прыдумаць ідэю, данесці яе да шырокай аўдыторыі каманда не спрабуе. Выйсцяў два: знайсці патрэбных людзей ды аргументы для іх удзелу ў праекце альбо ўсё ж пачаць больш сур'ёзна ставіцца да гэтых справаў самім. Самаменеджмент — нармальная з'ява для калектываў, у якіх, як у "Троіцы", гэткая ж актыўнасць з канцэртамі, але тады патрэбен "апгрэйд" па гэтай частцы. "Веру, што ўсё павінна скончыцца добра", — заключыў Дзмітрый.

У этна-трыа "Троіца" паўсталі вытлумачальныя цяжкасці. Ёсць такая фраза: "Падтрымаем айчыннага вытворцу!" Музыканты — вытворцы твораў розных формаў. Я не заклікаю падтрымаць усіх нашых музыкантаў. Але заклікаю падтрымаць сапраўды выбітны беларускі гурт, песень і канцэртаў якога шмат не бывае. Афішы па Мінску расклееныя, месца і час на іх пазначаныя.

К

29 сакавіка споўнілася 75 гадоў з дня заснавання Беларускага Дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў.

У Дзяржынску, дзе знаходзіцца ўстанова, адбыліся юбілейная навукова-практычная канферэнцыя і ўрачысты канцэрт з удзелам выхаванцаў Дзяржынскай дзіцячай школы мастацтваў. З прывітальным словам выступілі кіраўнікі архіва і дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Беларусі, партнёры архіва, шэрагу работнікаў былі ўручаны падарункі і ганаровыя граматы.

Рэдакцыі газеты "Культура" і часопіса "Мастацтва" таксама сардэчна віншуюць кіраўніцтва і супрацоўнікаў архіва з юбілеем і спадзяюцца на далейшае плённае супрацоўніцтва ў агульнай справе захавання візуальнай спадчыны Беларусі!

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Галіна МАХНАЧ.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 4 777. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 1.04.2016 у 18.30. Замова 1268. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі

З музея нашай дзяржаўнасці

Да 20-годдзя Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Рэспублікі Беларусь ў Расійскай Федэрацыі дэманструецца выстава "Навекі разам". З фондаў Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці прадстаўлены шэраг цікавых экспанатаў. Напрыклад, імператарская парцаляна, вырабы з гжэльскай парцаляны, юбілейны знак "10 гадоў з Дня яднання народаў Беларусі і Расіі", набор медалёў "У памяць 200-годдзя Айчыннай вайны 1812 года". Большасць гэтых рэчаў — падарункі, якія былі зроблены расійскімі гасцямі Кіраўніку беларускай дзяржавы.

Фота прадастаўлены музеем

Страта: Ніл Гілевіч (1931 — 2016)

Нас пакінуў апошні народны паэт Беларусі...



Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч. / Фота Георгія ЛІХТАРОВІЧА

29 сакавіка вечарам прыйшла сумная вестка — памёр народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні ў сувязі са смерцю Ніла Гілевіча яго родным.

Прэс-служба беларускага Лідара зазначае, што ў спачуванні, у прыватнасці, адзначана: "Творчасць Ніла Гілевіча блізкая чытачам розных пакаленняў і па праву займае асаблівае месца ў айчыннай літаратуры. У яго паэзіі знайшлі адлюстраванне высокія маральныя ідэалы, любоў да Радзімы, павага да народа". Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што памяць пра Ніла Гілевіча як аб адным з яркіх майстроў слова захаваецца ў сэрцах прыхільнікаў беларускай літаратуры.

Калектыў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі з вялікай стратай, якую панесла беларуская культура, — смерцю народнага паэта Беларусі Ніла Сымонавіча ГІЛЕВІЧА, і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Калектыў рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва" смуткуе з прычыны смерці народнага паэта Беларусі Ніла Сымонавіча ГІЛЕВІЧА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Калектыў рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва" выказвае свае шчырыя спачуванні былому першаму намесніку дырэктара ўстановы, колішняму галоўнаму рэдактару часопіса "Мастацтва" Міколу Сымонавічу Гілю (Гілевічу) з прычыны смерці брата — народнага паэта Беларусі Ніла Сымонавіча ГІЛЕВІЧА.

Гэта публікацыя вершаў Ніла Сымонавіча — унёсак ў вянок памяці сапраўды народнага Паэта нашай зямлі.

Жыта, сосны і валуны
Дзе па роднай зямлі ні крочыў —
Скрозь — ад Прыпяці да Дзвіны —
Перш за ўсё мне ласкалі вочы
Жыта, сосны і валуны.
Дзе ў далёкіх маіх вандроўках
Я ні сніў аб Радзіме сны —
Паўставалі ў іх зноў і зноўку:
Жыта, сосны і валуны.
І па самай высокай мерцы
Мне ўжо ясна, што да труны
Данясу я не шмат у сэрцы:
Жыта, сосны і валуны.
О, сябры! Калі нешта значыць
Мой усім вам паклон зямны —
Хай і цень мой з пагорка бачыць
Жыта, сосны і валуны.

■■■

Паклон табе, мой беларускі краю!
Ты — мой, я — твой: ад роду і навек.
Я зноў і зноў да сэрца прыкладаю
Твой ліст дубовы — як чароўны лек.
За хлеб, што ем, за песні, што спяваю,
За шчасце звацца іменем тваім —
Паклон, паклон табе, мой родны краю!
Ты — мой, я — твой: усюды і ва ўсім!

■■■

Ісціна, адвечная, як свет:
Шчасце ходзіць толькі ў пары з горам.
За надзеяй — боль зняверу ўслед.
За пашанай — прыніжэння сорам.
За святлом знаходкі — горыч страты,
За агнём любві — разлукі снег.
За абдымкамі — падножка здрады...
Ісціна, адвечная, як свет.

■■■

Брат мой! Братка мой! Братачка родны!
Адкажы — сам сабе адкажы:
Чым зрабіўся табе непрыгодны
Скарб бясцэнны тваёй жа душы?
Ад чаго так бяздумна, бязмоўна
Ты яго выракаешся сам?
І чаму табе так усё роўна,
Што аборай становіцца храм?
Ці таму, што калісьці падступна
Растапталі твой шчыры давер?
Што на ніве, дзе сеяў ты рупна,
Вытраўляліся ўсходы твае?
Што ў стагоддзях варожыя збродні
Распіналі твой лёс на крыжы?
Брат мой, братка мой, братачка родны,
Адкажы — сам сабе адкажы!
Жыў ты ў горы, змагаўся ў няволі,
І канаў, і сыходзіў крывёй,
І жывым ты гарэў, а ніколі
Не саромеўся мовы сваёй.
Схамяніся ж, ачніся, агледзься!
Ды разваж, ды раздумай як след:
Што пакінеш ты з поля ў налецце?
З чым нашчадкі пакажуцца ў свет?
Ці паверыў, што род твой бясплодны,
І свой лёс прамяняў на чужы?..
Брат мой! Братка мой! Братачка родны!
Адкажы. Сам сабе адкажы!

■■■

Ты кажаш, я не ведаю вайны,
Што мне было тады гадоў замала.
Чаму ж яна мае забрала сны?
На ўсё жыццё наперад сны забрала?
Чаму ж амаль не кожнае начы
Я прачынаюся, скаваны жахам?
Хачу ад смерці лютай уцячы —
І стрымгалоў бягу аўсом няжатым,
Паўзу бульбянішчам па баразне,
Да хмызняку куляюся па пожні,
Але ратунку мне няма і ў сне —
У вочы стрэл грыміць у міг апошні...

■■■

Спявайце, юныя паэты!
Спяліце ў бурах пачуцця
Неўтаймаваны боль планеты,
Непераможны крык жыцця!
Магчыма, вам якраз і здзейсніць
Дзядоў вялікіх запавет:
Узняцца так на крыллях песні,
Каб чуў і бачыў цэлы свет!
Назло прарокам самазваным,
Што глуха каркаць пачалі,
Спявайце спевам нечуваным
На мове любай вам зямлі!
Спявайце, помнячы нязменна:
Пакуль паэты будуць пець —
Не быць Радзіме безыменнай,
Зямлі бацькоў — не анямець!

■■■

Вы шуміце-шуміце нада мною, бярозы,
Калышыце-люляйце свой напеў векавы,
А я лягу-прылягу край гасцінца старога
На духмяным пракосе недаспелай травы.
А я лягу-прылягу край гасцінца старога
Галавой на пагорак, на высокі курган.
А стамлёныя рукі вольна ўшыркі раскіну,
А нагамі ў даліну, хай накрые туман.
Вы шуміце-шуміце нада мною, бярозы,
Асыпайце-мілуйце ціхай ласкай зямлю.
А я лягу-прылягу край гасцінца старога,
Я здарожыўся трохі, я хвілінку пасплю.
Вы шуміце-шуміце нада мною, бярозы,
Асыпайце-мілуйце ціхай ласкай зямлю.
А я лягу-прылягу край гасцінца старога
На духмяным пракосе недаспелай травы.

■■■

Я хаджу, закаханы у твае краявіды,
І шапчу, як прызнанне: о, мой край дарагі!
Зноў нясу табе ў споведзь і трывогі, і крыўды,
І надзеі, і ўцехі, і любоў, і грахі...
Пасля доўгіх расстанняў і далёкіх вандровак
Я вярнуся навекі ў засень клёнаў тваіх.
Толькі з роднага долу, толькі ў роднай дуброве —
Як не дрэвам, хоць кветкай
прарасту для жывых.

2016 ГОД КУЛЬТУРЫ

Ініцыятыва — бадай самае каштоўнае, што ёсць у развіцці творчасці і культуры. І важна, што ў Год культуры гэтая ініцыятыва праяўляецца з падвоенай энергіяй. А хэштэг #2016годкультуры стаў назвай новай рубрыкі "К" і пазнакай для такіх матэрыялаў на сеціўных рэсурсах газеты.

Скансэн з крэатывам

У Год культуры спаўняецца 40 гадоў з дня нараджэння адной з самых цікавых і адметных музейных устаноў нашай краіны — Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Нейкага ўрачыстага мерапрыемства з нагоды "круглай" даты, як патлумачыў "К" дырэктар музея Эдуард Багдановіч, ладзіць у Азярцы не плануюць. Але гэта не значыць, што музейшчыкі на свята забыліся.

— Фактычна ўсе нашы акцыі, імпрэзы, падзеі, што сёлета ўжо адбыліся ці адбудуцца ў нашых наваколлях, праходзяць пад знакам святкавання 40-годдзя музейнай установы, — кажа кіраўнік айчыннага скансэну. — Гэта і Масленіца, і гуканне вясны, і Купалле...

Сярод будучых цікавых мерапрыемстваў, што плануюць зладзіць у Азярцы, — правядзенне "Беларускага weekend"у, фестывалю званарства, міжнароднай навуковай канферэнцыі ды многае іншае. Як ужо адзначалася ў мінулых нумарах "К", крэатыў музейшчыкаў дае значны фінансавы плён. Так, за 2015 год установа культуры зарабіла ў лік пазабюджэтных даходаў 2 мільярды рублёў. А з такім неабыякавым падыходам да справы, які апошнім часам дэманструюць супрацоўнікі скансэну, у юбілейны год дадзеная лічба павялічыцца…

Акрамя таго, як распавёў Эдуард Багдановіч, сёння поўным ходам ідзе рэстаўрацыя Спаса-Праабражэнскай царквы з вёскі Барань Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Названы помнік архітэктуры, пабудаваны ў пачатку XVIII стагоддзя, прэзентуе падняпроўскую школу цесляроў, сталяроў і разьбяроў ды мае ўнікальныя архітэктурныя формы і планіроўку храма. У музейнай экспазіцыі можна будзе ўбачыць розныя экспанаты, якія паходзяць з царквы: абразы, панікадзіла, распяцце, разныя дзверы і іншыя рарытэты. Акрамя таго, музейшчыкі прадставяць тут беларускую разьбу, падняпроўскі іканапіс, царкоўныя кнігі, адзенне святароў і іншае царкоўнае начынне. Урачыстае адкрыццё адрэстаўраванага помніка архітэктуры запланавана на верасень.

К

Каласіяна на сцэне

Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа адзначыў Міжнародны дзень тэатра святочным вечарам, на які былі запрошаны знакамітыя артысты з чатырох рэспубліканскіх тэатраў.

На тэатральных падмостках розныя калектывы рабілі ўласныя ўвасабленні напісанага класікам. Узяць хаця б легендарнага "Сымона-музыку", якога ставілі Коласаўскі і Купалаўскі тэатры, Беларускі дзяржаўны тэатр лялек, ансамбль пантамімы "Рух", Нарачанскі ўзорны дзіцячы лялечны тэатр "Ялінка"… У гэты святочны вечар гасцям Коласавага дома была прадастаўлена магчымасць пабачыць лепшыя моманты з розных спектакляў па творах Песняра ў выкананні акцёраў тэатраў рэспублікі.

Добрай традыцыяй сталі выступленні ў музеі артыстаў Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Плённае супрацоўніцтва з віцябчанамі працягваецца не адно дзесяцігоддзе. Народны артыст Беларусі Тадэвуш Кокштыс, рэжысёр-пастаноўшчык тэатра Міхаіл Краснабаеў і вядучыя майстры віцебскай сцэны (сярод якіх — Віктар Дашкевіч і Пётр Ламан) зноў завіталі ў музей. А летась толькі Тэатр імя Якуба Коласа прыняў удзел у святкаванні Міжнароднага дня чытання паэмы "Сымон-музыка", паказаўшы ўрывак пастаноўкі згаданага твора. Таксама ў вечарыне прыняў удзел заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Валянцін Салаўёў, які доўгія гады працаваў у тэатры імя Якуба Коласа, апошнім жа часам — у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі.

Марымба, ксілафон...

Падчас фэста. / Фота аўтара

У рамках Года культуры з 24 па 26 сакавіка ў Мінску праходзіў першы Беларускі конкурс выканаўцаў на ксілафоне і марымбе імя Міхаіла Гузікава. Мерапрыемства ладзілася ў дзіцячай музычнай школе мастацтваў №10 Мінска імя Яўгена Глебава, а яго арганізатарамі выступілі Беларускі саюз музычных дзеячаў, Беларуская перкусійная асацыяцыя, названая ўстанова адукацыі ды шэраг камерцыйных арганізацый.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Нагода для правядзення конкурсу была асаблівая: сёлета спаўняецца 210 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Гузікава — ураджэнца Шклова, стваральніка прататыпа сучаснага ксілафона, віртуознага выканаўцы на драўляна-саламянай гармоніцы, сканструяванай на аснове беларускага народнага інструмента бруські. Творчасцю нашага земляка захапляліся Фелікс Мендэльсон-Бартольдзі, Ферэнц Ліст, Жорж Санд, а канцэрты з яго ўдзелам ладзіліся ў канцэртных залах Вены, Парыжа, Адэсы, Берліна, Вільні, Львова ды Варшавы… "К" плануе прысвяціць Міхаілу Гузікаву асобны матэрыял, дзе падрабязна распавядзе пра яго біяграфію і творчыя набыткі. А пакуль магу сказаць, што на свае вушы і вочы чуў і бачыў гранне на падобнай да гузікаўскай драўляна-саламянай гармоніцы. Такі нумар прадставіў на адкрыцці конкурсу лаўрэат міжнародных конкурсаў, саліст аркестра Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі Аляксандр Зубко.

Але вярнуся да самой імпрэзы. Як адзначыў "К" старшыня Беларускай перкусійнай асацыяцыі, канцэртмайстар групы ўдарных інструментаў сімфанічнага аркестра Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, а таксама старшыня журы конкурсу Уладзімір Судноўскі, мерапрыемства сабрала ў сталіцы больш за дваццаць удзельнікаў з Мінска, Брэста, Віцебска, Магілёва ды Маладзечна. Хлопцы і дзяўчаты рознага веку цягам двух дзён выконвалі на ксілафонах і марымбах творы Баха, Моцарта, Чайкоўскага і многіх іншых вядомых кампазітараў. (Марымба — гэта "своеасаблівы" родзіч ксілафона, а граюць на гэтым інструменце спецыяльнымі палачкамі з абматанымі ніткамі ці гумовымі галоўкамі. Яна адрозніваецца ад ксілафона дыяпазонам і тэмбрам — і, адпаведна, памерам клавіш і рэзанатараў. Як у ксілафона, рэзанатар — металічная або драўляная трубка, падвешаная вертыкальна пад клавішай.)

На ўрачыстым закрыцці конкурсу былі абвешчаны пераможцы ў дзвюх прадстаўленых намінацыях. Хлопцы і дзяўчаты атрымалі не толькі дыпломы, але і каштоўныя прызы ды падарункі — усё дзякуючы спонсарам і арганізатарам мерапрыемства. А наступны конкурс, па словах Уладзіміра Судноўскага, плануецца зладзіць не раней чым праз два гады. Будзем чакаць новых удзельнікаў і новых выканаўцаў: ксілафонная традыцыя ў Беларусі даўняя і вядома далёка за межамі нашай краіны…

К

"Лічбавы" падыход

Атрымаць сайт… задарма?

Без сайтаў, як і без Інтэрнэту наогул, у наш час, што называецца, нікуды, а ў сферы культуры — і пагатоў. Дзе яшчэ дэманстраваць свае дасягненні грамадзе, набыткі і паслугі, прадстаўляць фонды і экспазіцыі, запрашаць на імпрэзы, браніраваць экскурсіі або наладжваць зваротную сувязь з наведвальнікамі ды калегамі? Без уласнай інфармацыйнай пляцоўкі гэтага не дасягнеш, а карыстацца старонкай мясцовага райвыканкама і публікаваць там навіны бібліятэчнага, клубнага ці музейнага жыцця — гэта пазаўчарашні дзень. Але колькі каштуе такі сайт? І ці не стануць сайты для ўстаноў культуры на вагу золата ў плане выдаткаў?

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Усе пералічаныя пытанні — не надуманыя, як можа падацца на першы погляд, а актуальныя і надзённыя, асабліва для бібліятэкараў. Нагадаю, што адна з задач, пастаўленая перад супрацоўнікамі сферы і прапісаная ў Дзяржаўнай праграме "Культура Беларусі" на 2016 — 2020 гады — павелічэнне колькасці наведвальнікаў бібліятэк (у тым ліку і аддаленых карыстальнікаў праз Інтэрнэт) праз пяць гадоў на 20 % у параўнанні з 2015 годам. Так што бібліятэкам хоцькі-няхоцькі падобныя сайты рабіць усё адно давядзецца.

Між тым стварэнне падобнага партала — справа не такая ўжо і лёгкая, асабліва з улікам таго, што ў тыпавых штатах устаноў культуры дасюль не ўведзены такія адзінкі, як праграміст ці вэб-дызайнер. Ды і не пойдуць такія спецыялісты ў бібліятэкі ці музеі, бо ў прыватных фірмах заробкі, як вядома, на колькі парадкаў вышэйшыя, чым у дзяржаўных. Да таго ж не варта забываць, што грошай пад стварэнне сайтаў для дамоў культуры, бібліятэк ці музеяў у мясцовых бюджэтах звычайна не прадугледжваецца. Тым больш сёння, у часы аптымізацыі…

Але ў такім выпадку можна пайсці яшчэ адным шляхам: стварыць сайт з дапамогай сваіх спецыялістаў, як, скажам, зрабілі ў Магілёўскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна. Па словах кіраўніка ўстановы культуры Ілоны Сарокінай, на сёння бібліятэкары маюць ужо трэці варыянт сайта, які робіцца, у асноўным, сіламі галоўнага інжынера Антона Драздова. Ён жа аказвае кансультацыйную дапамогу тым райбібліятэкам вобласці, якія хочуць займець свае старонкі ў Сеціве. Так, на сёння сайты ёсць у 15 цэнтральных раённых бібліятэк Магілёўшчыны. Па словах Антона Анатольевіча, ён у свой час скончыў Магілёўскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, таму з сайтамі абыходзіцца ўмее. А напаўняць партал яму дапамагаюць супрацоўнікі аддзела інфармацыйных рэсурсаў установы культуры. Аплата ж даменнага імені і хостынгу для іхняга сайта library.mogilev.by не такая ўжо і вялікая — блізу 200 — 300 тысяч рублёў на год. Падобная сума выстаўляецца і тым райбібліятэкам, якія займелі сайты цягам апошніх гадоў, і для іх яна цалкам пасільная.

Што ж, падобны шлях — таксама праверaны і апрабаваны на практыцы ў многіх раёнах Беларусі. Праўда, добрай навігацыяй і візуальнымі магчымасцямі пахваліцца падобныя сайты наўрад ці могуць, бо гэта ўжо зусім іншы ўзровень праграмавання. Але "крутыя", — маю на ўвазе прафесійныя — сайты ў рэгіянальных установах культуры сёння ёсць. Скажам, нядаўна такі партал займеў Музей Максіма Багдановіча ў Гродне — літаратурны аддзел абласнога Дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.

Названы сайт, які размяшчаецца па адрасе bagdanovichmuseum.by, не толькі мае лёгкую і зручную навігацыю для наведвальніка, але і змяшчае шмат карыснай інфармацыі. Тут можна паслухаць песні на вершы паэта, пачытаць яго выбраныя творы, а таксама даведацца пра музейныя экскурсіі і нават замовіць іх праз Інтэрнэт. Сайт для ўстановы культуры створаны гродзенскай вэб-студыяй "Іквадарт", прычым абсалютна бясплатна. Падарунак музейшчыкам дастаўся даволі важкі: кошт падобнага партала, як сцвярджае дырэктар студыі Глеб Койпіш, нашмат большы за тысячу долараў. Дакладную лічбу кіраўнік не прывёў, спаслаўшыся на камерцыйную тайну. Але і так зразумела, што сайт зроблены, што называецца, не за рубель: над ім цягам года працавала група спецыялістаў вэб-студыі, а таксама супрацоўнікі самой установы культуры.

Цікава, што раскрутка новага сайта адбылася імгненна: толькі за першы дзень спасылку на яго перапосцілі ў сацыяльных сетках больш за 200 чалавек. Значыць, праца праграмістаў і дызайнераў была недарэмнай, а музейны сайт стаўся запатрабаваным у наведвальнікаў. Застаецца чакаць, што стануць больш запатрабаванымі таксама і экскурсіі ў Музей Максіма Багдановіча ў Гродне, бо, натуральна, дзеля гэтай мэты названы сайт і ствараўся…

Дарэчы, па словах Глеба Койпіша, хоць для ягонай студыі прыярытэтам застаюцца камерцыйныя праекты, яны плануюць працягнуць працу ў сферы беларускай культуры і ствараць па адным падобным культурным праекце на год. Дык каму яшчэ з музейшчыкаў, бібліятэкараў і клубнікаў Беларусі патрэбны свой сайт? Адрас для прапаноў на сёння — вядомы…

К

Зніжкавая "ліхаманка"

Азартныя "гульні" для культурных людзей: дысконт і прома для тэатральных білетаў

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

"Акцыі — гэта ўсё ад беднасці. Тэатр — адмысловая атмасфера, спецыфічнае мастацтва, і нельга ператвараць яго ў нешта іншае. Падкрэсліваю — не камерцыйны забаўляльны цэнтр, а мастацтва! Там ацэньваецца не гучнасць дэцыбелаў, а паўза, цішыня. На жаль, частка тэатраў гібее, бо ім трэба гнаць вал, каб зарабіць грошай… Творцам не стае часу далучыцца да тэатра", — шкадуе ён. Рэжысёр упэўнены, што публікі пабольшае, калі тэатр будзе займацца яе выхаваннем. І ў прыклад прыводзіць дырэктара Магілёўскага абласнога тэатра драмы Андрэя Новікава, які за 11 гадоў існавання Міжнароднага маладзёжнага тэатральнага форуму "М@рт-кантакт" падрыхтаваў гледача. "Горад сапраўды змяніўся!", — як сталы госць фестывалю зазначае Валерый Данілавіч.

Думка майго суразмоўцы бясспрэчная і слушная. Але тэатры пастаўлены сёння ў жорсткія рамкі рынкавых адносін, таму, пакідаючы недакранальным творчы імпэт рэжысёраў, адміністрацыя вымушана круціцца, каб па максімуму запоўніць месцы…

Дарэчы, менавіта рэгіёны тая зніжкавая "ліхаманка" амаль не закранула. Мяркуючы па сайтах калектываў у абласцях, праграмы "лаяльнасці да пакупнікоў" не карыстаюцца папулярнасцю ў адміністрацыі. Прынамсі, галоўны адміністратар Гомельскага гарадскога маладзёжнага тэатра Алена Васькова зазначае: хоць у Гомелі і чытаюць пра падобныя сталічныя з'явы і прыглядаюцца да іх, але пакуль не спяшаюцца браць "на ўзбраенне". "Мы больш працуем з рэгіянальнымі мас-медыя, прадастаўляючы ім білеты на нашы спектаклі для розыгрышу ў якой-небудзь віктарыне ці конкурсе", — дадае Алена Мікалаеўна.

1+1 = 3

У адрозненне ад рэгіёнаў, сталічныя жыхары прызвычаіліся шукаць акцыі, многія звяртаюцца на адмысловыя сайты, дзе можна эканоміць "кроўныя", набыўшы купоны на розныя віды паслуг — і тэатр тут не выключэнне. Заходжу на вэб-дысконт і прадказальна знаходжу безліч антрэпрыз з бліжэйшага замежжа. На пастаноўкі з расійскімі зоркамі прапануюць білеты за палову цаны. Мяркуючы па размешчаных тут лічбах, тыя купоны добра разбіраюцца.

Сярод гучных афішных назваў адшукала адну беларускую: прэм'еру Маладзёжнага тэатра эстрады "Прынц — залатыя вушы". Як распавяла спецыяліст па рэкламе ўстановы Яна Голубева, прапанова размясціць свае білеты паступіла непасрэдна ад дысконтнага сайта. Тэатр на спробу выставіў 10 кодаў (кожны прадугледжваў набыццё двух білетаў па цане аднаго). Пазіцыі адразу былі выкуплены, таму тэатр пагадзіўся паўтарыць акцыю на чарговы паказ. Спецыяліст па рэкламе падкрэсліла, што канцэртны аддзел тэатра яшчэ да гэтага супрацоўніцтва выступіў з ініцыятывай стварэння бонуснай праграмы, каб узняць цікавасць гледача да тэатра. "З восені мы пачалі распрацоўваць палажэнне па зніжках. Зараз дакумент вывучаюць нашы эканамісты і юрысты. Мы мяркуем стварыць сістэму разнастайных абанементаў і акцый. Зніжкі не будуць сталымі, хутчэй выкарыстаем іх у якасці падтрымкі тых пастановак, на якія пакуль попыт менш. Верагодна, палажэнне пачне дзейнічаць з новага сезона," — дадала суразмоўца.

У адрозненне ад папярэдняга калектыву, Сучасны мастацкі тэатр ужо ўвёў абанементную сістэму. Па словах менеджара па рэкламе і PR Аляксандры Кот, з пачатку бягучага сезона тут дзейнічае клубная картка. Яна дае магчымасць на працягу месяца прыйсці на любы спектакль, набыўшы білет з 5-працэнтнай зніжкай, а таксама наведаць прапанаваную тэатрам бонусную пастаноўку, на якую два білеты будуць каштаваць, як адзін. Аднак суразмоўца прызналася, што дадзеная праграма дзейнічае не так добра, як на яе разлічвалі. "Магчыма, справа ў тым, што чалавеку складана загадзя падлічыць, ці зможа ён у дадзены месяц некалькі пэўных вечароў прысвяціць тэатру, — разважае спадарыня Аляксандра. — У нас лепш ідуць карпаратыўныя заяўкі, калі пры набыцці больш як дзесяці білетаў кліент атрымлівае зніжку ад 7 да 10 %. Аднак упэўнена, што такія клубныя карткі яшчэ "выстраляць". Да нас усё ідзе з Расіі, і там ужо актыўна карыстаюцца падобным бонусам. А калі браць глыбей, то дадзеная сістэма лаяльнасці да наведвальніка была даўно распрацавана ў Англіі, і, як паказвае час, — дзейнічае яна вельмі удала".

Асабіста мне хочацца толькі дадаць, што нізкі запыт на клубныя карткі магчымы з той прычыны, што сам тэатр не займаецца іх актыўным прасоўваннем. Пра існаванне дадзеных "вяршкоў" можна даведацца толькі ў тым выпадку, калі адмыслова зайсці на сайт творчага калектыву. Мяркую, прывесці больш прыхільнікаў у клуб СМТ дапамагла б гучная прома-акцыя…

Карпаратыў як спосаб існавання

— Усе механізмы, якія выкарыстоўваюцца ў гандлі, вытворчасці, рэкламе, даводзіцца праецыраваць на свае ўмовы і нам пры продажы білетаў на спектакль. Сёння нельга проста пакласці білеты ў касу — мы павінны шукаць новыя формы ўзаемадзеяння з гледачом, — заявіў на адной з прэс-канферэнцый дырэктар Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Уладзімір Карачэўскі.

І сапраўды, РТБД пад кіраўніцтвам новага дырэктара стаў проста флагманам па стварэнні шматлікіх кірункаў прыцягнення публікі. Восенню ў тэатры пачалі актыўна абмяркоўваць, якія новыя паслугі можа прапанаваць тэатр. У выніку ўзнік цэлы шэраг варыянтаў. Тут і групавыя заяўкі са зніжкай да 16,7 %, і абанементы "Тэатральны 3+1" (пры набыцці на працягу месяца трох білетаў на розныя спектаклі РТБД чацвёрты, бонусны спектакль на свой выбар можна наведаць бясплатна), і білеты ў падарункавым афармленні, і праграма "Тэатральны месяц з РТБД", у рамках якой можна па спецыяльным кошце набыць уваходныя на арганізацыю (пры умове, што білетаў на розныя спектаклі з афішы пэўнага месяца будзе не менш як дзесяць).

Напярэдадні навагодніх святаў пачала дзейнічаць Карпаратыўная праграма. "Яна карыстаецца папулярнасцю, — зазначае прэс-сакратар РТБД Святлана Латышава. — Напрыклад, да Міжнароднага жаночага дня было замоўлена тры карпаратывы. Пакуль мы прыглядаемся, шукаем варыянты яе выканання, магчыма, у наступным сезоне праграма злёгку зменіцца". Зараз арганізацыям прапануюць выкупіць пад сваё свята залу (200 месцаў). Такім чынам, на спектаклі прысутнічаюць толькі калегі, для якіх да пачатку спектакля можна зладзіць урачыстасці (гэтая частка імпрэзы застаецца на кошце заказчыкаў) ці правесці фуршэт у арт-прасторы. Святлана Латышава зазначае, што на адно з такіх мерапрыемстваў завіталі людзі, якія ніколі да гэтага не былі ў РТБД, значыцца, праграма дапамагае прыцягнуць новых гледачоў да нацыянальнага сцэнічнага мастацтва.

Карпаратыўная праграма прадугледжвае спецыяльны кошт на білеты, па якія не трэба ехаць — іх даставіць тэатральны адміністратар адразу ў офіс. Калектыў нават ідзе на тое, каб па запатрабаванні выязджаць да заказчыка і граць спектакль у іх зале… Шчыра кажучы, такое заляцанне тэатра з публікай падаецца асабіста мне нават залішнім. РТБД мае вялікую небяспеку атрымаць у выніку замест іміджу творчай лабараторыі сталую асацыяцыю з тымі самымі карпаратывамі… Урэшце, з іншага боку, клопат пра эканоміку і развіццё ўстановы скідваць з рахункаў таксама не варта.

Палёты ў сне і наяве

Не так даўно ледзь ці не з кожнага праса гучала акцыя "Белавія", калі апошняя выставіла небывалыя зніжкі. У выніку за некалькі дзён беларусы выкупілі каля 37 тысяч білетаў. Па размовах шматлікіх знаёмых я зразумела, што вялікая частка тых пакупнікоў папярэдне нікуды ляцець не збіралася, аднак не змаглі прайсці міма атракцыёну небывалай шчодрасці. Упэўнена, такой колькасці кліентаў без гучнай рэкламнай кампаніі нашы авіялініі не пабачылі б. Канешне, тэатрам падобнага пад'ёму пакупніцкай здольнасці марна чакаць, але і яны могуць разварушыць публіку, якая пачала эканоміць на культурным адпачынку.

Памятаю, як у інтэрв'ю "К" дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага Эдуард Герасімовіч скардзіўся, што гастралёры з бліжэйшага замежжа вымываюць грошы ў айчыннай аўдыторыі. Маўляў, людзі гатовы аддаць любую суму за зорнае імя, а на сваіх акцёраў ужо не застаецца. Магчыма, у такой сітуацыі акцыі (якія абавязкова трэба гучна рэкламаваць) дапамогуць вярнуць гледача, бо псіхалагічна вельмі добра спрацоўвае адна магчымасць эканоміць. Публіка любіць гульні, дык чым не азарт паспець набыць абмежаваную партыю білетаў па прынцыпе, напрыклад, "1+1=3" ці "два па цане аднаго"? Зрэшты, ёсць вялікая катэгорыя людзей, якія спецыяльна ловяць зніжкі, акцыі і гэтак далей. На такіх пакупніцкіх інстынктах даўно пабудаваны пэўныя стратэгіі ў замежным гандлі (тыя ж праславутыя "чорныя пятніцы", зніжкі на калекцыі мінулага сезону).

Мяркую пачуць у адказ заўвагу, што білеты ў айчынныя тэатры і так на мяжы, якая дазваляе трымацца тэатрам на плаву — калі выставіць зніжкі, дык ці ўвогуле будзе прыбытак? Згодна, дык ніхто і не кажа пра татальнае зніжэнне кошту. Аднак, упэўнена, можна на карысць пастаноўкі выставіць абмежаваную колькасць пазіцый, стварыць акцыі напярэдадні спектакля, калі ў касе бачна, што значная колькасць білетаў застанецца мёртвым грузам… Вось і магчымасць забіць двух зайцоў адразу: і дадаткова прагучаць у мас-медыя, і дапамагчы рэшткам уваходных знайсці свайго шчаслівага ўладальніка.

К

Пра маркетынгавы досвед музейных устаноў — у наступных нумарах "К".

“Лічбавы” шлях Скарыны

Алесь СУША,
намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Мабыць, амаль усе ведаюць, што выданні пачынальніка беларускага кнігадрукавання Францыска Скарыны сёння захоўваюцца ў многіх краінах і бібліятэках свету. На жаль, з прыблізна 500 вядомых экзэмпляраў толькі 10 знаходзяцца на сённяшні дзень у нашай краіне. Таму першачарговай задачай для нас з’яўляецца выяўленне, апісанне, вывучэнне, а пры магчымасці — і вяртанне гэтых унікальных помнікаў кніжнай культуры на радзіму першадрукара — у Беларусь.

У сувязі з гэтым надзвычай важнай сталася падзея, што адбылася напрыканцы сакавіка. Так, пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь і Пасольства нашай краіны ў Аб’яднаным Каралеўстве Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі з Кембрыджа, дзе ў бібліятэцы мясцовага Траецкага каледжа захоўваецца выданне Францыска Скарыны, у Мінск, у Нацыянальную бібліятэку Беларусі, перададзена яго лічбавая копія.

Гэта акцыя стала вынікам доўгіх — амаль што трохгадовых — перамоваў, што адбываліся спачатку падчас майго візіту ў Аб’яднанае Каралеўства, а таксама дзякуючы актыўнай дзейнасці беларускага дыпрадстаўніцтва ў гэтай краіне і Міністэрства замежных спраў нашай краіны. Таксама, безумоўна, гэта можна лічыць і актам добрай волі з боку кіраўніцтва Траецкага каледжа Кембрыджскага ўніверсітэта, паколькі лічбавая копія зроблена і перададзена ў Беларусь абсалютна бясплатна.

У гэтай вельмі паважанай установе з багатай гісторыяй захоўваецца “Першая кніга Царстваў”, выдадзеная Францыскам Скарынам у Празе ў 1518 годзе. Экзэмпляр не поўны, гэта толькі фрагмент выдання. Але, пагадзіцеся, сёння кожная старонка, кожнае слова беларускага асветніка ўспрымаецца намі як нацыянальная святыня.

Гэта, лічу, значны здабытак для нашай краіны. Справа ў тым, што пра бібліятэку Траецкага каледжа ў Кембрыджы на Беларусі ведалі ды і сёння ведаюць даволі мала, а даследчыкі з нашай краіны, я ў гэтым перакананы, да гэтага часу проста не мелі магчымасці пагартаць той экзэмпляр скарынаўскай Бібліі, які мы цяпер займелі хай сабе і ў лічбавым варыянце.

Да слова, пасля алічбоўкі і перадачы гэтай кнігі ў Беларусь Траецкі каледж змясціў названае выданне ў сваёй электроннай бібліятэцы, у рубрыцы “Кніжныя рарытэты”. Акрамя кнігі Скарыны, там можна знайсці ўсяго некалькі кніг: адно выданне Ісака Ньютана і дзве кнігі Уільяма Шэкспіра. Так што выданні нашага першадрукара сёння цэняць і далёка за межамі айчыны.

На гэты момант адбываюцца перамовы пра магчымасць і пра ўмовы атрымання гэтага выдання для часовага экспанавання ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Бясспрэчна, каб нам удалося давесці гэтую справу да канца, тое сталася б адной з важных падзей у культурным жыцці нашай краіны, асабліва напярэдадні 500-годдзя з часу выдання кніг Бібліі Скарынам у Празе ў 1517 годзе. Але ўжо сёння айчынныя даследчыкі могуць пазнаёміцца з амаль недасяжным для іх раней кніжным помнікам.

Занатаваў Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Агрэсія замест харызмы?

Мікалай КІРЫЧЭНКА,
народны артыст Беларусі, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, дацэнт кафедры акцёрскага майстэрства Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў

Я выкладаю больш за 35 гадоў. І бачу, як змяняюцца студэнцкія пакаленні. З узростам прыходзіць разуменне, што не ўсё так дрэнна, як, магчыма, камусьці ўяўляецца. Так, цяперашняя моладзь іншая, але яна не можа і не павінна аказацца такой, якімі былі калісьці мы. Галоўнае — не дапусціць разбурэння ў яе духоўных асноў, бо гэта адаб’ецца на ўсім грамадстве.

Раней я быў больш катэгарычным: маўляў, вось так — правільна, а гэтак — не. Імкнуўся вучыць па прынцыпе: “рабі, як я”. А цяпер кажу інакш: “Верагодна, гэта магчыма. Але я “не даганяю”. Хочаце рабіць па-свойму? Рабіце. Але ўсё павінна быць пісьменна, аргументавана”. Таму цяперашніх спашукальнікаў прафесіі “акцёр” вучу ва ўсім шукаць матывіроўку: чаму герой дзейнічае менавіта так, а не інакш. Каб знайсці адказ, трэба “выціснуць” усё магчымае з аўтарскага тэксту, узяць усё, што нясуць іншыя персанажы, нарэшце, нават нафантазіраваць, але абавязкова зразумець: дык чаму — чаму мой герой робіць так?

Моладзь нельга “заганяць” у наша мінулае. Кожнае наступнае пакаленне фарміруецца самім жыццём, а тое не стаіць на месцы. І менавіта ў гэтым трэба шукаць першапрычыны найбольш глабальных змен: моладзь не проста чымсьці адрозніваецца, яна мысліць інакш, чым мы. Але чаму гэта адразу дрэнна? Ва ўсім трэба бачыць два бакі. Вось Інтэрнэт значна палегчыў сам працэс здабывання ведаў. У Сеціве можна знайсці адказ на ўсё (правільны ці не — гэта ўжо іншае пытанне), там выкладзены многія цікавыя аўдыя-, відэазапісы, што было недаступна раней. Але ёсць і спакуса капіравання — што называецца, літара ў літару, без аніякага асэнсавання і тым больш пераасэнсавання. На тое ж працуе і кліпавасць мыслення: яна толькі пазначае падзеі ці дзеянні, але не паглыбляецца ў іх. Затое зрушвае тэмпарытм, адпавядае хуткасці сучаснага жыцця.

Трывожыцца трэба за іншае. Асабіста мяне больш за ўсё пужае тая агрэсіўнасць, што ўзрастае ў грамадстве. Справа не адно ў праславутых “стралялках” на ТБ, што прывялі да перайначвання гогалеўскай цытаты з “Мёртвых душ”. Бо гледзячы на бясконцы крымінал, што транслюецца з экрана, міжволі ўзнікае думка: і які ж расіянін не трымае ў кішэні пісталет? Вядома, могуць быць і жорсткія сцэны, але цяпер іх надта многа. І становіцца ўсё больш! А самае страшнае — агрэсія пранікае паўсюль, нават у саму інтанацыйнасць маўлення. Звярніце ўвагу, якім злавесным голасам расійскія тэлевядучыя часам чытаюць звычайную інфармацыю, з якой агрэсіўнасцю падаюць некаторыя навіны. Агрэсія падмяняе паняцці энергетыкі, харызмы, актыўнай жыццёвай пазіцыі. І становіцца ледзь не нормай!

Будзем шчырымі: тое “мардабойства”, што пануе на шматлікіх расійскіх ток-шоу, — гэта свайго роду бізнес. Бо пасля гэткіх “неінтэлігентных” сцэн самы час запускаць рэкламу, якая і прыносіць прыбытак. Але як пасля ўсяго гэтага казаць пра добрае-вечнае? Вось у чым пытанне.

Тэатру неаднойчы прадракалі сумны фінал: маўляў, сыйдзе гэта мастацтва ў нябыт. Так казалі і тады, калі з’явілася кіно, і пазней, калі толькі нараджалася тэлебачанне. Але тэатр — жыве. І застаецца тым асяродкам для душы, той духоўнай прасторай, што супрацьстаіць іншым рэаліям жыцця і абуджае ў чалавеку яго лепшыя якасці. Заклікае адчуваць, перажываць, думаць, параўноўваць, “дамалёўваць”. Прапануе гледачу тую ступень умоўнасці, пры якой нават самыя, здавалася б, рэалістычныя сцэны ператвараюцца ў асацыятыўныя. Што ні кажыце, а тэатр — штука вечная.

Занатавала Надзея БУНЦЭВІЧ

фотафакт

Цыкл пра нас

30 сакавіка ў вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі адбылася прэм’ера праграмы кампазітара Алега Молчана “Малітва” на вершы Янкі Купалы. Як кажа аўтар музыкі, “гэты цыкл пра нас з вамі”, незалежна ад таго, што Купала пісаў свае вершы на пачатку XX стагоддзя, а асэнсаванне паўтара дзясятка з іх Молчан рабіў ужо ў стагоддзі XXI. Прычым у праграму ўвайшлі як вядомыя слухачам творы (“Малітва”, “Маладым на вяселлі”, “У зялёным садочку”, “Дзве таполі”), так і нечаканыя навінкі. Скажам, беларускі “салун” у “Благой жонцы” ці рок-нумар “Чорны бог”. Удзел у канцэрце прымалі Нацыянальны акадэмічны народны аркестр імя Іосіфа Жыновіча, якім кіраваў у той вечар заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Аляксандр Крамко, а таксама заслужаныя артысты краіны Уладзімір Ткачэнка, Леанід Барткевіч і Анатоль Кашапараў, вакальная група “Чысты голас”, салісты Вадзім Касенка, Ірына Відава, Андрэй Коласаў, Марына Васілеўская і Настасся Рачыцкая.

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Паказаць карціны — нічога не зрабіць

Ларыса ФІНКЕЛЬШТЭЙН,
мастацтвазнаўца, заснавальнік першай у Беларусі аўтарскай некамерцыйнай канцэптуальнай галерэі “Брама”

Роля мастацтвазнаўцы ў сучаснай выставачнай прасторы зараз значна пашырылася. Прафесія эвалюцыянуе, выходзіць са сваіх “спрадвечных” рамак і з цягам часу ўбірае іншыя кірункі.

Калі, умоўна кажучы, 30 гадоў таму мастацтвазнаўца прыйшоў на выставу — убачыў — напісаў, дык сёння яго функцыі гэтым не абмяжоўваюцца. Па-першае, ён — аўтар канцэпцыі, куратар, па сутнасці, галоўны чалавек у выставачнай прасторы. Па-другое, ён яшчэ выступае ў ролі арт-менеджара: знаходзіць памяшканне для стварэння выстаў і арт-праектаў. Трэцяе і, відаць, галоўнае: такі спецыяліст — экспазітар. Стварэннем экспазіцыі павінен займацца менавіта ён, а не сам мастак. Апошні “экспануе” свае думкі, асацыяцыі, а мастацтвазнаўца пераасэнсоўвае іх, паказваючы гледачам пэўны вынік. Да ўсяго — робіць комплексны праект, у які ўваходзяць і сустрэчы з мастакамі, і майстар-класы, і лекцыі. То бок мастацтвазнаўца займаецца распрацоўкай культурнай праграмы. Гэта — медыйная персона. Шкада, у рэгіёнах такіх адмыслоўцаў мала, вось там амаль нічога з мастацкіх праяў не абмяркоўваецца… У любым выпадку, сёння проста паказаць карціны — значыць нічога не зрабіць.

Можна казаць, канкурэнцыя ў прадстаўнікоў гэтай прафесіі ёсць з крытыкамі. Але што такое ў дадзеным выпадку канкурэнцыя? Мастацтва так шмат, што яго хопіць на ўсіх. На маю думку, у нашай сітуацыі выпадае казаць не пра канкурэнцыю, а пра марнае змаганне павукоў у слоіку. Адпіхні моцнага мастацтвазнаўцу… Альбо пакінь адну галерэю ці аднаго мастацтвазнаўцу… Добра, але што далей? Праект ад гэтага лепшым не стане. Калі ў дзесяці галерэях дзесяць мастацтвазнаўцаў зробяць па выставе, па праекце, тады і пабачым нармальную, здаровую канкурэнцыю.

Занатавала Вольга РОПАТ

Дзяжурны па нумары

Гіперактыў выхаванцаў

Вясновыя канікулы — дадатковая нагода схадзіць з дзецьмі ў тэатр ці на канцэрт. Калісьці ў гэты час ладзіўся нават спецыяльны Тыдзень музыкі для дзяцей і юнацтва, дый астатнія мастацтвы не адставалі. Сёлета тэатральная афіша стракаціць разнастайнымі назвамі. Бракуе хіба чагосьці накшталт “Аповеда пра тое, як паводзіць сябе на спектаклі”.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Для пачатку — некалькі карцінак “з жыцця”. У Беларускім дзяржаўным тэатры лялек аднавілі “Баладу пра белую вішню”, жанрава азначаную як “летапіс XIV стагоддзя” і прызначаную для дзяцей ад васьмі гадоў. Спектакль вырашаны ў стылістыцы сярэднявечных малюнкаў, з выкарыстаннем некаторых прыёмаў батлейкі і дае сучасным падлеткам багата падстаў для роздуму і абмеркаванняў — на тэмы нацыянальнай гісторыі, патрыятызму, вернасці, кахання, здрады. Але ж і патрабуе хаця б мінімальнага папярэдняга разумення, “на што ідзем”. Уласна кажучы, такая “настройка” неабходная для кожнага “культпаходу”, асабліва з дзецьмі. А тым больш на спектаклі, дзе не адно забаўкі прапануюць.

Што ж я ўбачыла ў зале? Яшчэ адзін “спектакль”, прычым галоўныя ролі ў ім адыгрывалі настаўнікі. Так-так, менавіта дарослыя ў час дзеі хадзілі па зале, падсаджваліся то да адной групы, то да іншай, услых вырашалі такія “неабходныя” пытанні, як, да прыкладу: “Пасля спектакля збіраемся не ў гардэробе, а ў фае”. Няма чаго здзіўляцца, што такі прыклад “натхніў” і юных аматараў мастацтва: яны таксама пачалі размаўляць уголас, бегаць па зале, штурхацца, валтузіць адзін аднаго. Вядома, выкладчыкі не маглі пакінуць такое “безобразие” (дакладней, “образие”, бо “вобраз” якраз і быў зададзены): яны сталі перакрыкваць вучняў, каб навесці парадак. Ну, а героі “Балады…” пакутавалі ўдвая: ад ваенных падзей, што ішлі не толькі на сцэне, але і ў зале. Мо гэта нетыповы прыклад. Але, як заўважылі супрацоўнікі ТЮГа, “нормай” стала, што выкладчыкі ў час спектакляў папросту выходзяць у фае ці буфет — патэлефанаваць, падсілкавацца, у лепшым выпадку пакідаючы ў зале аднаго “дэлегата”.

Як супрацьлегласць — прыходжу неяк на “дарослы” канцэрт у філармонію. У праграме — адно найноўшая беларуская музыка. І раптам бачу ў зале… артыста Паўла Харланчука. Можа, думаю, ён удзельнічае ў другім аддзяленні? Ажно не — прыйшоў з дачкой, якая музыкай займаецца. Скажу адразу: канцэрт быў вельмі няроўны, жудасна зацягнуты, публікі з кожным нумарам станавілася ўсё менш. Яшчэ і таму, што некаторыя кампазітары, паслухаўшы свой твор, адкланяўшыся і сабраўшы апладысменты, пакідалі залу, часцяком разам са сваімі прыхільнікамі. Пасля антракту шэрагі парадзелі ўдвая. Не ўбачыўшы на сваім месцы Харланчукоў, я магла ім толькі паспачуваць, бо ёсць музыка, у тым ліку беларуская, куды больш цікавая, чым большая палова сабранай у праграме. Ажно не — бацька проста перасадзіў дачку бліжэй. Упэўнена, потым абмяркоўвалі пачутае, бо гэта было заўважна ўжо ў антракце. Ці ж не такім павінна быць сапраўднае выхаванне?..

К

Тактыка культурнага развіцця

На што здольная п'еса-споведзь?

4 красавіка ў Купалаўскім тэатры адбудзецца трэці беларускі паказ сусветна вядомай пастаноўкі "Сем", заснаванай на дакументальнай п'есе сямі аўтарак-драматургаў. Гэтым разам пастаноўка, скіраваная на прыцягненне ўвагі грамадства да праблем гвалту па гендарнай прыкмеце, будзе рэалізавана пры ўдзеле беларускіх дзеячаў культуры, бізнесу і спорту.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Тэкст п'есы прачытаюць салістка музычнага праекта "Shuma" Руся, заснавальнік партала "TUT.BY" Юрый Зісер, тэлевядучая Ганна Бонд, заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь па тайскім боксе, вакаліст гурта "Brutto" Віталь Гуркоў, Пасол добрай волі ЮНЭДС у Беларусі, тэлевядучая Святлана Бароўская, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Швецыі ў Беларусі Марцін Оберг…

Упершыню за гісторыю сваёй кампаніі ў Беларусі ўнікальны праект, кураторам якога з'яўляецца Фонд ААН ў галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) і Пасольства Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь, будзе паказаны для шырокай аўдыторыі. Патрапіць на яго можа любы ахвотны, папытаўшыся бясплатна білет у касе тэатра.

Да нас праект "Сем" прыйшоў летась, але яго шэсце па свеце (ахоплена ўжо 30 краін) распачалося яшчэ ў 2008-м, калі шведскі драматург, актрыса і прадзюсарка Хеда Крауш Шорген прапанавала новую канцэпцыю п'есы сямі амерыканскіх аўтарак-драматургаў, пераўтварыўшы яе ў "Турнэ Сем". "Прайсціся ў абутку" сямі жанчын, на чыіх гісторыях заснаваны твор, мусілі не прафесійныя акцёры, а прадстаўнікі розных сфер дзейнасці. "Сем" стала праваднікам у розныя культуры свету пытання аб тым, наколькі распаўсюджаны гвалт у дачыненні да жанчын у кожнай краіне, і ці заўважаем мы гэтыя знявагі і несправядлівасць.

Кожная з гераінь (з Пакістану, Камбоджы, Нігерыі, Гватэмалы, Афганістана, Расіі і Паўночнай Ірландыі) распавяла пра свой шлях да волі і раўнапраўя. Іх гісторыі літаратаркі і перапрацавалі ў маналогі. Праз удзел прадстаўнікоў грамадства ў чытанні п'есы, праз уключэнне ў асабістую споведзь, праз вопыт суперажывання і яго трансляцыі гэты крок аказаўся паспяховым. На сёння "Сем" перакладзена на больш як 20 моў. Больш за 150 разоў п'еса была пастаўлена на розных пляцоўках.

Чытальнікамі твора за гэты час станавіліся генералы, члены парламентаў, зоркі — звыш 600 жанчын і мужчын!

Першымі ж чытальнікамі твора ў Беларусі сталі прадстаўнікі міністэрстваў, дзяржаўных структур. Гісторыю Му Сокуа, былога міністра па справах жанчын Камбоджы, што змагаецца супраць гандлю жанчынамі, чытала начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Наталля Пшанічная. Споведзь Інэс Маккормак, ірландкі, якая асмелілася выйсці замуж за каталіка, — намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Алена Купчына. А агучыць адну з самых цяжкіх гісторый — Мухтар Май родам з Афганістану, якая пацярпела ад групавога згвалтавання, пагадзіўся начальнік аднаго з упраўленняў Міністэрства ўнутраных спраў краіны Алег Каразей…

Варта адзначыць і яшчэ адну асаблівасць праекта: кожны раз п'еса атрымлівае не толькі новых акцёраў-чытальнікаў, але новую аўдыторыю. На першую пастаўноўку "Сямі" былі запрошаныя прадстаўнікі дзяржаўных і грамадскіх структур і арганізацый. Другі паказ — і фокус на іншую групу: адмыслоўцаў, ад актыўнасці якіх залежаць зрухі ў полі гендарнага раўнапраўя. Трэці паказ — зварот да шырокай супольнасці… А яшчэ запланаваны чацвёрты і пяты паказы — для розных аўдыторый. Пастаноўкі адбываюцца на фоне інфармацыйнай кампаніі "Гвалт у дачыненні жанчын недапушчальны". Рэжысёр спектакляў — Іван Пінігін.

Думаецца, "Сем" — гэта актуальная і моцная форма, каб заахвоціць грамадства ўбачыць праблемы гвалту па гендарнай прыкмеце не звонку, а знутры. "Мэта праекта — развіццё нулявой талерантнасці грамадства да гвалту ў Беларусі, — падкрэслівае намесніца прадстаўніка Фонду ААН у вобласці народанасельніцтва ў Беларусі Алена Касько, — ініцыяцыя публічнай дыскусіі на тэму правоў жанчын".

Наколькі актуальная гэта праблема ў нас? Па апытанні, якое зладзіў ЮНФПА ў Беларусі ў 2014 годзе, больш за 77 % мужчын і жанчын прызналіся, што сутыкаліся з хатнім гвалтам... Але "падвойныя стандарты" ў дачыненні апошняга аказаліся найбольш яскрава выяўленыя ў мужчын: да прыкалду, 45,5 % апытаных мужчын лічаць магчымым абражаць і лаяць партнёршу, і толькі 29,4 % пагаджаюцца з тым, што жанчына можа дзейнічаць падобным жа чынам. Таксама больш высокія паказчыкі па розных формах гвалту — эканамічнага, псіхічнага, фізічнага, сексуальнага — у адносінах да жанчын. Першай з прычын хатняга гвалту і мужчыны, і жанчыны назвалі празмернае ўжыванне алкаголю.

К

Крытычная маса

Сцэна са спектакля "Жыццё за цара" — аднаго з лідараў форуму. / Фота з сайта Тэатра дзі Капуа

Кант і такт

"М.@rt.кантакт" у Магілёве: пошукі — актуальныя

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 2.)

З астатнімі фестывальнымі складнікамі таксама ўсё няблага. Форум як "свята для публікі" (а фестывалі часта ўспрымаюць менавіта з такога пункту гледжання) — безумоўна, адбыўся, нягледзячы на адсутнасць сёлета вулічных спектакляў, бясплатных для гледачоў. Крытыкам, тэатразнаўцам-аналітыкам і проста заўзятым тэатралам "М.@rt.кантакт-2016" таксама падкінуў тэмы для дыскусій, выканаўшы свае асветніцкую і навукова-даследчыцкую ролі. Што ж да яшчэ адной функцыі любога фестывалю — даваць штуршок развіццю рэгіёна — дык плён тут відавочны: Магілёў, хаця ў ім усяго два тэатры — драматычны і тэатр лялек, набыў статус аднаго з самых сцэнічнаарыентаваных гарадоў Беларусі. А імёны тамтэйшых рэжысёраў — Саўлюса Варнаса і Ігара Казакова — даўно сталі сапраўднымі тэатральнымі брэндамі. Пры такім масіраваным пазітыве — ці могуць быць нейкія праблемы? Тым не менш, некаторыя ўсё ж існуюць.

Дык хто ў зале?

На фестываль імкнуцца патрапіць многія тэатральныя дзеячы, бо падзеі такога ўзроўню даюць неацэнны вопыт, імпульс да новых творчых памкненняў. Сярод заўсёднікаў форуму — каманда з Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, рэжысёр Валерый Анісенка, які ўзначальвае Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа, Вераніка Вінэль — дырэктар Тэатра драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, што ў Бабруйску. А вось творчы склад апошняга тэатра, не кажучы пра многія іншыя такія калектывы, штосьці не выяўляе асаблівай цікавасці. І гэта зусім не магілёўскае выключэнне. Тое ж самае можна назіраць і на іншых фестывалях, гастрольных спектаклях: далёка не ўсе з тых, для каго такія прагляды павінны быць часткай прафесіі, выкарыстоўваюць гэту магчымасць. Што ж тады наракаць на публіку? Білеты раскупляюцца, кожны спектакль выклікае авацыі, артыстаў вітаюць стоячы. Ды толькі ўсё гэта — незалежна ад якасці пастаноўкі і акцёрскай ігры.

Прыхільнасці гледачоў — рэч дзіўная, часам непрадказальная. Аналіз вынікаў глядацкіх сімпатый (а сёлета пакінуць свой голас можна было і ў фае пасля спектакля, і праз Інтэрнэт) — праца сацыёлагаў ды маркетолагаў. Заўважым толькі, што наперад выйшаў спектакль, на якім крытыкі, мякка кажучы, пакутавалі, а ў час абмеркавання асцярожнічалі ў падборы словаў. Гэта маскоўскі "Раскас" паводле Міхаіла Зошчанкі, азначаны як "выязны спектакль-канцэрт сельскай самадзейнасці" і вырашаны як "прывітанне з 1950-х". Што ж, можна зразумець: такая эстэтыка "чапляе за жывое" старэйшае пакаленне, бо вяртае яго ў дні маладосці — свае і сваіх бацькоў. "Ілюзіи" — сумесны праект Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Беларусі і Цэнтра эксперыментальнай рэжысуры БДАМ — набралі 72 % галасоў "за" ад агульнай колькасці прададзеных на гэты спектакль білетаў. Так добра былі ўспрыняты і нязвыклая п'еса Івана Вырыпаева, і яе ўвасабленне рэжысёрам Тацянай Траяновіч, пазбаўленае ўсялякіх знешніх эфектаў накшталт прыгожых строяў ці лазерных шоу.

Тэндэнцыя: пасля каледжа — працаваць

Вярнуць сітуацыю на шэсць-сем гадоў назад…

26 красавіка ў Мінскім дзяржаўным мастацкім каледжы імя Аляксея Глебава адбыўся Дзень адкрытых дзвярэй. У навучальных установах такія мерапрыемствы звычайна ладзяцца напярэдадні ўступных іспытаў з мэтай інфармавання абітурыентаў. Так было і гэтым разам. На ўсіх паверхах будынка каледжа разгарнулі экспазіцыі, якія адлюстроўваюць шлях, што наканавана прайсці таму, каму пашчасціць стаць навучэнцам "Глебаўкі".

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Падчас Дня адкрытых дзвярэй у каледжы. / Фота аўтара

Тут былі ўзоры работ абітурыентаў. Гэта свайго кшталту планка якасці, на якую мусіш арыентавацца, калі хочаш паспяхова здаць іспыты. На метадычнай выставе была прадстаўлена ўся навучальная праграма па спецыяльных дысцыплінах ад першага да апошняга семестра. Далей — курсавыя работы і экспазіцыі па спецыяльнасцях "Жывапіс", "Дызайн", "Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва". І нарэшце — выстава пленэрных работ, а пленэры, на якія трапляюць навучэнцы "Глебаўкі", ладзяцца не толькі ў Беларусі.

Для ахвотных правялі майстар-класы і кансультацыі па спецыяльнасцях. Як высветлілася (а больш дакладна, пацвердзілася), найбольшую папулярнасць сярод магчымых абітурыентаў мае дызайн. Прайшоў і "бацькоўскі сход" па пытаннях паступлення ў каледж. Не абмінулі ў час яго і тэму працаўладкавання пасля атрымання дыплома. Прыём на бюджэтную і платную форму навучання прыблізна аднолькавы — адпаведна, бацькам, што будуць плаціць за навуку сваіх дзяцей, хацелася ведаць, наколькі эфектыўнымі ў сэнсе жыццёвай перспектывы могуць быць такія ўкладанні грошай.

Урэшце, семінар "Пабудова эфектыўнай сістэмы ўзаемадзеяння суб'ектаў адукацыйнага працэсу як фактар павышэння якасці мастацкай адукацыі", які адбыўся ў "Глебаўцы" ў панядзелак, стаў фактычна працягам Дня адкрытых дзвярэй. У ім бралі ўдзел супрацоўнікі міністэрстваў і ведамстваў, спецыялісты ўсіх ступеняў мастацкай адукацыі. Для іх ладзілі такую ж экскурсію па каледжы, што і двума днямі раней для людзей паспалітых. Ды і пытанні на семінары абмяркоўваліся тыя, што выкладчыкі каледжа ўжо чулі ад патэнцыйных абітурыентаў і іх бацькоў. І галоўнае з іх — наколькі запатрабаваны сёння спецыялісты сферы

“У адным флаконе”

Сёлета ў трэндзе…

Ды ўсё ж пагаворым пра тое новае, што адкрыў фестываль. Сёлета яго спектаклі дэманстраваліся на пяці пляцоўках. Да звыклых тэатральна-канцэртных залаў дадаўся Музей этнаграфіі, дзе праходзіў спектакль з Санкт-Пецярбурга “Жыццё за цара” Тэатра дзі Капуа (па імені яго рэжысёра — італьянца), прызнаны лабараторыяй маладых крытыкаў лепшым на форуме. Гэтую ж думку выказвалі і многія сталыя тэатразнаўцы. Вядома, такое рашэнне было прынята не адно з-за пляцоўкі, але само тое, што тэатр, як і іншыя віды мастацтваў, паступова “абжывае” непрыстасаваныя памяшканні, выкарыстоўваючы асаблівасці іх архітэктуры і інтэр’ера, заслугоўвае ўвагі. Бо справа тут не толькі ў змене звыклага “месца дзеяння”, але і ў той новай эстэтыцы, якая з гэтага вынікае. Тэатр імкнецца наблізіцца да гледача, зрабіць яго не назіральнікам, а сваім суразмоўцам. А яшчэ — закранаць тэмы, скіраваныя не толькі да сэрца, але і да розуму, каб узнікала жаданне працяглага далейшага асэнсавання ўбачанага.

Звыклы катарсіс, які класікі прыпісвалі трагедыі, сёння распаўсюджваецца і на іншыя жанры. А галоўнае — нараджаецца тэндэнцыя гэткага “катарсіса на часавай адлегласці”. Пэўна, выклікана гэта зменай сістэмы сучаснага мыслення, пра што ўсе ў адзін голас кажуць апошнім часам. Зразумела, б’юць трывогу. Бо на змену непарыўнага лагічнага ланцужка, калі з аднаго выцякае другое, з другога — трэцяе і гэтак далей, паступова прыводзячы да кульмінацыі-ўзрушэння, прыходзіць іншае мысленне — кліпавае. Яно заснавана на хуткай змене асобных, быццам бы не звязаных паміж сабой “пазлаў-карцінак”, скласці якія ў агульнае цэлае павінен сам глядач. І на гэта, здараецца, патрэбен час — асабліва калі “дэталі мазаікі” надта нечаканыя, нязвыклыя. Затое завяршэнне гэтага працэсу складання і выклікае катарсіс, народжаны, такім чынам, не адно эмацыйнай хваляй, але і больш працяглым разумовым напружаннем.

Менавіта па такім прынцыпе былі пабудаваны зусім, здавалася б, адрозныя, нават увогуле супрацьлеглыя спектаклі: згаданае “Жыццё за цара”, якое грунтуецца на дакументальных матэрыялах, звязаных з нарадавольцамі, і нашумелае “Інтэрв’ю з вядзьмаркамі” Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, таксама заснаванае на падборы асобных літаратурных фрагментаў і пастаўленае найталенавітым Яўгенам Карнягам.

Сярод тэатральных тэндэнцый, заўважаных “М.@rt.кантактам”, — асаблівая “музычнасць” некаторых спектакляў, імкненне выкарыстаць увесь багаты патэнцыял чалавечага голасу, рэалізаваны цягам стагоддзяў у жанрах оперы, араторыі, камернай вакальнай лірыцы розных кірункаў, а таксама на стыку спеваў і размоў — ад псальмодый і старадаўніх оперных рэчытатываў-seccо (сухіх) да бардаўскіх песень і сучаснага рэпу. Замест змены візуальнага шэрагу (цягам спектакля ён можа практычна і не зрушвацца) нам прапануюць пастаянную змену слыхавых адчуванняў, багацце фонасферы. Можа, паўплываў і колішні радыётэатр, трансфармаваны ў модныя аўдыякнігі? Дый цяперашняя драматургія часта засноўваецца не на традыцыйнай дыялагічнай структуры, а на звычайных літаратурных тэкстах, усё больш спектакляў ставіцца не паводле інсцэніровак, а паводле арыгінальнай прозы. І такая разнастайнасць у падачы тэксту становіцца, з аднаго боку, драматургічнай неабходнасцю, з другога — дадатковым вытокам мастацкага асэнсавання. Дададзім, што менавіта ў такім кірунку рухаецца галоўны рэжысёр Магілёўскага абласнога драмтэатра Саўлюс Варнас, ствараючы пры гэтым сваю ўласную тэатральную эстэтыку, якая, з аднаго боку, застаецца “ў трэндзе”, з іншага ж — збочвае з агульнага шпацыра на вельмі прыкметную, прыцягальную аўтарскую сцяжынку.

Яшчэ адной новай рысай форуму (і, шырэй, усяго развіцця сучаснага тэатральнага мастацтва) стала імкненне да “трагедыйнай камедыі”, як назвала прафесар Таццяна Арлова спектакль “Бракаваныя людзі” Кіеўскага тэатра “Залатыя вароты” (рэжысёр — Стас Жыркоў, беларускі ўлюбёнец пасля сваёй пастаноўкі “Любові людзей” Дзмітрыя Багаслаўскага, прывезенай на II Маладзёжны тэатральны форум краін СНД, Балтыі і Грузіі). На маю думку, падобны кірунак можна было б азначыць крыху шырэй — канцэпцыйная камедыя. Бо пры ўсім індывідуальным почырку 29-гадовага ўкраінскага рэжысёра, які нават нашага Яўгена Карняга ўспрымае зусім іншым, “больш старэйшым” пакаленнем, ягоныя пошукі цалкам упісваюцца ў жаданне сучасных пастаноўшчыкаў неяк пераадолець “нажніцы” паміж высокім і нізкім, эстэцтвам “для абраных” і маскультурай, а ўрэшце — паміж духоўнасцю і камерцыяй, што так актуальна для цяперашніх рэалій.

Што ж, спалучэнне высокіх трагічных нот з прыземлена побытавымі, з вулічна-кірмашовым нізавым гумарам было ўласціва і Шэкспіру (узгадайце хаця б кантрасныя погляды на каханне ў “Рамэа і Джульеце”). Але цяперашні сінтэз — крыху іншы: сапраўдная трагедыя, філасофскі аповед, глыбокая аўтарская канцэпцыя выкладаюцца не звыклай сур’ёзнай мовай, а адкрыта камічнымі сродкамі, ажно да клаўнады, ды зусім не сатырычнай. Смех у зале не сціхае — бы на добрай камедыі становішчаў. Асэнсаванне ж складанай канцэпцыі часцей прыпадае на “постсмехавы” і нават “посттэатральны” перыяд наведвання спектакля: рогат знік — розум працуе. Замест “горкага смеху” — добрая, спагадлівая ўсмешка (як даказалі навукоўцы, жарты стымулююць мысленчыя працэсы, невыпадкова шмат гумарыстаў нараджаецца сярод фізікаў, урачоў, прадстаўнікоў іншых высокаінтэлектуальных прафесій).

Звярніце ўвагу: камічныя сітуацыі, што выклікалі адпаведную рэакцыю публікі, прысутнічалі практычна ў кожным спектаклі форума. Гогалеўская “Шынель” з Сафіі была вырашана сінтэзам клаўнады з тэатрам лялек, пры гэтым атрымаўся не проста пераказ гісторыі маленькага чалавека, а літаральна ўвесь Гогаль у адным “Шынялі”. Элементы мімічнай клаўнады праніклі ў прывезеную з Чарнігава “Варшаўскую мелодыю” Зорына (праўда, не лепшым чынам). Было з чаго пасмяяцца і ў абсурдысцкай “Лысай спявачцы” Іанэска, і нават у лялечным увасабленні горкаўскай п’есы “На дне” (больш падрабязна пра гэты нашумелы спектакль Магілёўскага абласнога тэатра лялек у пастаноўцы найталенавітага Ігара Казакова — у адным з наступных нумароў). Змяніліся і самі камедыі. Тая ж “Жаніцьба Бальзамінава” Астроўскага, перайменаваная ў “Мроі кахання” (Санкт-Пецярбургскі тэатр “Майстэрня” Рыгора Казлова), страціла рысы “камедыі нораваў” і ператварылася ў спектакль, поўны лірычных летуценняў і тонкай іроніі, памножанай на дабрыню, узнёсласць, высокую рамантыку. Дый раскрытыкаваная п’еса “Рэўнасць” Слапоўскага, пастаўленая Якавам Натапавым у Гомельскім гарадскім маладзёжным тэатры, мае філасофска-трагічнае “падвойнае дно”.

Прычыны такой тэндэнцыі — самыя розныя. Тут і неабходнасць “змагацца” за гледача, дбаючы пра выкананне фінансавых ды іншых паказчыкаў, і стомленасць рэжысёраў ад “камедый non stop”, якія ўсё больш ператвараюцца ў сумнае відовішча, і разуменне нармальнай фізіялагічнай патрэбы чалавека ў “змене рэальнасці”. Калі ў жыцці — спакойнае заціішша, арганізм прагне “шокавай тэрапіі”, экстрыму. Калі ж, наадварот, адольвае трывога, мастацтва пачынае суцяшаць ды весяліць. Але смехавая культура павінна быць рознай — і цяперашнія пошукі ў гэтым кірунку як ніколі актуальныя. Ну, а “М.@rt.кантакт” дазваляе ўсё гэта заўважыць — дзякуй арганізатарам за іх нястомную працу, што мае вялікі плён.

К

выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а таксама дызайну. Свае меркаванні адносна культурнай сітуацыі ў краіне выказалі прадстаўнікі ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (інакш кажучы, дзіцячых школ мастацтваў), устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі і вышэйшай школы. Гаворка ішла пра кадравае забеспячэнне мастацкай адукацыі, інтэграцыю адукацыйнай прасторы, каб ўсе тры згаданыя вышэй чыннікі працавалі паводле ўзгодненай праграмы, маючы на мэце не толькі забеспячэнне краіны дыпламаванымі спецыялістамі, але і пашырэнне ўплыву культуры на ўсю сацыяльную сферу. Зрэшты, чалавек, які спрычыніўся да мастацтва, хоць і не стаў мастаком, будзе творча ставіцца да любой працы. А з гэтага грамадзе — немалая карысць.

■■■

Тымі днямі наш карэспандэнт меў магчымасць пагутарыць пра надзённыя праблемы мастацкай адукацыі з дырэктарам сталічнага каледжа Аляксандрам ШАНТАРОВІЧАМ. І першым пытаннем было, ці варта мінскаму каледжу выцягваць таленавітую моладзь з рэгіёнаў, ведаючы, што мала хто з іх потым вернецца на малую радзіму?

Аляксандр Шантаровіч.

— Сёння ў краіне пятнаццаць сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, дзе рыхтуюць спецыялістаў сферы выяўленчага мастацтва. На жаль, са спецыяльнасцю “жывапіс” іх засталося тры — дзве ў Мінску і адна ў Гомелі, са спецыяльнасцю “скульптура” — дзве: гэта наш каледж і каледж імя Івана Ахрэмчыка. Усе астатнія рыхтуюць дызайнераў (прынамсі, дэкларуюць гэта) і спецыялістаў розных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Што да адцягвання талентаў з рэгіёнаў… Адцягваем, але няшмат. Усё ж такі пераважная колькасць нашых абітурыентаў і навучэнцаў — мінчане альбо жыхары прысталічча. Хаця мне падаецца, што практыка савецкага часу, калі вядомая тады школа Ахрэмчыка збірала ў інтэрнат дзяцей з ўсёй Беларусі, з вёсак, з мястэчак, была вельмі добрай. Хтосьці застаўся ў Мінску, хтосьці — не, а значыць, павёз сталічную школу ў рэгіёны.

Мы сёння супрацоўнічаем ці не з усімі мастацкімі школамі краіны ў рамках конкурса, які мы ладзім штогод. Я маю на ўвазе школы мастацтваў, студыі, цэнтры дадатковай адукацыі. Ведаем выкладчыкаў, якія там працуюць. Сярод іх вялікая колькасць тых, хто ў свой час заканчваў наша вучылішча. І мы ведаем, куды пойдуць нашы дзеці. Безумоўна, агульная тэндэнцыя — застацца ў сталіцы. Гэта тычыцца, урэшце, усіх сфер. Ды і зразумела: магчымасці падрыхтаваць творчую асобу ў сталіцы і у рэгіёне розныя. Так што да нас едуць і будуць ехаць. Але, зноў нагадаю, такіх навучэнцаў не так ужо і шмат. І адна з прычын — тое, што мы сёння, на жаль, не можам прапанаваць ім інтэрнат. Каб яго мелі, плынь ахвотных вучыцца ў нас была б іншай. Нават прытым што пра школы, якія знаходзяцца ў рэгіёнах, можна сказаць шмат добрага, мы аб’ектыўна маем пазіцыі, блізкія да лідарства. Прынамсі, спрабуем іх утрымліваць.

— Ці шмат вашых выпускнікоў працягвае вучобу ў вышэйшых навучальных установах?

— Шэсць — семь гадоў таму, калі я пачынаў тут працаваць, практычна ў ста працэнтаў нашых навучэнцаў мелася скіраванасць на паступленне ў Акадэмію мастацтваў. Сёння іншая сітуацыя. Гэта звязана, хутчэй за ўсё, са змяненнем сацыяльна-эканамічных умоў, але зараз пераважае тэндэнцыя пайсці працаваць, зрабіць перапынак у адукацыйным працэсе і за яго час вызначыцца, куды рухацца далей. Нас за гэта нават крытыкуюць і на ўзроўні акадэміі, і на ўзроўні Міністэрства культуры. Бо ВНУ зацікаўлена, каб абітурыенты былі падрыхтаваныя і каб было з каго выбіраць. Аднак і сярод абітурыентаў акадэміі нашых выхаванцаў хапае.

— Ёсць думка, што надышоў час перагледзець праграму навучання мастакоў з пазіцый эстэтыкі, адпаведных сённяшнім сацыяльна-культурным рэаліям…

— Мы па-ранейшаму прытрымліваемся класічнага падыходу ў адукацыі. На маю думку, на сёння гэта наш моцны бок, праз гэта маем перавагу над падобнымі навучальнымі ўстановамі замежжа. Паездзіўшы за мяжу з нашымі навучэнцамі, я многае бачыў на свае вочы і магу параўноўваць. Мінулай восенню мелі магчымасць наведаць Берлінскую акадэмію. Дык наша моладзь, хоць яна прадстаўляе сярэднюю навучальную ўстанову, у чымсьці студэнтам згаданай ВНУ магла і фору даць. Там пануе разняволенасць, студэнты засяроджаны не на засваенні ведаў, а на самавыяўленні, і ў гэтай справе ім ніхто не ставіць межы. Маўляў, ідзі куды хочаш. Пытаемся ў іх: а з натурай працуеце? Адказваюць, не. Асновы малюнка вывучаеце? Не. Як па мне, мастацкая адукацыя ўсё ж такі павінна абапірацца на традыцыю, на класіку.

Разам з тым навучальны працэс мусіць быць наладжаны такім чынам, каб сутыкненне з рэальным жыццём не было для нашых выхаванцаў стрэсам. Каб яны адпавядалі культурным рэаліям, аказаліся запатрабаванымі. А значыць, нешта ў навучальных праграмах трэба карэктаваць. У прыватнасці, наш дызайнер мусіць разумець механізмы маркетынгу. Не ведаю, як на ўзроўні акадэміі, але на нашым узроўні мы ім такіх ведаў, на жаль, не даем. Можна зрабіць прыгожую карцінку, але паколькі зыходна не было вызначана, для каго і навошта яна робіцца, на яе не знойдзецца спажыўца.

— Дызайн сярод абітурыентаў сёння больш папулярны, чым традыцыйнае выяўленчае мастацтва. Гэта акалічнасць неяк адбіваецца на навучальных праграмах устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі?

— Стан мастацкай адукацыі выклікае заклапочанасць. Трэба ўсведамляць адказнасць кожнай са ступеняў за тое, каб сітуацыю, што склалася, утрымаць, а лепш вярнуць на пазіцыі шасці-сямігадовай даўніны. З аб’ектыўных прычын колькасць дзяцей, якія захапляюцца нейкімі відамі выяўленчага мастацтва, памяншаецца. Якасць іх падрыхтоўкі пагаршаецца. Потым яны прыходзяць да нас у якасці абітурыентаў. Услед за намі праблемы мае акадэмія і іншыя ВНУ. І вось гэты камяк, што разрастаецца, можа прывесці да таго, што ўзровень якасці адукацыі ў сферы выяўленчага мастацтва будзе зніжацца. Пры гэтым я ўпэўнены, што заўжды будуць дзеці, якія могуць рэалізаваць сябе толькі ў нашай сферы. Заўжды, у якой заўгодна сацыяльна-эканамічнай сітуацыі. Адносна той катэгорыі дзяцей, 14 — 15 гадоў, што прыходзіць да нас, вядома, што іх перспектыву вызначаюць бацькі. А яны, безумоўна, бяруць да ўвагі эканамічна-меркантыльны чыннік будучай прафесіі сваіх дзяцей. Калі дзіця яшчэ не разумее, што ў перспектыве будзе трэба ўтрымліваць сябе і сваю сям’ю, дык бацькі тое прагназуюць.

Вось я і думаю, як бы нам у гэтай сітуацыі не згубіць тое, што было назапашана. У нашай сферы нельга падыходзіць да падрыхтоўкі кадраў так, як для вытворчасці. Нельга сёння сказаць, колькі заўтра спатрэбіцца краіне мастакоў ці дызайнераў. Можна пралічыць колькасць медработнікаў, інжынераў, а мастакоў — не. Магчыма, іх усяго тры чалавекі патрэбна. Але, каб ў выніку было тры, спачатку трэба рыхтаваць трыста. Маючы досвед працы ў розных сферах, я магу сказаць, што больш складанай сферы, чым мастацтва, у сэнсе самарэалізацыі прафесіянала няма. І я гэта шчыра кажу і нашым абітурыентам, і іх бацькам.

К

Ювелір, які не літуе ланцужкі і прагне канкурэнцыі

Чаму Богша і побач — Кузьміч нармальна гучыць, што эмальер даведаўся ад студэнтаў пра эмалі і пра салодкую гарбату з салёнай рыбай сярод мора

З нагоды персанальнай выставы, якую брэсцкі мастак, стваральнік адноўленага Крыжа Ефрасінні Полацкай ювелір Мікалай КУЗЬМІЧ ладзіў у сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, рэдакцыя "К" зладзіла сумоў'е з госцем. Гаворка ішла, зразумела, і пра Крыж святой апякункі Беларусі, і пра справы больш зямныя, але ў кантэксце сучаснай культурнай прасторы — даволі важкія.

Падрыхтаваў Пётра ВАСІЛЕЎСКІ



Мікалай Кузьміч і некаторыя з яго мініяцюр. / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

— Спадар Мікалай, дык чым для вас стала нядаўняя выстава ў Мінску — знакавай падзеяй ці планавай справаздачай?

— Я ўвесь час у пошуку. Таму кожную выставу раблю не як выніковую, а як прамежкавую, у спадзяванні, што будуць і наступныя. На гэтай выставе я проста прадставіў сваю бягучую працу. Здаецца, знайшоў фармат і памер, якія адпавядаюць маім цяперашнім задумам. Гаворка пра форму, з якой магу зладзіць. Так, здолею, калі трэба, зрабіць кампазицыю метр на метр ці большую. Але мне больш зручны той памер, што вы пабачылі на выставе. Зрэшты, работы адносна невялікія і транспартаваць лягчэй. У гэтых працах я імкнуўся адлюстраваць усё, чаму навучыўся, што адкрыў для сябе за пэўны перыяд.

— Вы маеце на ўвазе тое, чаму навучыліся як рамеснік, альбо тое, што адкрылі для сябе як мастак? Вось вы скарыстоўваеце старажытную тэхніку, але робіце сучасныя рэчы…

— Хоць рамяство і падмурак творчасці, першасная ўсё ж такі ідэя. Тэхніка — другасная і служыць яе выяўленню. Эмаль мне вельмі падабаецца як матэрыял. Але скарыстоўваю я яе толькі там, дзе ў гэтым насамрэч ёсць патрэба. А бывае, увогуле абыходжуся без яе. Разам з тым, доўгія перапынкі ў працы з матэрыялам, прынамсі, такім складаным, як эмаль, мастаку не на карысць. Як музыканту трэба штодня граць на сваім інструменце, каб быць у форме, так і мастаку варта ўвесь час знаходзіцца ў творча-вытворчым працэсе. Інакш нейкія важныя рэчы выпадаюць з памяці: скажам, тонкасці рэжыму абпалу ці прапорцыі для змешвання рэчываў. І потым трэба шмат намагання, каб зноў увайсці ў рытм.

— Ваша папярэдняя выстава таксама праходзіла ў малой залі Музея сучаснага выяўленчага мастацтва. Што змянілася з тае пары? Тэма нацыянальнай гісторыі па-ранейшаму затаецца стрыжнем вашай творчасці?

— Гэта атрымліваецца нібыта само сабою. Чым бы я ні займаўся, усё адно мае думкі звернуты да вобразаў мінуўшчыны. Скажам, часта бываю ў Полацку, бо з ім звязаны пэўны этап жыцця. (Дарэчы, цудоўныя роспісы там раскрылі: вельмі ўразіла іх стылістыка, і да іх асэнсавання, спадзяюся, я яшчэ прыспею.) Наогул, шмат вандрую па Беларусі. У нас такія прыгожыя замкі — і тыя, што адноўленыя, і тыя, што пакуль у руінах. Вось нядаўна надарылася магчымасць пабачыць Гайцюнішкі, куды я даўно збіраўся паехаць, з агромністай капліцай. Дык гэта ж цуд! Я яе адфатаграфаваў з розных кропак. І гэтым усім прасякаешся, у падсвядомасці назапашваеш досвед. Ну і творы нараджаюцца… Хочацца пазбегнуць просталінейнай ілюстрацыйнасці і перадаць гледачу эмоцыі, што я сам атрымліваю ад прыгажосці зямлі, ад помнікаў дойлідства.

— Каб вам хто ў дзяцінстве сказаў, што будзеце Крыж святой Ефрасінні адноўляць, мабыць не паверылі б?

— Пра што вы кажаце! Я пра Ефрасінню Полацкую толькі ў сталым веку дазнаўся. Таму што да яе вобразу звярталіся беларускія мастакі — Яўген Кулік, Арлен Кашкурэвіч… Карціна з выявай Ефрасінні ў кабінеце Уладыкі Філарэта вісела. Так што пра вялікую асветніцу я пэўнае ўяўленне меў, але пра Крыж наогул не ведаў.

— А як так здарылася, што менавіта на вас выйшлі з гэтай тэмай? Вы ж тады былі без "пагонаў" — без ордэнаў, медалёў…

— Я займаўся мастацтвам эмалі, неяк адразу яго палюбіў. Па размеркаванні трапіў у Брэст. Уступіць у Саюз мастакоў на той час падавалася нерэальным, вырашалася пытанне праз Маскву. Ды і не думаў ніхто пра гэта. У мяне была майстэрня, а ў ёй — муфельная печка. А потым паехаў на завод у Дулёва набыць эмалі, якія там рабілі на ўвесь Савецкі Саюз. Дык мяне ледзь не забілі з гэтай эмаллю: узялі грошы, далі эмаль, потым забралі, даўшы па галаве. А балоты там такія, у тым Дулёве, што маглі і закапаць.

— Чаму такія жарсці?

— Такая была злачынная схема праз дэфіцытнасць тавару. Дэфіцытны тавар, усё цэнтралізавана! Зараз працэсей: купіш — былі б грошы. А пра тое, што можна праз мастацкі фонд набываць, я і не ведаў. Вось і паехаў самахоць, знайшоў, каго шукаў, ля прахадной завода… Так што эмаль, як і любы дэфіцыт, — справа складаная і тонкая. Памятаю, калі праходзіла маскоўская Алімпіяда, завялі гучную крымінальную справу па сувенірах. На аздобу мядзведзікаў выдаткавалі каштоўныя фарбы, у тым ліку золата, вось палову з яго і скралі. Ну а што засталося — разбавілі…

— Вернемся да Крыжа…

— З набыццём незалежнасці ідэя, што называецца, у паветры лётала. Пра гэта я ўпершыню пачуў ад мастака Юрыя Гудзіновіча, які даў мне пачытаць кнížку Уладзіміра Арлова "Крыж Ефрасінні Полацкай". І быў нехта ў нашым прафесійным асяродку, хто першым сказаў, а чаму б той Крыж не зрабіць? Гэта патыхае авантурай, але паколькі я і сам авантурыст, пагадзіўся. Да справы спрычынілася таварыства "Бацькаўшчына", а канкрэтна — яго кіраўнік калай Нікалаеў у Санкт-Пецярбургу — з нашых, навагрудскіх. Вырашылі мы з Лецкам з дапамогай Нікалаева здабыць якасныя фотаздымкі. Прыехалі ў Санкт-Пецярбург, прыйшлі ў музей, пазнаёміліся з дырэктарам. Глядзім, а там — стэлажы шкляных негатываў. І вось нам прынеслі негатыў з выявай Крыжа Ефрасінні Полацкай. За сто долараў яго здрукавалі: фотаздымкі тыя ў мяне дагэтуль ёсць. Вось калі я зрабіў як мог эскіз, тады і рады нейкія сталі збірацца, абмяркоўваць прапанову. Потым з эскізам пайшлі па дабраславенне да Мітрапаліта Філарэта, і ён нас прыняў, справу ўхваліў. Калі ж пачалася ўжо работа, Уладыка падключыў такіх спецыялістаў, як Макарава і Алексееў. Гэтак пабывалі ў маскоўскай Аружэйнай палаце (там вучні Макаравай працавалі), у Гістарычным музеі, што на маскоўскай жа Краснай плошчы, дзе захоўваецца Евангелле XIII стагоддзя, а яшчэ там ёсць эмалька, на стагоддзе старэйшая за саму кнігу. І яе нам дазволілі паглядзець. Так што мелі, ад чаго адштурхоўвацца, але сёе-тое ўсё адно даводзілася вынаходзіць наноў у працэсе працы.

Спансіравала ўсю задуму Беларуская Праваслаўная Царква і тое самае таварыства "Бацькаўшчына", дапамагаў прадпрымальнік Сілівончык. Царква і паездку ў Ерусалім аплаціла. Але каб паехаць у Ерусалім, трэба быць да гэтага гатовым, псіхалагічна і духоўна. Я на той час наўрад ці на такое настроіўся. Іншая справа, што адчуваў падтрымку Ефрасінні. Гэта ж боская справа! (А вось калі ў 2010 — 2014 гадах перарабляў аверс Крыжа, падтрымлівалі толькі спонсары: адзін прадпрымальнік мне з паловай працы паспрыяў, а на другую палову пагадзіўся выдзеліць сродкі… іранскі банк. Хоць звяртаўся я да ўсіх падобных структур і ў нас: пачак лістоў маю! На жаль, амаль паўсоты атрымліўваў фармулёўку: "не представляется возможным".)

— Канкрэтна: візантыйская перагародчатая эмаль — гэта што?

— Гэта калі дротам дыяметрам 0,03 міліметра робіцца малюнак-перагародка ў адну лінію. Гэты малюнак прыліпоўваецца да асновы гарэлкай з тэмпературай у 800 градусаў. А потым слаямі ўнутр малюнка накладаецца эмаль.

— Такая праца рабілася Богшам без мікраскопу…

— Былі лінзы. Але галоўнае — вочы майстра. "Селі" вочы — заканчваецца майстар. Для такой працы патрабаваліся яшчэ і моцныя нервы. Замовіць такую рэч маглі толькі першыя асобы старадаўняй дзяржавы.

— Крыж — нацыянальная святыня. Вы, пераставраўшы Крыж, сталі часткаю ягонай гісторыі. Вы з гэтай нагоды ўсведамляеце сваю значнасць, пачуваецеся ў пэўным сэнсе гістарычнай асобай?

— Не.

— А Лазар Богша і побач — Мікалай Кузьміч? Гэта гучыць нармальна ?

— Нармальна.

— Першыя дні па сканчэнні працы...

— Я быў шчаслівым, што скончыў, што зрабіў гэта. Але не схільны перабольшваць уласнае месца ў вялікай справе.

— Але ваша імя ўвайшло ва ўсе даведнікі….

— Для мяне больш істотнае тое, што я паспеў выправіць непазбежную ў той экстрэмальнай сітуацыі памылку: перарабіў вонкавы бок Крыжа. За прамінулы тэрмін я выйшаў на новыя веды, якіх у час асноўнай працы ў мяне быць не магло. І вось пасля Крыжа я шмат працаваў з эмалямі, замоў ставала. Зноў жа з'явілася Сеціва. Скажам, я пазнаёміўся з грузінскімі тэхналогіямі. Гэта дазволіла мне і сваю працу ўбачыць у іншым святле.

— Ну а зараз вы задаволены тым, што зрабілі?

— Зараз задаволены. Збольшага…

— Збіраецеся працягнуць дапрацоўку? Мо адваротны бок Крыжа перарабіць варта?

— Дык гэта можна ўсё жыццё "агладжваць"… Урэшце, няма мяжы дасканаласці. А галоўнае — школы няма. А на тое, каб перарабіць адварот Крыжа, патрэбны грошы, а іх няма. Звяртаўся па гэтым пытанні да кіраўніцтва царквы, прасіў ад матэрыяльнай дапамозе, але атрымаў адказ, што Крыж "находится в рабочем состоянии, он исправен, его можно показывать". А каб нешта з ім зрабіць, вялося ў лісце, патрэбны ахвяраванні, якіх у патрэбнай меры пакуль няма.

— Дзе, на вашу думку, можна знаходзіцца Крыж, які рабіў Лазар Богша?


"Валоданне ўнікальнымі ведамі ўспрымаецца у Расіі **як чыннік канкурэнтаздольнасці на мастацкім рынку.** А ў нас? Каб узнікла школа мастацтва эмалі, патрэбны сродкі. Або каб я за свае сродкі адкрыў школу і займаўся з дзецьмі ці са студэнтамі. Дык не мая гэта задача ў такім маштабе".


"Хочацца нейкую **калекцыю стварыць.** Я падарыў Нацыянальнаму мастацкаму з год таму 85 работ".

— Гэта не да мяне пытанне. Адно ведаю: ён быў у стане, далёкім ад ідэальнага.

— А чаму пасля перастварэння Крыжа ў Беларусі школа мастацтва эмалі не ўзнікае? У нас ёсць знакавы аб'ект, каб адштурхнуцца…

— На гэта патрэбны сродкі. Або каб я за свае сродкі адкрыў школу і займаўся з дзецьмі ці са студэнтамі. Дык не мая гэта задача ў такім маштабе.

— Акадэмія мастацтваў ніколі не цікавілася вамі як выкладчыкам? Скажам, каб вы раз на пяць гадоў набіралі курс?

— Не. Я нават размаўляў у свой час з рэктарам. Агучыў ідэю. Ды, можа, час быў такі, што, відаць, не пасавала тая задума. Цікава, што калі пару гадоў таму давялося наведаць пецярбургскую Акадэмію барона Шцігліца (браў удзел у конкурсным выставе і атрымаў III прэмію па эмалі), там проста ходзячы па калідорах вучыцца! Я там рабіў майстар-клас, а насамрэч тамтэйшыя студэнты майстар-клас далі мне. Ад іх даведваўся, што эмалі трэба паліраваць рознымі нумарамі наждачак, як паліруюць камень. А да таго часу ведаў толькі пра вогненную паліроўку. Урэшце, увесь мой майстар-клас студэнты здымалі на відэа. Валоданне ўнікальнымі ведамі ўспрымаецца у Расіі як чыннік канкурэнтаздольнасці на мастацкім рынку. А ў нас?

— Урэшце, гэтай справай у Беларусі ніхто не займаецца, лічы, цалкам адсутнічаюць канкурэнты. А яшчэ паўсюль пішуць, што вы ўваходзіце ў пяцёрку самых буйных творцаў гэтага кірунку ў свеце…

— Адсутнасць канкурэнцыі — гэта, можа, і зручна для таго, хто валодае манаполіяй, але для справы — нядобра. Я хацеў бы, каб мае веды і досвед аказаліся запатрабаванымі, каб вучні былі.

— Ёсць, можа, прафесіяналы не горшыя, чым вы, але ў іхнім творчым актыве няма такога прэстыжнага аб'екта, як Крыж Ефрасінні. Рабіць рэчы дарагія і прыгожыя — справа, зрэшты, звычайная, а вось каб твор стаў народнай святыняй, адным з сімвалаў краіны — гэта рэдкі выпадак. А мо штосьці яшчэ з такога ж прэстыжнага шэрагу хацелі б зрабіць? Скажам, аднавіць карону Вітаўта…

— Каб гэту ідэю ўхвалілі на самым высокім дзяржаўным узроўні, я б з задавальненнем узяўся за яе рэалізацыю.

— Эмаль вас корміць? З чаго жывяцё?

— А зараз я ўжо стаў ювелірам, і таму — няшчасны чалавек. Калі пачаў рабіць стаўратэку, давялося атрымліваць ліцэнзію на права працы з каштоўнымі металамі. А каб яе займець, неабходна выканаць шэраг умоў. Санстанцыя, пажарныя, ахова, пэўныя інструменты трэба штогод сертыфікаваць. І вось я адзіны ў Беларусі (канстатую тое не без гонару), мастак, які мае гэту ліцэнзію. Кожны мой крок распісаны, задакументаваны. У адной з краін Балтыі, дзе жыве мая дачка, такога няма: на свой страх і рызыку ўсё робіш сам. У Грузіі таксама: прыносіш выраб у прабірную палату — і яны ставяць кляймо, калі зрабіў нармальна. А што корміць мяне? Раблю ювелірныя рэчы. Праўда, у мяне няма ліцэнзіі на продаж сваіх вырабаў, але зараз я хачу атрымаць майстэрню, каб была ўсё ж такі свая вітрына, каб я мог прапанаваць прадметы ахвотным. А працаваць з людзьмі ў тым сэнсе, каб зліваць ланцужок ці зрабіць абручальны пярсцёнак (да мяне часта з такімі просьбамі звяртаюцца)… Не маё.

Заканчэнне чытайце **на старонцы 14.**

Мастыхін

Першая персаналія

Іна Булгакава — чалавек вядомы не толькі ў Беларусі. Мастачка па прызванні, яна працуе ў галіне мастацкага афармлення тканін, сцэнічных строяў, а таксама ў станковым жывапісе і графіцы. Але дызайн адзення — галоўная яе любоў.

Барыс КРЭПАК

Я знаёмы з ёй з канца 1960-х, калі Іна Барысаўна кіравала групай мадэлявання Дома мадэлей у Мінску. Потым, у пачатку 1980-х, працавала некалькі гадоў мастацкім кіраўніком Тэатра мод. Памятаю і тую кароткую старонку яе творчага жыцця, калі разам з мужам Уладзімірам Булгакавым (абое — выхаванцы Маскоўскага тэкстыльнага інстытута) працавала над эскізамі касцюмаў для "Песняроў". Лепшыя мадэлі мастачкі ўжо ў тыя далёкія часы — у 1970 — 1980-я — былі звязаны з яскравымі прэзентабельнымі калекцыямі для замежных дэфіле. Іх галоўны матэрыял — адбелены лён з каляровымі вышыўкамі і ткаўтвам у народным беларускім стылі. Атрымаўшы міжнародную апрабацыю, тыя ўзоры тканіны сёння лічацца сапраўднай класікай, тым больш вопыт работы мастачкі ў Доме мадэлей (Беларускі цэнтр мод) тады вельмі спатрэбіўся і Мінскай фабрыцы мастацкіх вырабаў.

Але самае дзіўнае, што персанальная выстава Іны Булгакавай, якая зараз працуе ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, — першая ў яе жыцці! Хаця, па вялікім рахунку, на многіх паралелях і мерыдыянах планеты з поспехам прэзентаваліся яе непаўторныя сцэнічныя строі. Цяжка сказаць, колькі краін замежжа бачылі гэтыя творы: пачынаючы ад парыжскага Тэатра П'ера Кардэна, буйных гарадоў Іспаніі, Італіі, Францыі, Балгарыі, Індыі, Японіі і заканчваючы Масквой і Ленінградам — Санкт-Пецярбургам, дзе пад апладысменты гледачы сустракалі ці то вар'етэ "Летні сад", ці то Маскоўскі балет на пёдзе ў "афармленні" Булгакавай. Я не кажу ўжо пра нашу Беларусь, дзе Іна Барысаўна афармляла касцюмы для ансамбляў "Крыжачок", "Верасы", "Радасць", працавала над строямі ў нацыянальным стылі, вобразную і колеравую аснову якіх "запазычыла" ў час шматлікіх паездак па рэгіёнах Беларусі, у тым ліку побач з выдатным этнографам Міхаісём Раманюком і жывапісцам Міколам Селяшчуком. Такія паездкі пазней дапамаглі Булгакавай у даследаванні этнаграфічных каранёў народнага мастацтва, што вельмі спатрэбілася ёй у будучай распрацоўцы ўласных гістарычных і сучасных строяў. Прымала яна таксама актыўны ўдзел ў распрацоўцы фасонаў адзення і для паўсядзённасці, і для рэлігійных святаў, і для алімпійцаў.

Ад эскіза — да касцюма.

У эскізапісі паказаны толькі некаторыя творы сцэнічнага адзення (эскізы і "ў матэрыяле"). "Праспяваць" пра сябе "на ўвесь голас", канешне, не дазваляе невялікая выставачная пляцоўка музея. Урэшце, хачу сказаць, што налета буйная выстава Іны Барысаўны цалкам магла б "атабарыцца" ў Нацыянальным мастацкім музеі ці ў Палацы мастацтва. Дарэчы, і разам з творамі яе таленавітай дачкі Кацярыны, якая зараз працуе мастачкай у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

У сённяшняй жа экспазіцыі асаблівую ўвагу ўяўляюць эскізы касцюмаў Іны Булгакавай да оперы Юрыя Семянякі "Новая зямля" па матывах паэмы Якуба Коласа. Гэты спектакль Сямёна Штэйна, калі хто памятае, з вялікім поспехам у 1982 годзе быў пастаўлены ў Беларускім дзяржаўным тэатры оперы і балета. Выстаўлены і маляўнічыя строі, зробленыя для Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя Іосіфа Жыновіча і Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору краіны імя Генадзя Цітовіча. Ёсць і некалькі партрэтных графічных работ, звязаных з тэатрам, у прыватнасці, з той жа "Новай зямлёй".

Мне здаецца, галоўная заслуга Булгакавай у тым, што яна прымусіла нас інакш зірнуць і на работу сучаснага мастака-мадэльера, дадала ўпэўненасці ў тым, што ў наш складаны ультраіндустрыяльны час мастацтва касцюма здольнае захаваць эмацыйнасць і эстэтычную выразнасць паўнавартаснай творчасці, што традыцыі беларускага народнага фальклору, праз прызму якіх мастачкай успрымаюцца новыя плыні ў высокай і штодзённай модзе, ніколі не згаснуць… К

Тэатральная плошча

Тры любові тых самых людзей

П'есу "Любоў людзей" вядомага беларускага артыста і драматурга Дзмітрыя Багаслаўскага айчынныя гледачы змаглі ўбачыць адразу ў трох розных варыянтах. Так, у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі яна ідзе ў версіі заслужанага дзеяча мастацтваў нашай краіны Аляксандра Гарцуева, азначаная як "пасляковая драма пасярод 70-х". Але раней, чым на радзіме, яна была пастаўлена ў блізкім замежжы (увогуле ж увасоблена ў 13 тэатрах!). Дзякуючы тэатральным фестывалям, што праходзілі ў сталіцы і Бабруйску, можна было пераканацца, як па-свойму прачытаў адзін і той жа тэкст ва Украіне і ў Расіі. Тым і цікавы тэатр: ён вечна зменлівы, непрадказальны — як само жыццё.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Сцэна са спектакля "Любоў людзей". Фота прадастаўлена тэатрам.

Рэальнае, а не "прыпудраное" жыццё, адлюстраванае ў п'есе, набыло розныя мастацкія ўвасабленні — быццам адна і тая ж крымінальная гісторыя была пераказана трыма рознымі апавядальнікамі, з акцэнтамі, у кожным з выпадкаў, на драму, трагікамедыю і меладраму "настальжы". Жонка забівае мужа-п'яніцу, бярэ новы шлюб, але… пакутуе ад зробленага, трызніць, прывід забітага не дае ёй спакою. Паралельна і ў сляпценні з гэтай лініяй намаляваны іншыя "гісторыі кахання" — скрозь пакутлівыя, нешчаслівыя. Тое ж і са старэйшым пакаленнем: і Люська, і Сяргей гадаваліся ў няпоўных сем'ях, з адной маці. Таму на першы план выходзяць зусім не сюжэтныя перыпетыі, а развагі герояў пра каханне — ва ўсёй безлічы яго выяўленняў.

Спектакль Маскоўскага акадэмічнага тэатра імя Уладзіміра Маякоўскага (а менавіта там п'еса была пастаўлена ўпершыню, у 2012 годзе, адразу пасля яе напісання ў 2011-м) пазначаны як "карціны з жыцця людзей напярэдадні зімы і ў каканні лета". Ён — пра агрэсію, якая, бы нейкі вірус, лунае ў паветры, перадаецца ад аднаго да іншага, змяняючы месцамі ахвяру і яе крыўдзіцеля. Рэжысёр Мікіта Кобелеў не цураецца жорсткіх сцэн, але нідзе не сыходзіць да ілюстратыўнасці, знаходзячы ёмістыя мастацкія алюзіі. У сцэне гвалтавання, да прыкладу, героі ўвогуле не кантактуюць, седзячы тварам да залы на значнай адлегласці між сабой. Ён — б'е мокрай анучай па падлозе, яна — уздрыгвае ледзь не ў канвульсіях. Усё астатняе "дамалёўвае" ўяўленне гледача, які, да ўсяго, вымушаны ставіць сябе на месца то аднаго, то іншага героя, даследуючы сітуацыю з розных бакоў.

У Кіеўскім акадэмічным Маладым тэатры спектакль, жанрава акрэслены проста як трылер, аказаўся пра суседзіны індывідуума і натоўпу, пра страту чалавечай асобы, прывіднасць становішча, калі быццам "усё, як у людзей". Рэжысёр Станіслаў Жыркоў вымушаў залу смяяцца (чаго каштавалі хаця б "птушыныя" ўзлёты міліцыянера Сяргея), каб потым бязлітасна кінуць у багну няўмольнай трагедыі. Сацыяльная драма паўставала трэшам, блізкім моладзі. Праз гэтыя элементы пародыі, розныя варыянты смехавой культуры — ажно да наўмыснага кітчу — ніяк не губляўся сэнсавы складнік. Наадварот, ён толькі ўзмацняўся, пададжаны па прынцыпе кантрасту, ды яшчэ — у самыя нечаканыя моманты. Быў выкарыстаны і прынцып "пералому ў час антракта": першая дзея была больш скіравана на камічнасць, другая — на трагізм. А што ж айчынная пастаноўка?

Версія нашага РТБД у поўнай меры адпавядае ходжім думкам пра "памяркоўнасць" беларусаў: зменены нават фінал, каб не было ніякай не толькі "чарнухі", але і ўсялякага намёку на канфліктнасць. Адпаведна, купіраваны некаторыя сцэны, асобныя фразы — усё, звязанае з гвалтам у сям'і. Застаецца, дый тое пункцірам, хіба тэма "іншых", "не такіх": на танцах увесь час б'юць "надта моднага" хіпі.

Першага мужа Люські грае малады, прыгожы, кранальны Ілья Ясінскі, якога і ў страшным сне немагчыма асацыяваць з алкаголікам (як неадночыны заяўляў рэжысёр Аляксандр Гарцуеў, вобраз Колі пададзены скрозь прызму ўспамінаў Люські). Міжволі прачэрчваецца думка: беражыце мужчын! Зварот да 1970-х (а менавіта на гэтыя гады прыпадае маладосць тых, хто сёння складае "асноўны кантынгент" тэатральнай публікі) надае спектаклю адценне настальгіі — не проста па прамінулых дзесяцігоддзях, а яшчэ і па першым каханні, якое, паводле спектакля, застаецца назаўжды і з'яўляецца мацнейшым за ўсе далейшыя "сурагаты". Відавочна і ўздзеянне тэлесерыялаў, дзе меладрама суседнічае з крымінальнымі "разборкамі".

Фінал, пры ўсім яго быццам бы трагізме, нагадвае хэпі-энд: Люська сядзіць у атачэнні абодвух сваіх кавалераў, што павінна сімвалізаваць "любоў пасля смерці".

Своеасаблівым лейтматывам спектакля становяцца не размовы пра каханне, а… танцы. Дакладней, сама танцпляцоўка. Праз яе не толькі перадаецца згаданая атмасфера 1970-х, але і намацваецца нітачка да той песенна-танцавальнай стыхіі, што была ўласціва беларускаму тэатру пачатку XX стагоддзя (прыгадаем трупы Ігната Буйніцкага, Уладзіслава Галубка) і можа лічыцца адной з найбольш глыбінных асаблівасцей нацыянальнай культуры. Цікава, дарэчы, што тыя ж сувязі з адзначаным перыядам першага нацыянальнага Адраджэння прасочваюцца і ў раней пастаўленым спектаклі таго ж РТБД — "Фінт-круазэ", дзе з'яднаны дзве сучасныя камедыі: "Перапіс насельніцтва" таго ж Багаслаўскага і, у суаўтарстве з Віктарам Красоўскім, "Сватаўство".

Як бы тое ні было, а пасля праглядаў патройнай "Любові людзей" — любоў застаецца. Найперш да п'есы (і, шырэй, таленту маладога беларускага драматурга). А яшчэ — да тэатра (у самым шырокім сэнсе гэтага слова), які ўжо самой рознасцю пастановак адной п'есы замацоўвае ідэю альтэрнатывы, без якой немагчыма аніякае развіццё. К

Перад тым як пачаць расповед пра шматгранную івацэвіцкую культуру, усё ж вернемся ў Ляхавічы. У тамтэйшым "інфармацыйна насычаным" гатэлі свежы нумар раённай газеты нам паведаміў, што гурту "Народныя музыкі" спаўняецца 25 гадоў. Не маглі прайсці міма такой нагоды, таму і завіталі ў Ляхавіцкі ГДК, дзе і "прапісаны" народны калектыў.

Яўген РАГІН,
Кастусь АНТАНОВІЧ, Мінск — Стаўбцоўскі раён Міншчыны — Ляхавіцкі і Івацэвіцкі раёны Брэстчыны — Мінск

Журналісцкі аўтатур газеты "Культура"

Метадычны кантэкст клубнага мерапрыемства

У час справаздачнага канцэрта.

Добраму канцэрту яшчэ б

І "Народныя музыкі"...

Мастацкага кіраўніка "Народных музыкаў" Эдуарда Сяліцкага, на жаль, не заспелі, бо жыве гэты творчы чалавек у суседніх Баранавічах, адтуль прыязджае на рэпетыцыі ды канцэрты. Дырэктар Дома культуры Мікалай Ламака распавёў нам, што песенны кірунак для ўстановы культуры — даўні і пашанотны. Пад дахам ГДК дзейнічаюць 22 самадзейныя калектывы, у тым ліку — пяць народных, заслужаны ды ўзорны. А гэта, пагадзіцеся, паказчык. Увогуле, песня Ляхавіччыны — адметная ў сваіх старадаўніх традыцыях. Варта згадаць тут Падлескі народны хор, якому споўнілася 75 гадоў і ля вытокаў стварэння якога стаяў знакаміты Генадзь Цітовіч. Пра гэта нам распавёў кіраўнік метадычнага цэнтра Юрый Грынь, які і шчыруе для таго, каб спеўная традыцыя краю стала паўнавартасным мастацкім набыткам усёй Беларусі.

А "Народныя музыкі" выраслі з народнага ансамбля народнай музыкі "Крыніцы", які ў 1987 годзе стварыла і якім кіруе Людміла Ламака, жонка дырэктара ГДК. Вось такія перапляценні творчасці. Дарэчы, галасістыя і сыны ў Ламакаў. Людміла Казіміраўна вельмі прасіла падзякаваць добрым словам кампазітару Леаніду Захлеўнаму, які словам ды справай заўжды падтрымлівае "Крыніцы".

На развітанне Людміла Ламака зацягнула песню. Няўжо жанчына на такую магутнасць здольная? Падалося, што нават дах ГДК здзіўлена прыўзняўся. Гэтая творчая моц і суправаджала нас да **Івацэвіцкага раёна**.

(Не)лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

З галоўным метадыстам мясцовай культуры Юрыем Грынем мы гаварылі пра выкананне плана па аказанні культурных паслуг насельніцтву. У чарговы раз быў ухвалены факт пра шчыльную сістэмную гастрольную дзейнасць самадзейных калектываў раёна. Але нават не гэта падалося галоўным (асабліва пасля таго, як мы пачалі разбірацца ў таямніцах "пазабюджэткі" па ўстановах культуры Івацэвіцкага раёна). Усё ж, як паказвае практыка, пазабюджэтная дзейнасць дае стабільны плён там, дзе насельніцтва прывучылі плаціць за любую культурную паслугу. Ключавое слова тут — "прывучылі". Там, дзе з гэтым спазніліся, узнікаюць праблемы. Я забягаю наперад, але відавочным застаецца тое, што пасля сыходу на пенсію вопытнага начальніка аддзела культуры Івацэвіцкага райвыканкама Любові Фосцікавай надта вялікая цякучка кадраў была на гэтай пасадзе. Толькі гэтым тлумачу праблемы з выкананнем плана пазабюджэтнай дзейнасці па Івацэвіцкім раёне. Але пра гэта — крыху ніжэй.

Калектыў "Медуніца" і юная спявачка Ксюша.

Шчаслівая нечаканасць

Па дарозе мы параіліся з начальнікам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Івацэвіцкага райвыканкама Святланай Завадскай, якія паселішчы з карысцю для сябе мы можам наведаць на маршруце да раённага цэнтра. Святлана Васільеўна зазначыла, што можна завітаць у Любішчыцы, дзе яна колісь кіравала СДК. Інфармацыю прынялі да ведама, але калі заўважылі на трасе ўказальнік **"Дабрамысль"**, вырашылі звярнуць і сюды. Журналісцкая інтуіцыя не падманула, трэба сказаць…

Мы прызвычаіліся апошнім часам пісаць пра тое, што ў сельскіх установах культуры, нават у другой палове дня, няма наведвальнікаў. Нам кажуць: "Ды вось толькі былі — сышлі. Вы з'едзеце — зноў з'явяцца. Абавязкова!" Верым на слова, аднак, бывае, з-за пустэчы ў бібліятэках і клубах нават рукі апускаюцца. Няўжо сапраўды сельскія ўстановы культуры насельніцтвам не надта запатрабаваныя?

Дык вось, у вёсцы Дабрамысль гэтае пытанне нават і не ўзнікла. Дый ці магло яно ўзнікнуць у паселішчы з такой назвай? Купкі людзей чагосьці чакалі на ганку сельскага клуба, людна было і ў памяшканнях будынка. Яшчэ на ўваходзе хлопчык Валодзя сказаў нам, што неўзабаве пачнецца тут справаздачны канцэрт (на які, як аказалася, прыедуць метадысты з райцэнтра), а потым будзе сельсаветаўскі сход. А ў канцэрце, з важнасцю дадаў Валодзя, выступаць у ліку іншых будуць ягоныя бацькі: Юрый і Таццяна Шылы, першы — акампаніятар СК, другая — настаўніца музыкі мясцовай школы. Каб не інтуіцыя, і не патрапілі б на такую цікавостку!

Перад канцэртам пагутарылі з загадчыкам сельскага клуба Галінай Шаўчук, якая не так даўно за-

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Талачыншчына /

Пытанні — праз партал...

Жыхары Талачына атрымалі запрашэнне наведаць Талачынскую цэнтральную раённую бібліятэку і ўзяць удзел у Тыдні інфармацыі "У Год культуры — у бібліятэку". Здавалася б, шараговая падзея для кожнай бібліятэкі. Аднак асаблівасцю дадзенага Тыдня стала тое, што ўсе імпрэзы праходзілі ў новым памяшканні, якое было адкрыта ў мінулым верасні падчас правядзення ў нашым раёне абласнога свята "Дажынкі".

Сёння ва ўстанову запісана больш за тры тысячы чытачоў. Шмат новага і незвычайнага прапанавалі ім супрацоўнікі Талачынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі і ў рамках Тыдня інфармацыі. Праграма ўключала наступныя мерапрыемствы: "Знаёмцеся: Букросінг"; "Свет культуры": выстава-агляд; "Публічны цэнтр прававой інфармацыі запрашае…"; "Бібліяграфія — у дапамогу чытачам"; "Да нас новая кніга прыйшла".

Скажам, выстава-агляд "Свет культуры" была арганізавана ў чытальнай зале. Супрацоўнікі бібліятэкі паспрабавалі прадставіць культуру ў шырокім сэнсе гэтага слова: у нашай гістарычнай памяці, зберажэнні нацыянальных традыцый, творчай дзейнасці чалавека, духоўным развіцці, у стаўленні адзін да аднаго, у думках і пачуццях.

Наведвальнікі даведаліся і пра тое, што Публічны цэнтр прававой інфармацыі дае магчымасць карыстацца банкам даных адпаведнай інфармацыі нашай краіны "Эталон". Пасля знаёмства з ПЦПІ у анлайн-рэжыме жадаючыя праз партал Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі задавалі пытанні юрысту-спецыялісту. Для школьнікаў быў праведзены прававы ўрок "Твае правы, падлетак". Падчас яго вучні пазнаёміліся з асноўнымі дакументамі, у якіх зафіксаваны правы дзіцяці.

Дзень бібліяграфіі ў талачынскай бібліятэцы.

Адзін з калектываў — удзельнікаў конкурсу.

Чарговы інфармацыйны дзень прайшоў як дзень бібліяграфіі. Цікавасць да гэтага кшталту інфармацыі выявілі школьныя бібліятэкары, педагогі, навучэнцы, краязнаўцы. Аматараў чытання і камунікавання сабраў Дзень інфармацыі "Да нас новая кніга прыйшла". У чытальнай зале і на абанеменце былі арганізаваны кніжныя выставы, тэматычныя паліцы. Спецыялісты бібліятэкі прапанавалі наведвальнікам кнігі, DVD-дыскі серый "Адукацыйная праграма", "Агучаны твор літаратуры"; "Інтэрактыўны свет", "Электронная бібліятэка — школьнікам".

Потым удзельнікі Тыдня інфармацыі (больш за 150 асоб) запоўнілі анкету. Пасля аналізу адказаў на пытанні работа бібліятэкі будзе скарэктавана.

Ірына ТРУХАНЁНАК,
бібліёграф
Талачынскай ЦБС

Віцебшчына /

Вынікі падвядзе сталіца

"Не старэюць душой ветэраны" — пад такой назвай у аграгарадку "Ноўка" Віцебскага раёна і гарпасёлку Ушачы адбыўся абласны конкурс клубаў "Ветэран" і ветэранскіх творчых калектываў, які сабраў каля 900 удзельнікаў з усіх рэгіёнаў Віцебшчыны — а гэта, больш за 45 калектываў і 40 індывідуальных выканаўцаў у розных жанравых

і асвятленне пасавала...

няла гэту пасаду. Як высветлілася, нягледзячы на планы раённага кіраўніцтва, вёска Дабрамысль так і не стала аграгарадком. А летась у выніку аптымізацыі сельскі дом культуры быў пераўтвораны ў сельскі клуб. Адпаведна скараціліся і штатныя адзінкі. Цяпер з творчага складу засталіся загадчык СК і на палову стаўкі — акампаніятар. Але апроч аптымізацыі ўстанова летась зведала і рамонт. У выніку была прыведзена да ладу танцавальная зала, страха будынка. Дапамагла ў гэтай справе мясцовая ПМК.

Нягледзячы на паніжэнне ў статусе, установа культуры шукае магчымасці да развіцця. Прынамсі мы пераканаліся, што высокі ўзровень тут дэманструе гурток выцінанкі, творы якога дэманструюцца ў фае будынка, а таксама мясцовы музычны калектыў народнай песні. Пра яго

У бібліятэцы.

"Народныя музыкі" падчас рэпетыцыі юбілейнага канцэрта.

Вучаніца 5 класа музычнай школы Вікторыя Карачун.

пагаворым напрыканцы матэрыялу — як пра хэдлайнера справаздачнага канцэрта.

(Не)лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

У час нашых аўтападарожжаў заўсёды імпануе, калі сельскія ўстановы культуры аб'яднаны пад дахам аднаго будынка. Яшчэ больш падабаецца, калі гэтых устаноў не дзве, — бібліятэка і дом культуры — а некалькі. Калі дзеці і дарослыя могуць тут паспяваць і патанчыць, узяць кнігу і пагуляць у шахматы, скарыстацца трэнажорнай залай ці хаця б більярдам і пакаштаваць гарбаты па адмысловым рацэпце з зёлак. Такія ўстановы сустракаліся нам і ў Ляхавіцкім, і ў Любанскім раёнах. Такой жа запатрабаванай мясцовай супольнасцю і насычанай падалася і ўстанова ў Дабрамыслі.

Бібліятэчны кантэкст

У фае пакрысе збіралася аматарскае аб'яднанне "Медуніца". Галіна Шаўчук вельмі хвалявалася ў чаканні начальства з райцэнтра. А тут яшчэ і мы. Каб не замінаць, вырашылі пабываць да пачатку мерапрыемства ў бібліятэцы, што месціцца на другім паверсе. Так і пазнаёміліся з бібліятэкарам Нінай Ліс. Сітуацыя, у якой яна апынулася, крыху нагадвае пачатак бібліятэчнай кар'еры Іны Андроцкай з Мікалаеўшчыны. Ніна Іванаўна таксама пачынае справу ў Дабрамыслі з чыстага аркуша. Працавала бібліятэкарам у Сяльцы (чатыры кіламетры адсюль). А калі бібліятэкар з Дабрамыслі Людміла Сахута пайшла на заслужаны адпачынак пасля амаль двух дзясяткаў гадоў працы, пасаду прапанавалі Ліс.

Дык з чаго збіраецца пачынаць? Як і яе каляжанка з Мікалаеўшчыны, з інфармацыйнага забеспячэння сваёй працы.

Але напачатку паразмаўлялі з чытачамі, якіх заспелі ў бібліятэцы. Скарга адна: недахоп гістарычнай, духоўнай літаратуры, кніг, якія прымушаюць задумацца, паразважаць. У аддзела камплектавання ЦБС, відаць, сваё бачанне на сітуацыю: маладога пакалення ў вёсцы адносна багата: 80 школьнікаў і 20 дзетак ходзяць у дзіцячы садок. А таму, калі і папаўняецца бібліятэка новымі кнігамі, то, па словах бібліятэкара, пераважна дзіцячай літаратурай.

Але калі чытачы наракаюць на абмежаваныя бібліятэчныя фонды, то бібліятэкарка — на малую колькасць чытачоў. Маўляў, сядзяць аднавяскоўцы па хатах, утаропіўшыся ў тэлевізары, забыўшы на царкву, бібліятэку, не кажучы ўжо пра клуб. Разам прыйшлі да высновы, што без анкетавання мясцовай грамады тут ніяк не абысціся. Без вызначэння зацікаўленасцей якаснай працы ў работнікаў культуры не атрымаецца. Невыпадкова ў час нашых аўтатураў сутыкаліся з сітуацыяй, калі для павелічэння запатрабаванасці сельскіх бібліятэк там ствараліся гурткі па кулінарыі, садаводстве і агароднiцтве, клубы чытачоў з сумесным абмеркаваннем навукова-папулярных часопісаў.

І гэта прыносіла свой плён. А таму разнастайныя фарміраванні пры бібліятэках — гэта не модная з'ява, а жыццёвая неабходнасць, пра якую нельга забывацца, абклаўшыся фармулярамі і каталогамі.

Лямпачка Ільіча — не перашкода

Шпацыруючы да пачатку канцэрта па будынку сельскага клуба, пачулі ў адным з пакояў гукі баяна і не маглі туды не зазірнуць. Мо рэпетыцыя да справаздачнага канцэрта? Але не. Аказалася, што ў невялічкім кабінеце размяшчаецца філіял музычнай школы, а ўласна баян паспяхова асвойвае юная жыхарка Дабрамысля Вікторыя Карачун…

А цяпер — самы час наведаць глядзельную залу СК. Тут ужо ўсе сабраліся: некалькі дзясяткаў вяскоўцаў ды метадысты з Івацэвічаў. Метадысты — гэта Алена Шэлест — па выставачнай дзейнасці, Ірына Дука — па аматарскай творчасці, Алена Цітова — па культурна-дасугавай дзейнасці. Кажуць, што такія выезды ў іх — па некалькі разоў на тыдзень. Справа ў тым, што на Івацэвіччыне ідзе цяпер адбор калектываў для ўдзелу ў конкурсах ды фестывалях, у прыватнасці, на абласны фестываль "Спораўскія жарты".

І такі сістэмны адбор дае цудоўную магчымасць ацаніць дзейнасць клубных фарміраванняў. Пра аказанне аператыўнай разнажанравай метадычнай дапамогі мы і не кажам. Прынамсі, такога вялікага метадычнага дэсанта ніколі дагэтуль не бачылі. Так што, метадысты Івацэвіччыны, вялікі вам дзякуй за прадметную ўвагу да сяла і да яго культуры!

Рэй на канцэрце вялі "Медуніца" і Юрый ды Таццяна Шылы (сын Валодзя паглядаў на нас з задавальненнем). Шмат песняў было на роднай мове. Самадзейныя артысты трымаліся на сцэне ўпэўнена. Асабліва — маленькая Ксюша. Вяла канцэрт і спявала як мае быць загадчыца СК Галіна Шаўчук. Мы зрабілі шмат фотаздымкаў. Але ці перададуць яны атмасферу еднасці, што панавала тым вечарам у глядзельнай зале сельскага клуба?

Агульнае ўражанне не сапсавала нават не вельмі ўтульная зала СК, слабая музычная апаратура і кепскае святло на сцэне. Галіна Шаўчук прызналася, што ўчора святло ўвогуле знікла. У аўральным парадку яны з мужам (дарэчы, старшынём сельсавета) Мікалаем Шаўчуком шукалі ды падключалі прыдатную лямпачку.

У выніку мы сталі сведкамі жывога нефармальнага мерапрыемства. Даўно не адчувалі такога задавальнення, якое па сваёй атмасферы можа даць фору сталічным клубным канцэртам.

Агульнае (не)лірычнае заканчэнне

Канцэрт у Дабрамыслі нам вельмі спадабаўся. Шчыра, якасна, натхнёна. Прызнаемся, не менш спадабаліся і іншыя ўстановы культуры Івацэвіцкага раёна, у якіх мы паспелі пабываць. Іншая справа, што кожная з іх мае шэраг сваіх пытанняў: пазабюджэтна-фінансавых, арганізацыйных і нават нарматыўна-метадычных. Разам з кіраўніцтвам сферы культуры раёна паспрабуем у іх разабрацца ў наступных нумарах "К".

Фота аўтараў
К

У Сапоцкіне ўпершыню адзначалі Свята пісанкі.

кірунках, аб'яднаных тэмамі роднага краю і Вялікай Айчыннай вайны.

Праводзілася творчае спаборніцтва з мэтай героіка-патрыятычнага і эстэтычнага выхавання насельніцтва, развіцця і папулярызацыі традыцый аматарскай творчасці ветэранскіх калектываў.

"Гран-пры" ўдастоены народны хор Зубаўскага сельскага дома культуры Аршанскага раёна і народны хор ветэранаў Полацкага гарадскога палаца культуры. У намінацыі "Сольныя спевы" званне лаўрэата I ступені атрымалі Валянціна Скарадуля з Оршы і Анатоль Пашчанка з Полацка, які ў мастацкай самадзейнасці з 1951 года і з'яўляецца лаўрэатам больш як 20 фестываляў і конкурсаў.

Сярод калектываў-удзельнікаў ставала юбіляраў. Сярод іх — ансамбль песні "Крыніцы" жаночага клуба "Залаты ўзрост" Мазалаўскага сельскага дома культуры Віцебскага раёна (5 гадоў), народны яўрэйскі нацыянальны вакальна-харэаграфічны ансамбль "Віцебскія дзяўчаты" Цэнтра культуры "Віцебск" (20 гадоў), народны хор чыгуначнікаў (20 гадоў), народныя клубы "Ветэран" з Талачына і Шуміліна (30 гадоў) і іншыя.

Дадзены конкурс адбыўся ў межах XIII Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў. Заключныя мерапрыемствы адбудуцца 5 — 6 мая ў Мінску. У іх возьмуць удзел і прадстаўнікі з Віцебскага рэгіёна.

Андрэй СТРУНЧАНКА,
вядучы метадыст
Віцебскага АМЦНТ

Гродзеншчына /

Пісанка ў тры метры

Амаль кожны аграгарадок Гродзенскага раёна мае сваё брэндавае мерапрыемства. 27 сакавіка яно з'явілася і ў Сапоцкіне. Упершыню тут адзначалі Свята пісанкі.

У 2003 годзе роспіс велікодных яек у гарадскім паселку быў уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь як элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Спецыяльна да свята была зроблена вялікая, каля трох метраў увышыню, пісанка, якую размясцілі на цэнтральнай плошчы каля Сапоцкінскага культурна-турыстычнага цэнтра. Яна і стала сімвалам мясцовай традыцыі.

Розныя тэхнікі аздаблення велікодных яек паказалі майстры аддзела этнаграфіі, фальклору і рамёстваў Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра.

Ганна СІМАНЕНКА,
намеснік дырэктара
Гродзенскага раённага
культурна-
інфармацыйнага цэнтра

Іўе /

Тэатр — мастацтва сінтэтычнае

Школа прафесійнага майстэрства на тэму "Тэатр — мастацтва сінтэтычнае" была арганізавана на базе Іўеўскага цэнтра культуры і вольнага часу для кіраўнікоў калектываў аматарскай творчасці.

Вядучы метадыст па асноўных жанрах аддзела народнай творчасці Святлана Лугіна распавяла пра сцэнічнае майстэрства рэжысёра і акцёра, музычнае і мастацкае афармленне спектакля, падбор рэпертуару для тэатральных калектываў.

Падчас заняткаў прайшоў майстар-клас па харэграфіі на тэму "Карагоды Панямоння. Купальскі карагод". Яго правяла кіраўнік танцавальных калектываў аддзела культурна-масавай і асветніцкай работы аграгарадка "Ліпнішкі" Настасся Грыбоўская. На практычных занятках быў развучаны купальскі карагод. Неабходна адзначыць, што прыездам у раён таленавітага харэографа Настассі Грыбоўскай пазначаны новыя тэндэнцыі ў развіцці харэаграфічнага жанру. Сёння пры аддзеле культурна-масавай і асветніцкай работы "Ліпнішак" працуюць тры дзіцячыя калектывы: "Аквамарын" (старэйшая група), "Сябрына" (сярэдні ўзрост) і "Вясёлка" (малодшая група).

Школа прафесійнага майстэрства прадэманстравала неабходнасць выкарыстання ў тэатральным жанры ўсіх відаў мастацтваў.

Лілія КІШКЕЛЬ,
загадчык аддзела
народнай творчасці
Іўеўскага цэнтра культуры
і вольнага часу

Тактыка культурнага развіцця

Праект са сваіх традыцый

Найбольш яскрава рэгіянальныя асаблівасці культуры і рамёстваў Прынямонскага краю адлюстраваны ў нематэрыяльных праявах творчасці чалавека, якія ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Для іх папулярызацыі на Гродзеншчыне запланаваны цыкл мерапрыемстваў, якія з сакавіка па чэрвень знаёмяць са звычаямі, абрадамі, рамёствамі, музычнымі і танцавальнымі традыцыямі.

Першым крокам стаў рэгіянальны кірмаш "Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня", які прайшоў 18 сакавіка ў гістарычнай частцы абласнога цэнтра. Тэматыка была прадыктавана перадсвяточнай каталіцкай "пальмавай" (вербнай) нядзеляй і галоўнымі атрыбутамі Вялікадня — вярбой, яйкамі-пісанкамі, святочнымі ўпрыгожваннямі жылля. Гэтым тром элементам прысвоены статус "гісторыка-культурная каштоўнасць". Гродзенскія вербы — не толькі святочны атрыбут. Гэта сапраўдны твор народнага мастацтва. Прамы ствол з пышнай верхавінкай сімвалізуе ўзыходжанне і адраджэнне, каляровасць — сутнасць райскіх вобразаў, а плоская форма сведчыць аб традыцыі захоўваць вярбу за абразамі. Сёння асноўнымі носьбітамі гэтага рамяства з'яўляюцца народны майстар Дамініка Кавалёнак і тры яе сястры з Гродна: Данута Альшэўская, Ванда Лапацінская, Часлава Чараднікова. Традыцыю яны перанялі ад продкаў і далучаюць да яе сваіх родных, блізкіх, знаёмых.

Шматлюдна было і на майстар-класе ў Наталлі Клімко з Навагрудка. Традыцыйная выцінанка-выбіванка ўжывалася яшчэ ў 1930 — 1950-я, калі існавала адметная тэхніка ўпрыгожвання папяровымі ўзорамі інтэр'еру жылля. Гаспадыні рабілі складаныя фіранкі на вокны, ручнікі-набожнікі, сурвэткі на Вялікдзень пад пірагі. Сёння, калі традыцыйнае рамяство на Навагрудчыне адрадзілася дзякуючы намаганням майстрыхі, афармленне офісаў, кафэ, агратурыстычных аб'ектаў у стылі "навагрудскай выцінанкі-выбіванкі" стала зноў прыкметнай з'явай.

Адметнымі сталі майстар-класы ад Ларысы Касіцкай і Алены Лашкевіч па роспісе яек. Такая традыцыя ў Сапоцкіне Гродзенскага раёна занесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей у 2014 годзе, і за такі кароткі час яна стала папулярнай, нават сярод моладзі. Традыцыйнымі малюнкамі на "сапоцкінскіх пісанках" з'яўляюцца матывы птушак (курыцы), кветкавыя выявы (рамонкі, дзьмухаўцы), дубовыя лісточкі, галінкі яліны.

На кірмашы знайшлося месца для іншых таленавітых майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Так, яйкі, дэкарыраваныя тонкімі карункамі з саломкі, аплеценыя бісерам, шклярусам, стужкамі, з аўтарскім роспісам былі прадстаўлены Марынай Ярэмчык, Аленай Чумрай, Аленай Сідзякінай. Кошыкі з лазы са святочнымі карункамі менавіта да Вялікадня прадставілі Барыс Федаровіч, Соф'я Замана, Святлана Папко, Мар'яна Радзюк. Іншыя атрыбуты свята былі прывезены з Ваўкавыска, Бераставіцы, Шчучына, Іўя.

Пісанкі з Сапоцкіна.

Урэшце, цыкл мерапрыемстваў па папулярызацыі элементаў НКС Гродзенскай вобласці ўключае не толькі кірмашы. Чакайма на святы фальклору, ткацтва, абрад Юр'я, вяселле з традыцыйнымі караваямі і многія іншыя падзеі!

Таццяна ГРЫГАРАН,
намеснік дырэктара — загадчык аддзела традыцыйнай культуры Гродзенскага АМЦНТ

■■■

Чацвер, апошні дзень сакавіка. Сонечныя промні паступова знікалі, а на другім паверсе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі падрыхтоўка да фэсту "Горад і Кнігі. Навука", наадварот, у самым зеніце: на гадзіннік арганізатары праекта ды іншыя творцы нават не паглядалі. Яшчэ на ўваходзе ў памяшканне, вылучанае ў "Нацыяналцы" пад гэтую падзею, мяне сустрэў кардонны горад. Яго ідэя нарадзілася ў вядучых бібліятэкараў БНТУ Вольгі Вовк і Вікторыі Хоміч яшчэ летась. Уласна "дыямент" галоўнай кніжніцы рэспублікі, мінскія вароты насупраць Чыгуначнага вакзала, касцёл святых Сымона і Алены… Вось такое новаўвядзенне фестывалю-2016. Яшчэ адно — зона гучных чытанняў. Напрыклад, свае творы будуць чытаць літаратары (у іх ліку — вядомая Тамара Лісіцкая).

Гэты фэст "вырас" з выставы handmade-герояў сучасных кніг "Усмешлівыя цуды" і ўпершыню парадаваў мінчан летась, засведчыўшы сваю прысутнасць у падзейнай афішы сталіцы. Сёлета фестываль мае тэматычны ўхіл і прысвечаны навуковай і навукова-папулярнай літаратуры. Карэспандэнты "К" паспрабавалі занурыцца ў падрыхтоўку мерапрыемства, іншымі словамі, у яго закуліссе, а таксама наведалі першыя гадзіны акцыі.

Вольга РОПАТ / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Пакуль леў быў у бібліятэцы…

На пляцоўках фестывалю.

За кулісамі фестывалю "Горад і Кнігі. Навука"

Вольга Вовк кажа: "Мы робім фестываль, каб здзяйсняліся мары". Выказванне адпавядае рэальнасці амаль на 100 %. Скажам, летась запланавалі зрабіць горад з кардону — і вось ён стаіць! (Дадамо, над стварэннем менавіта гэтага аб'екта працавала Юлія Кучынская і валанцёрская група.) Вольга і Вікторыя плануюць зрабіць квэст па цыклу раманаў пра авантуры Пранціша Вырвіча Людмілы Рублеўскай. Відаць, гэту задуму распрацуюць і "правераць" на публіцы ў 2017 годзе.

Пасярэдзіне залы — рэпетыцыя прадстаўлення для маленькіх дзетак. Інтэрактыўны спектакль падрыхтаваў "Тэатр42", які існуе чатыры гады і нярэдка прымае ўдзел у мерапрыемствах гарадскога маштабу — Форум вулічных тэатраў, Ноч музеяў… Гэтым разам рэжысёрам-пастаноўшчыкам праграмы стала Наталля Юшкевіч. Яна наведала ў Славеніі майстар-класы, а зараз атрыманымі ведамі дзеліцца з аднадумцамі. Дадам, моладзь, якая стварае такі інтэрактыўны спектакль — улюбёныя ў тэатральнае мастацтва людзі. І яны не навучэнцы Акадэміі мастацтваў, як спачатку можа падацца. Творцы проста любяць тое, чым займаюцца, а яны ж людзі розных прафесій. Каб рэалізавацца ва ўлюбёнай справе, неабавязкова мець адпаведную адукацыю: захопленасці, жадання, часу і аднадумцаў побач стае.

Падчас рэпетыцый "Тэатра42", "лакалізацыі" кардоннага горада і прыходаў майстроў (яны прыносілі герояў, зробленых па літаратурных творах — у асноўным з лямцу), вырашыла распытаць Вікторыю Хоміч пра сёлетні фестываль больш падрабязна. Мая візаві адразу адзначыла, што пяць тэматычных пляцовак працуюць у рэжыме нон-стоп, створана экспертная зона, а яшчэ — зона майстар-класаў.

■■■

Праглядаю праграму. Яна разнастайная: вандроўкі, інтэрактыўна-тэатралізаванае чытанне казак, інтэрактыўныя спектаклі, чытанне-гульня, навуковая шоу-праграма, воркшоп, лекцыя, майстар-класы… Асабліва зацікавіла мерапрыемства пад назвай "Навука ці магія?: гістарычныя замалёўкі паводле кнігі Людмілы Рублеўскай ад творчага калектыву "Майстэрня ўражанняў". Запыталася ў Вікторыі, ці звязана падзея з папулярызацыяй беларускай літаратуры. Арганізатар падкрэсліла: нават з папулярызацыяй сучаснай кнігі наогул, незалежна ад мовы выдання. "Ажывуць" героі са старонак твораў Вольгі Грамыка ("Космаэпапея"), Алены Масла ("Мяне завуць Лахнэска"), Алены Мальчэўскай ("Ша-ша з левага чаравіка"), Дзіны Рубінай ("Сіндром Пятрушкі"), Хэлен Сцівенс ("Леў у бібліятэцы"), Марыям Петрасян ("Дом, у якім")… Сама ж "Майстэрня ўражанняў" — не тэатральны калектыў, ягоная асноўная дзейнасць — правядзенне экскурсій, турыстычных мерапрыемстваў. А на фестывалі, відаць, пакажуць тэатралізаваную "вандроўку" ў гісторыю па матывах кнігі. "Мы хочам зрабіць больш буйны праект з "Майстэрняй…" — квэст па горадзе, а красавіцкае мерапрыемства можна лічыць "затравачкай", — дадала візаві.

■■■

Нарэшце, 1 красавіка. Нацыянальная бібліятэка вылучыла пад імпрэзу пляцоўкі на двух паверхах. На другім — асноўная святочная праграма (тыя ж майстар-класы, зона чытання ўголас). Гэта пляцоўка і сабрала найбольш наведвальнікаў. "Мы прыехалі на мерапрыемства, каб паўдзельнічаць у конкурсах. Фарміруем дома дзіцячую бібліятэку: творы класікаў і сучаснікаў, — сказала Ксенія Сакалова, якая прыйшла з сынам Яраславам. А на пытанне, ці ёсць у хатняй бібліятэцы кнігі сучасных беларускіх аўтараў, суразмоўца адказала так: "Пакуль гэта наша недапрацоўка".

Убачыла я таксама і энергічную жанчыну з дзецьмі, якая разам з імі актыўна ўдзельнічала ў конкурсах. "Летась мы таксама прымалі ўдзел у гэтым фестывалі, і адзначу: зараз праграма больш разнастайная. Мы задаволеныя, збіраемся пайсці на хімічныя вопыты", — падзялілася ўражаннямі Любоў Баброва, маці трох дзяцей.

Адзначу і тое, што не пабачыла бібліятэчных стэндаў. Па сутнасці, іх увогуле не было, акрамя пляцоўкі Нацыянальнай бібліятэкі, якая прадставіла сувенірную прадукцыю — магніты, наборы паштовак, бірулькі… На пытанне, чаму ў акцыі не прымаюць чынны ўдзел хаця б гарадскія бібліятэкі, Вольга Вовк адказала: "Яны ўдзельнічаюць у фестывалі — робяць івэнты, задзейнічаны як арганізатары. Стэнды ж вырашылі не ставіць: яны не такія яскравыя, як стэнды тых жа літаратурных праектаў". Урэшце, як на маю думку, гэта зусім не нагода. Балазе праект агулам накіраваны на папулярызацыю літаратуры, чытання і уласна бібліятэк. Затое парадавалі кошты на дзіцячыя кніжкі ў айчынным выдавецтве "Пачатковая школа". Кансультант на стэндзе апошняга адзначыла: "Самая дарагая кніга для дзяцей з ліку прадстаўленых тут каштуе прыкладна 60 тысяч рублёў".

■■■

Сёння фэст завяршаецца. У планах жа вядучых бібліятэкараў БНТУ, як сведчаць артыкулы калег, — стварэнне інтэрактыўнай карты "Бібліякропкі, або 100 звестак пра бібліятэкі, якія вам невядомыя". Мэта — распавесці пра невядомыя шырокай грамадзе паслугі бібліятэк. Але "Бібліякропкі…" пакуль знаходзяцца ў няскончаным выглядзе: шмат тэхнічных пытанняў трэба вырашыць для іх рэалізацыі. Урэшце, Вольга, Вікторыя і іх калегі спадзяюцца, што ў хуткім часе праект ажыццявіцца.

К

Дар'я Жук падчас працы на здымачных пляцоўках.

ЗША

У адзін з нядаўніх уік-эндаў культурнае жыццё Брэста ўзбагаціла праграма фільмаў-прызёраў Нацыянальнага конкурсу Мінскага міжнароднага фестывалю "Лістапад-2015". Была паказана і кароткаметражная стужка "Сапраўдная амерыканка", уганараваная на форуме дыпломам журы. Цікава, што знята карціна ў Злучаных Штатах на англійскай мове, але яе аўтар, Дар'я Жук, — мінчанка, хоць жыве ў ЗША ўжо два дзесяцігоддзі. "К" распытала рэжысёра пра шлях у кіно і пра тое, чаго можа дасягнуць моцная асоба ў творчасці.

Антон СІДАРЭНКА

Сапраўдная беларуска

— Я паехала ў Штаты павучыцца на год у 11-м класе. З'язджаць з Беларусі надоўга не збіралася, але неяк год за годам паездкі ператварыліся ў доўгае падарожжа ў палову жыцця. У нашай мінскай спецшколе былі вельмі папулярныя праграмы па абмене, бралі лепшых. Паколькі некалькі дзяўчат-выдатніц з нашай паралелі ўжо з'ездзілі ў Штаты, мы прыкладна ведалі, чаго чакаць. Я ж тады хацела паступаць у Маскву, на эканамічнае, але мяне напалохалі знаёмыя: Масква — гэта дорага, і нават медалістам 20 тысяч долараў спатрэбіцца "на экзамены". А ў амерыканскай сярэдняй школе мне тым часам параілі маленькі прыватны жаночы каледж — і я хутка туды паступіла на поўную стыпендыю. Вядома, ніхто не папярэдзіў, што гэты каледж у маленькім, на 8 тысяч жыхароў, ізаляваным мястэчку "рэлігійнага пояса" ЗША на Сярэднім Захадзе (там па царкве на кожныя 300 чалавек насельніцтва), дзе мучацца 300 дзяўчат. Ніхто не папярэдзіў, што я буду штодня а 7-й уставаць на працу ў студэнцкую кухню і ад стрэсу з'ядаць пару плітак шакаладу. Нібы службу ў войску перажыла! Але потым пайшоў уздым. Я працавала, вучылася дзень і ноч (там не было чым заняцца), выйграла пару алімпіяд. Мяне ўзялі ў Гарвард, таксама са стыпендыяй. Там я і трапіла выпадкова на першы занятак па кіно, хоць і працягвала вучыцца на эканамічным. Мяне проста выратавала амерыканская сістэма "Liberal Arts", дзе паралельна з галоўнай спецыялізацыяй на выбар можна займацца хоць электроннай музыкай! Я бясконца ўдзячная прафесару, які зацікавіўся мной і прыняў на свой курс літаральна пасля 15-хвіліннага сумоўя. Аддавалі ж перавагу, у асноўным, тым студэнтам, якія ўжо спецыялізаваліся на мастацтве.

— Наколькі ўспрыманне Амерыкі змянілася за гэтыя гады?

— Гэта залежыць ад таго, дзе ты знаходзішся: у штаце Місуры ці ў элітным каледжы ў Бостане. Не толькі Нью-Ёрк, але і ўся Амерыка — краіна кантрастаў. Калі я ў 18 гадоў праехала на аўтобусе праз паўкраіны да сяброўкі ў Нью-Ёрк, зразумела: Сярэдні Захад — не маё месца! Калі ж пасля ўніверсітэта ўрэшце пераехала ў самы прыстойны горад краіны, мне здавалася, што тут усе ўвесь час працуюць — пратэстанцкія каштоўнасці даюцца ў знакі. У мяне ніколі не было столькі дзён адпачынку, колькі ў маіх сяброў у Беларусі, а калі ён і пачынаўся, было нават няёмка яго выкарыстоўваць. Але калі прасоўваешся па службе, пачынаеш працаваць па ўласным раскладзе, з'яўляецца больш свабоды. Тут прынята іншае, чым у нас, стаўленне да справы: пайшоў і зрабіў, разгайдаўшыся ўмомант. Заўтра — значыць, заўтра! Тут заахвочваецца і здольнасць марыць. Можна прачнуцца раніцай, вырашыць, што цяпер ты будзеш мадэльерам, і цябе падтрымаюць і накіруюць. Гэтая індывідуалістычная вера ў тое, што ўсё магчыма, дапамагае жыць.

— Чым ты займалася да таго, як ісці ў кіно, і чаму ўсё ж такі туды пайшла? Пагадзіся, ёсць шмат не менш паважаных сфер з годнай аплатай...

— Я, вядома, пайшла больш складаным шляхам і ўклала 5 гадоў вучобы менавіта ў рэжысуру, калі стала атрымліваць другую адукацыю. Да гэтага гадоў пяць спрабавала ўцячы ад сябе, выжывала ў чужой краіне: якое там мастацтва! Прадзюсавала і займалася дыстрыбуцыяй, фінансамі, але гэта рабіла з мяне невыноснага няшчаснага чалавека. Я так не любіла сваю працу, што нават хавала ад сяброў, што працавала на тэлеканале "HBO", хоць гэта было вельмі прэстыжна. Мне здавалася, што ёсць нейкая таямніца быцця, якую я не спасцігла, таму і не магла рухацца далей. Але, як у нас у школе казалі, калі ты можаш не займацца мастацтвам, значыць, табе ім займацца не трэба. Я сумленна паспрабавала ўсе варыянты і зразумела: без кіно не магу. Сваю першую іграву кароткаметражку я зняла ў 20 гадоў у Гарвардзе і з таго часу ўлюблёная ў кіно.

— Распавядзі пра сваю кінашколу, пра навучальны працэс у ёй?

— Гэта школа мастацтваў Калумбійскага ўніверсітэта. Я вельмі хацела дакапацца да сутнасці: чаму і як аўдыторыя глядзіць кіно, што робіць фільм добрым. Мае выкладчыкі зрабілі з мяне рэжысёра, які спакойна і ўгэўнена працуе. Калі я магла зрабіць раскадроўку сцэны і да школы, але пры гэтым пачувалася пакутліва, дык зараз бачу яшчэ пяць яе варыянтаў, і пры гэтым мне відавочна, якія з іх больш прыдатныя для пэўнай гісторыі. Пакуль сама поўнаметражны сцэнар не напішаш, не зразумееш, які балючы працэс ператварэння сярэдняга сцэнарыя ў добры. А школа якраз робіць упор на сцэнарны складнік — сцэнарысты-рэжысёры і становяцца паспяховымі выпускнікамі. Калі я пачынала ва ўніверсітэце, у мяне была ідэя для поўнаметражнага сцэнарыя, зараз жа я магу генераваць ідэі кожны дзень. І хочацца пачынаць працаваць над яшчэ адной гісторыяй! Нават даводзіцца спыняць сябе, бо добры сцэнарый ствараецца не ў момант.

— Колькі словаў пра фільм "Сапраўдная амерыканка"...

— У дыпломнай працы хацелася распавесці пра тое, што набалела, але з гумарам. Я пачала з моцнай эмоцыі, якую перажыла па прыездзе ў Штаты. Гэта было адчуванне гадкага качаняці, таго, што грамадства цябе не прымае, але ты хочаш стаць яго часткай, знайсці паразуменне. Я прыдумала сітуацыю, якая, вядома, са мной не адбывалася. Бо кіно — гэта "праўда, якая прыводзіць у захапленне", як кажа рэжысёр Вернар Херцаг. Мая гераіня паўстае супраць таго, што адбываецца, а я ў жыцці не такая смелая. Яе чын не вырашае праблем — так першапачаткова і заканчваўся фільм, але я перарабіла фінал па патрабаванні ўлюбёнага прафесара. Зараз шкадую, але ў фармаце кароткага метра даводзіцца хутка даносіць думку да гледача. Атрымаўся трохі нахабны фільм, але вельмі асабісты, што ўжо няблага. У Мінску на "Лістападзе" ён спадабаўся, узнагародзілі дыпломам, і ў Нью-Ёрку спадабаўся, таксама адзначылі на фестывалі. Працягваю яго па свеце паказваць: і ў Брэсце, і ў Ганконгу, і ў Атланце гэтай вясной адзначаюся.

— Што ці каго ты лічыш арыенцірамі ў кіно?

— Стараюся не арыентавацца на пэўных асоб, але калі на іх пераходзіць, то я вучуся на працах рэжысёраў, якія нават у Галівудзе робяць аўтарскае кіно — мэйнстрым-артхаўс: браты Коэны, Аляксандр Пэйн, Вэс Андэрсан, Сафія Копала, Уіт Сцілман, Джэф Нікалс, Пол Томас Андэрсан, Ліна Данхэм, Мэры Харрон (працавала нават на яе трохі), Ліза Халадзенка (вучылася ў нашай школе), ды ўсіх нават не пералічыць! Натхняюся кар'ерай Кэтрын Бігелоў, першай жанчыны-рэжысёра, якая атрымала "Оскар" за лепшы фільм.

— Свой поўнаметражны дэбют "Крышталь" ты ў любым выпадку плануеш здымаць у Беларусі? Чаму?

— Мяне як мастака цягне дадому, у родны край, на нашы пагоркі і палі. Мы з маім сааўтарам ужо пяць гадоў працуем над сцэнарыем, і я зразумела, што тэкст мяне працягвае трымаць. Адпаведна, трэба здымаць. Мне здаецца, наша маладое пакаленне не бачыць сябе з боку. Хочацца ж на сваё роднае часам глядзець у кінатэатры, а не толькі на галівудскія казкі. У нас столькі недаследаваных тэм, якія хочацца ўзняць, і адначасова велізарная міжнародная цікавасць да Беларусі. У мяне ёсць мексіканскі прадзюсар, які гатовы хоць заўтра паехаць у Мінск і дапамагаць. Да гэтага часу здзіўляюся, чаму ж яму так шчыра цікава. А дзеянне "Крышталя" адбываецца ў 1990-я: я вырашыла напісаць пра час, які добра адчула. Мая гераіня спрабуе ўцячы ад сябе і з'ехаць у Штаты, як многія мае сябры тады, але ў яе не атрымліваецца, і лёс прымушае сутыкнуцца з праблемамі твар у твар.

— Якой ты бачыш сябе праз некалькі гадоў?

— Калі бацькі тэлефануюць, часам жартам пытаюцца, ну што, калі ўжо атрымаеш "Оскар"? Кіно — гэта не спорт, дзе ты дабег марафон і табе ўручылі медаль. Кіно — гэта працэс, якім хочацца займацца ўвесь час. Я мару быць у гэтым працэсе доўга, не губляць рэлевантнасці і пладавітасці, працаваць шмат і здымаць часта. Хачу паказаць, і не раз, сваё кіно ў Канах. Хачу папрацаваць і над вялікімі студыйнымі праектамі таксама. Маю аднакласніцу, напрыклад, пасля яе аўтарскага дэбюту зараз запрасілі экранізаваць "Русалачку" для кампаніі "Юніверсал". Калі больш канкрэтна, то праз пару гадоў я хацела б у дадатак да "Крышталя" зрабіць яшчэ некалькі аўтарскіх стужак, адну-дзве на англійскай, атрымаць прэм'еру на кінафестывалі "Сандэнс" і выдатнага галівудскага агента.

К

"К" інфармуе

Акцёрскі баль у коласаўцаў

Артысты-коласаўцы вырашылі адметна адзначыць сваё свята — Міжнародны дзень тэатра, запрасіўшы гледачоў на акцёрскі баль "У віхуры ілюзій".

Падчас акцёрскага балю ў коласаўцаў.

У яго нумарах можна было пазнаць сцэны са спектакляў, якія выйшлі з рэпертуару тэатра, але засталіся ў нашых сэрцах: "Чума на вашыя дзве сям'і", "Ладдзя роспачы", "Сымон-музыка", "Жаніцьба", "Мудрацы…", "Ветрагоны". А паяднаў прадстаўленне агульнай ідэяй, стаў свайго кшталту сцэнарным і рэжысёрскім ходам дзеі знакаміты выраз Канстанціна Станіслаўскага "А што было б, калі…"

Да прыкладу, што было б, калі героі з "Рамэа і Джульеты" ажылі ў інтэрпрэтацыі Рыгора Горына? Да "працягу" шэкспіраўскай трагедыі ў спектаклі "Чума на вашы дзве сям'і!" тэатр звяртаўся 16 гадоў таму. І вядомая песня пра карнавал, што гучала ў ім, стала лейтматывам акцёрскага балю. Ці што было б, калі мужчынская палова трупы раптам… запісалася ў жаўнеры? Артысты спрабавалі ўявіць такое дапушчэнне ў касцюмах, а значыць, і ў вобразах улюбёных герояў. Ці вось яшчэ. Што было б, каб у тэатр вярнулася прызабытая прафесія суфлёра. Гэта стала нагодай прыгадаць даўнюю пастаноўку "Жаніцьбы" і стварыць цудоўную сцэнічную рэпрызу з удзелам не толькі вядучага майстра сцэны Георгія Лойкі, што некалі іграў гогалеўскага Падкалесіна, але і маладых акцёраў Уладзіслава Жураўлёва (які паспрабаваў сябе ў новай прафесіі) і Арцёма Герака (ён "прымерыў" вобраз Сцяпана).

А яшчэ артысты-коласаўцы цягам святочнай імпрэзы паўдзельнічалі ў спеўным конкурсе, у асобных нумарах здолелі па-добраму пакпіць з саміх сябе ды некаторых варункаў нашага жыцця. Пэўна, у некаторых гледачоў слёзы наварочваліся на вочы, калі Валерый Анісенка (не толькі мастацкі кіраўнік тэатра, але і выдатны артыст, чытальнік) выканаў знакаміты "Маналог Арлекіна" Эдуардаса Межалайціса. А паралельна дэманстраваліся архіўныя здымкі знакамітых пастановак, і гледачы маглі ўзгадаць волатаў коласаўскай сцэны — Аляксандра Ільінскага, Анатоля Шэлега, Паўла Малчанава, Анатоля Труса, Галіну Маркіну і многіх іншых.

Юрый ІВАНОЎСКІ,
літаратурны рэдактар
Нацыянальнага
акадэмічнага тэатра
імя Якуба Коласа
Фота Наталлі ЯРМОЛАВАЙ

Рэдакцыя плюс…

Ювелір, які…

(Заканчэнне. Пачатак на старонках 8 — 9.)

— А ці можна прыдбаць вашы работы з выставы?

— Калі ласка. Але не з гэтай. Іх я прадаваць не збіраюся. Хочацца хоць нейкую калекцыю стварыць. Я падарыў Нацыянальнаму мастацкаму музею недзе год таму 85 работ. Там нават выстава была. Ёсць такая практыка. Вось, маўляў, паглядзіце мае каталогі, хачу падарыць, скажам, Траццякоўцы. І будзе работа ў каталозе гэтай галерэі. Многія мастакі так робяць.

— Як мяркуеце, ці ёсць у вашым характары нешта палескае?

— Не думаў пра гэта. Я нарадзіўся ў вёсцы побач з Драгічынам. Бацька памёр у сорак два гады. Мама пражыла 85 гадоў, і настолькі была працавітай: увесь час сядзела ў сваіх градах, працавала толькі для дзетак. Па-сялянску цягавітая жанчына. Такіх, мабыць, ужо і няма. Іншыя людзі зараз. Штосьці ад маці я ўзяў, вядома. Я на яе яшчэ і падобны, а дзве сястры больш у бацьку пайшлі.

— Што прывяло ў мастацтва? Можа, сямейныя традыцыі?

— Не. Мастакоў у сям'і не было. Хіба што маці вышывала, рукадзельнічала, а дзед быў кавалём адметным: на ўсе рукі майстар. Скажам, студні капаў. Унікальны быў дзядзька, і на такіх рукастых мужыках трымалася ўся округа! Ён і народ лекаваў, бо кнігі лячэбныя ў яго былі. Ад дзеда засталіся ў мяне каваныя кружкі. Што яшчэ пра сям'ю? Памятаю, што ў 1961-м, калі мне было дзесяць гадоў, па вясне сям'ёй паехалі ў Мілераўскі раён Растоўскай вобласці, куды нас паклікаў бацька, які там атабарыўся, працу знайшоў. Ён пагрузіў нас у самы звычайны вагон цягніка, трое сутак у дарозе… Побач станіца Вешанская з бурлівымі патопамі на дарозе. Думаю, куды нас прывезлі: нейкі хутар, мазанка, гліняная падлога, якую мама потым заўжды націрала кізякамі… Памятаю дакладна, што марыў вярнуцца дахаты. Столькі я перажываў аб Беларусі як аб родным кутку, хоць, шчыра кажучы, нічога пра яе не ведаў.

А ў мастацкае вучылішча паступаць надумаў, як зноў у Беларусі апынуўся. З першага разу не атрымалася, было яшчэ некалькі спробаў перад тым, як туды патрапіў. На іспытах — двойкі! (Нават верш вучыў "Скажи-ка, дядя…" — не дапамагло!) Дарэчы, даведаўся нядаўна, што і Уладзімір Цэслер не з першага разу ў інстытут трапіў. Дык у яго хоць дзесяць класаў было, а ў мяне — толькі вячэрняя школа. Я быў неканкурэнтаздольны, скажам так. Нават выяўленчай студыі не скончыў, а ў Растоўскай вобласці хіба лазіў па садах і хуліганіў… Таму адкуль усё гэта ўзялося? Не ведаю нават. Нешта ў душы было, і мне гэта падабалася. Я не назаву таго водапаздзела, калі адчуў, што мастацтва — мой адзіна магчымы шлях. Можа, і генетычны пачатак — ад маці, ад дзеда…

— Мо малявалі ў дзяцінстве?

— Зразумела! У школе насцен-газету рабіў. Праўда, калі на флоце служыў, атрымліваў за гэта па галаве, бо народ чысціў катлы, а я мог карты сакрэтныя перамалёўваць і гарбату піць. З салёнай чырвонай рыбай, як цяпер памятаю. Па яе спецыяльна маракоў выпраўлялі. Бо салодкая гарбата з салёнай рыбай, паверце, вельмі смачна.

Пытанні задавалі Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Кастусь АНТАНОВІЧ, Пётра ВАСІЛЕЎСКІ, Барыс КРЭПАК, Настасся ПАНКРАТАВА, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Сэлфі: творца пра твор

Фотапластыка Валерыя Вядрэнкі.

Назва выставы "Паклон Гаўдзі", што нядаўна адкрылася ў Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва (пляцоўка на праспекце Незалежнасці), — знак павагі Валерыя Вядрэнкі да вялікага каталонскага дойліда. Але за назвай — адметная і постаць аўтара дакументальных фатаграфій і фотапластычных кампазіцый, які падчас вандроўкі па Барселоне ў 2011 годзе "прапусціў" праз сябе вобразную архітэктуру.

Золата і вохра свету Гаўдзі

Як журналіст "К" называла фотатворы

Вольга РОПАТ

Наслаенне сэнсаў на фотапластычных кампазіцыях (здымках архітэктуры Гаўдзі і ідэй, асацыяцый Валерыя Вядрэнкі) нараджае новы аб'ект, як у плане тэхнікі, так і адносна тэмы. У работах — не проста перасячэнні "цела" будынкаў каталонца ў стылі мадэрн і выгінаў жаночага цела, а іх яднанне. Валерый гуляе з матэрыяльным, выкарыстоўваючы ўлюбёныя ім аптычныя накладанні, і залаціста-вохрыстыя кампазіцыі выбухаюць энергіяй, нібыта вулкан лавай. (Мо праз тое яны падаюцца эмацыйна нават перанасычанымі?) Што да дакументальных таніраваных здымкаў, то на іх — агульны план сабора Святога Сямейства аўтарства Гаўдзі ў працэсе пабудовы і асобныя дэталі бадай самага знакамітага даўгабуду свету. Выразнасць выявам надаюць святлоценевыя эфекты, кантрасты, танальнасці, якія падкрэсліваюць выгіны архітэктуры.

Некаторыя працы відавочна патрабуюць разгадкі ці пэўнага тлумачэння. Дык дамо слова аўтару!

Варыянты

— Да гэтай выставы, — кажа Валерый Вядрэнка, — былі падрыхтаваны некалькі варыянтаў, якія я з часам "разбураў". Але з адной з тых "рабочых" версій, паказаных публіцы ў 2012-м, і "вырас" цяперашні "Паклон Гаўдзі". Упэўнены, работ не існуе, пакуль не раздрукуеш файлы на паперы і не ўбачыш вынік. Тады і зразумееш: "патрапіў" — "не патрапіў". Для мяне было вельмі істотна, як яны "дыхаюць", як выглядаюць у вялікім фармаце. Таму адну са спроб выканаў у памеры дзесьці метр на паўтара (прадстаўленае раней — у меншых за гэты фарматах) і паказаў яго ў… лесе падчас фестывалю "Вялікая бард-рыбалка" ў Быхаўскім раёне. Акурат пасля павелічэння памераў пабачыў, колькі застаецца пустой прасторы. Работы нагадвалі плакаты, страцілі ў адпаведнай энергетыцы.

Ідэя

— Адна з прычын узнікнення серыі: тое, што я ўбачыў, і тое, што думаў пра Гаўдзі, — розныя рэчы. З ягонай творчасцю быў знаёмы па альбомах і кніжках… Аднак непасрэднае ўздзеянне архітэктуры Антоніа Гаўдзі было надзвычай моцным. І першае — шок ад таго, якога маштабу можа быць мастак. Гаўдзі ж стварыў цэлы свет! Да ўсяго, яму пашанцавала: знайшоўся фундатар для яго ідэй.

Тэрмін

— Тэрмін "фотапластыка" (як адну з форм фатаграфіі) я прыдумаў для сваіх работ (балазе іх ніяк не назавеш фатаграфіямі, а назва патрабавалася). Але, аказалася, яго вызначыў яшчэ ў пачатку XX стагоддзя тэарэтык фотамастацтва з Венгрыі Ласла Мохай-Надзь. Я спрабаваў знайсці работы эксперыментатара ў гэтым кірунку, і нічога ў Сеціве не адшукаў. Таму дапускаю, што Мохай-Надзь толькі тэарэтычна абгрунтаваў панятак.

Колер

— Залаціста-вохрыстыя фотапластычныя кампазіцыі першапачаткова былі… земляністага колеру, то бок драматычныя, крыху "ўцяжараныя". І калі прадставіў выставу, зразумеў: перабор. Тым больш гэта ўжо не будзе адпавядаць тым адчуванням, якія я атрымаў ад Гаўдзі.

Тэхналогія

— Лічбавая тэхналогія настолькі гнуткая, няўлоўная, што ўвесь час трымае "на кручку". Не можаш "паставіць" кропку, заўсёды хочацца перарабіць, змяніць… Таму стаўлю шматкроп'е.

■■■

Работы рыхтаваліся Валерыем адмыслова для гэтага памяшкання (у серыі іх 100, але прадстаўлена 65). Выстава для творцы мае і музычнае гучанне, паколькі адзін твор плаўна "пераходзіць" у іншы. І выцягнуць адну рэч з "музычнага шэрагу", на думку фотамастака, немагчыма. Нейкая нітачка абавязкова абарвецца, штосьці акажацца незразумелым. Таму мне давялося на свой густ выбіраць творы, якія праілюстравалі публікацыю. Назваў работам Вядрэнка не даваў, але пагадзіўся, каб аўтар гэтых радкоў праз уласныя фантазіі ды асацыяцыі прыдумала іх. Такім чынам, усё пачалося з "Нараджэння". У рамках выставы акрэсліваецца нават невялікая серыя здымкаў: яшчэ я пабачыла "Станаўленне" і "Смерць". Калі чакала майстра, назірала, як ставіцца да гэтай трыяды работ сямейная пара. І калі жанчына пачала разглядаць адну з іх, адразу сказала: "Дык гэта ж нейкая разруха!" А для мяне — наадварот, нараджэнне будынка, "цялеснага", матэрыяльнага. Сам Валерый Вядрэнка адзначыў, што там адлюстравана будаўніцтва сабора.

Перайшлі да работы, якой дала назву "Скамянелая мелодыя". Валерый змясціў выяву жанчыны, якая грае на музычным інструменце, не ў цэнтры твора. Такое кампазіцыйнае рашэнне надае рабоце рух, энергію, моц. І толькі калі прыгледзецца, пабачыш фігуру жанчыны. Але гэты твор успрымаецца па-рознаму. Я на ім угледзела профіль з цёмным вокам. І гульня з асацыяцыямі Валерыю падабаецца, бо знаходзяцца новыя сэнсы. Сам жа майстар дадаў: гаворка вядзецца пра магчымасці чалавека. Гаўдзі — звычайны чалавек, але што ён стварыў? Вось таму сам Вядрэнка разглядае цела на гэтай працы як сховішча духоўнай энергіі.

Гістарыёграф

Мураванка на беразе Дзятлаўкі

На беразе ракі Дзятлаўка, перад возерам, стаіць мураваны палац былога маёнтка Радзівілаў. Ён уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны краіны. Гістарычная і архітэктурна-мастацкая каштоўнасць помніка мае агульнанацыянальную значнасць.

Сучасны выгляд палаца.

З малюнка Напалеона Орды 1861 — 1877 гг.

Першапачаткова ў 1508 годзе на гэтым месцы Канстанцінам Астрожскім была пабудавана драўляная земляная крэпасць. Аднак падчас Паўночнай вайны яна была разбурана. Тады ў замку знаходзілася штаб-кватэра Пятра I. Пасля Паўночнай вайны і да 90-х гадоў XVIII стагоддзя Рэч Паспалітая не ўдзельнічала ў войнах, што садзейнічала аднаўленню і развіццю гаспадаркі. На месцы драўлянай крэпасці па фундацыі Дамініка і Мікалая Фаустына Радзівілаў у 1751 годзе архітэктарам Фантана быў пабудаваны новы каменны палац-рэзідэнцыя.

Сядзібны комплекс уключаў палац, гаспадарчыя пабудовы, парк. Палац — двухпавярховы прамавугольны будынак на высокім цокалі. Спачатку быў завершаны высокім вальмавым дахам і фланкіраваны па баках трох'яруснымі вежамі з шатровымі элементамі. Планіроўка тут — традыцыйна анфіладная. Цэнтральнае месца займала двухмаршавая лесвіца, якая вяла да параднай залы. Пад будынкам размяшчаліся падвалы, перакрытыя цыліндрычным скляпеннем, і кацельня, якая ацяпляла праз унутрысценныя дымаходы.

На франтоне галоўнага фасада зберагліся арнаментальна-геральдычная пластыка: ляпны гербавы картуш князёў Радзівілаў, партрэтныя барэльефныя медальёны, звівы лісця, гірлянд, драпіровак. Па перыметры будынак аперазаны міжпавярховым і завершаным карнізамі. Яшчэ ў пасляваенны час у нішах знаходзіліся скульптуры. Знешні выгляд палаца значна сказіўся стварэннем сучасных прамавугольных вокнаў. Раней яны мелі арачную форму, сляды якой яшчэ можна заўважыць на будынку. Вуглы будынка ўмацаваны контрфорсамі — своеасаблівымі рудзіментамі замкавай архітэктуры. А напрыканцы XVIII стагоддзя вакол палаца быў створаны парк у англійскім стылі, які ўпрыгожвалі масты, павільёны, альтанкі.

Пасля ўдзелу апошняга ўладальніка Дзятлава Адама Солтана ў паўстанні 1831 года палац перайшоў у дзяржаўную ўласнасць. Спачатку быў прыстасаваны пад шпіталь, потым пад кавалерыйскую казарму. На пачатку XX стагоддзя ў палацы размяшчалася двухкласная школа, у 30-я гады XX стагоддзя — сіроцкі дом для дзяўчынак. У пасляваенны перыяд і да апошняга часу будынак быў прыстасаваны пад медыцынскую ўстанову. Сёння будынак палаца не эксплуатуецца.

Дзінара ХАРОШКА, дырэктар Дзятлаўскага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея

Прывітаўшы мяне ў сваёй мінскай кватэрцы, архівіст Андрэй Скуратовіч адразу дзеліцца апошняй знаходкай. Па сутнасці, гэта новы, нікому не вядомы і зусім нечаканы твор знакамітага скульптара Аляксея Глебава. Як выявілася, народны мастак БССР, які адышоў у лепшы свет без малога паўстагоддзя таму, здолеў — свядома ці не — прадвызначыць важны трэнд ужо нашага часу: адлюстраванне паўсядзённасці. Героі яго фотасерыі — мінчане. Так, проста мінчане. Менавіта такія, якімі яны былі ў пачатку 60-х, прычым у тыя моманты, калі нават і не здагадваліся, што іх фатаграфуюць.

Людзі з камерамі

Ілья СВІРЫН

"Шпіёнскія здымкі" Мінска

— Я знайшоў старыя бацькавы стужкі, аднёс негатывы Андрэю, той іх алічбаваў, і менавіта такім чынам гэтыя фота "выйшлі на святло", — распавёў сын скульптара Аляксандр Аляксеевіч. — Напэўна, раней іх увогуле ніхто не бачыў. Бацька здымаў выключна "для сябе", яму проста было цікава фіксаваць на стужку сваіх сучаснікаў.

Здымкі "звычайных савецкіх грамадзянаў" прафесійныя фатографы рабілі тысячамі, але… нават лішне казаць, што большасць гэтых кадраў у той ці іншай меры з'яўляюцца пастановачнымі. Тут жа — фіксацыя рэчаіснасці без ўсялякага ідэйнага ўмяшальніцтва аўтара.

— Бацька называў гэтыя здымкі "шпіёнскімі", — апавядае сын скульптара. — У яго быў тэлеаб'ектыў, і ён мог фатаграфаваць покрадкам, незаўважна для сваіх герояў. Гэта дазваляла ўнікнуць лішніх пытанняў: хто здымае, навошта, куды? Савецкія людзі ставіліся да чалавека з камерай даволі насцярожана.

Непрычасаныя эмоцыі, непараднае адзенне, нелакіраваны побыт… Прыкладам, сучаснікі могуць са здзіўленнем даведацца, што недзе ў дварах пафаснага праспекта тоілася калонка з вадой, дзе маладзіцы пралі свае рэчы. Месца дзеяння многіх здымкаў лёгка пазнаецца: ваколіцы Плошчы Перамогі. Гэта ўдвая больш цікава, калі ўлічыць, што да стварэння яе аблічча непасрэдна спрычыніўся сам Глебаў — суаўтар знакамітага манумента.

— Аляксей Канстанцінавіч рабіў гэтыя фота з вакна сваёй кватэры, — тлумачыць Андрэй Скуратовіч. — Відавочна, яму вельмі важна было дасягнуць поўнай натуральнасці паставаў і мімікі мінчан. А навошта? Магчыма, хацелася сёе-тое падгледзець для сваіх твораў.

Але гэта, вядома, толькі здагадкі. Галоўнае, што самі негатывы захаваліся і прычакалі свой час. Без сумневу, для гісторыкаў беларускай фатаграфіі гэта знаходка стане сапраўднай сенсацыяй. Зрэшты, такі лёс можа напаткаць і многія іншыя экспанаты незвычайнай калекцыі Андрэя Скуратовіча, што захоўваецца на хард-дыску звычайнага камп'ютара.

Балерыны на суботніку

Ужо ў шасцідзясятыя "Зеніты" і "ФЭДы" былі ледзь не ў кожным доме, а найбольш заможныя і апантаныя маглі нават выкласці пару соцень рублёў за аматарскую кінакамеру з васьмімілімітровай стужкай. Вось і ў сям'і яшчэ аднаго легендарнага Глебава — Яўгена Аляксандравіча — стаў з'яўляцца свой візуальны архіў. Сын кампазітара Радзівон у падлеткавым веку захапіўся кінааматарствам.



Здымкі з акна, якія рабіў знакаміты скульптар Аляксей Глебаў.

Калекцыянер савецкай паўсядзённасці

Зразумела ж, здымаў ён пераважна "тое, што бачыў": бацькоў, сваякоў, а таксама гасцей.

Што заканамерна, кола сяброў кампазітара складала пераважна тагачасная творчая інтэлігенцыя. У прыватнасці, Васіль Быкаў. Класік зафіксаваны на стужцы ў цалкам неафіцыйнай абстаноўцы — з кілішкам у руцэ падчас удумлівай сяброўскай бяседы.

— Гэта ўнікальныя кадры, — перакананы Андрэй Скуратовіч. — Быкаў ніколі не быў чалавекам багемным, ён вёў даволі замкнёны лад жыцця. Ды і здымацца не надта любіў. Але калі яго фільмаваў на маленькую камеру нейкі падлетак, пісьменнік на гэта проста не звяртаў увагі ды пачуваўся зусім натуральна. А вось знайсці хаця б пару секундаў "нефармальнага" Караткевіча мне пакуль не ўдалося, нягледзячы на ўпартыя пошукі. Як вядома, Уладзімір Сямёнавіч таксама не любіў ні пазіравання, ні пазёрства.

Затое на старых бабінах адшукалася нямала іншых цікавых фрагментаў. Напрыклад, "купалаўцы" па-за сцэнай (здымаў іх, між іншым, тагачасны малады акцёр тэатра Генадзь Давыдзька) альбо артысты Опернага на суботніку…

Пра тое, якія знаходкі пыляцца дзесь "на гарышчах", ніхто і не здагадваецца. Зазвычай, пра змест "бацькоўскіх стужак" не ведаюць нават іх цяперашнія ўласнікі. Ды і як тут даведаешся, калі апаратура для іх прагляду стала сапраўднай экзотыкай? Аптымальнае выйсце з гэтай сітуацыі — перавесці матэрыял у звыклы для цяперашняга часу лічбавы фармат. Але ёсць адна праблема: нехта павінен гэтым заняцца. На шчасце, чалавек знайшоўся.

— Мне ўдалося істотна збіць мінскую цану на алічбоўку 8-міліметровай стужкі, — пахваляецца Андрэй Скуратовіч. — Калі фірмам сталі прапаноўвацца заказы на дзясяткі гадзін, тыя былі проста агаломшаныя.

Зразумела ж, далёка не ўвесь гэты матэрыял мае вялікую каштоўнасць. Выкалупванне сапраўдных перлінак са шматгадзіннага масіву прыватных архіваў — яшчэ адна важная справа, якой таксама займаецца калекцыянер. Зрэшты, нават сямейныя здымкі могуць уяўляць не абы-якую цікавасць. Бо апрача твораў "родных і блізкіх" недзе на ўскрайку кадра адлюстроўваўся таксама і своеасаблівы "фон эпохі".

— Прыкладам, дзякуючы аматарскай кінахроніцы можна літаральна па гадах прасачыць эвалюцыю жаночых фрызураў, — тлумачыць Андрэй Скуратовіч. — Не кажучы ўжо пра паступовую змену аблічча Мінска…

Гісторыкі адшукаюць тут нямала карыснай інфармацыі. Але самае важнае, бадай, тое, што гэтыя матэрыялы дазваляюць нам занурыцца ў рэальную атмасферу свайго часу. А па меры нашага ад яго аддалення ён усё болей міфалагізуецца ды сплюшчваецца да двух банальных набораў стэрэатыпаў: ад ідэалізацыі да поўнага адпрэчвання.

Яшчэ адзін цар

Незвычайнае хобі з'явілася ў Андрэя Скуратовіча бадай выпадкова. Гадоў дзесяць таму ён стаў шукаць кінаархівы, звязаныя з мінскімі бардамі, а далей… пайшло-паехала. Урэшце, уладальнікі "рэтра-стужак" сталі самі выходзіць на калекцыянера, бо менавіта ён ведае, што з гэтым матэрыялам можна рабіць.

Менавіта такім чынам да яго патрапіла бабіна, што пылілася ў адной з шафаў колішняга Інстытута этнаграфіі і фальклору. Артэфакт быў настолькі даўні, што нават інстытуцкія старажылы ўжо не памяталі, адкуль ён узяўся і што на гэтай стужцы ўвогуле можа быць.

Вынік "ускрыцця" пераўзыйшоў усе чаканні: у культурны ўжытак удалося вярнуць фільм 1962 года, дзе адлюстравана пастаноўка народнага спектакля "Цар Максімільян" — аднаго з "блізкіх сваякоў" знакамітых цяпер "Калядных Цароў". Дзякуючы адшуканай дакументацыі, энтузіясты са Студэнцкага этнаграфічнага таварыства плануюць аднавіць даўно страчаную традыцыю. Пра гэта "К" у свой час пісала.

■■■

Ратаванне аматарскіх кінафотаархіваў на сённяшні дзень — гэта дзялянка выключна энтузіястаў. Ні музеі, ні "сапраўдныя" архівы такіх калекцый у сябе не ствараюць. Хаця цалкам відавочна, што цана падобных артэфактаў будзе расці год ад года. А вось верагоднасць знайсці новы матэрыял змяншаецца ў адваротнай прагрэсіі.



Па-першае, старыя стужкі знікаюць самі сабою: пры пераездах, рамонтах ды іншых нагодах "развітацца з мінулым". А па-другое — іх фізічны век даволі нядоўгі.

— Жыццё кінастужкі доўжыцца прыблізна столькі ж, колькі і жыццё чалавека, — кажа Андрэй Скуратовіч. — Гадоў сто — гэта амаль максімум, прычым пры вельмі спрыяльных умовах захоўвання. Адпаведна, нам трэба спяшацца…

К

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.". (У рамках экспазіцыі дзейнічае выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.

Выставы:

■ Выстава **"Гоя... Пікаса"** (графіка са збору Каралеўскай акадэміі прыгожых мастацтваў, Мадрыд, Іспанія) — да 17 красавіка.
■ Выстава **"Час і творчасць Льва Бакста"** — да 17 красавіка.
■ Выстава твораў Юрыя Макарава **"Музыка вясны"** — да 11 красавіка.
■ **«Гераіка і лірыка мінулага стагоддзя»** — рускі жывапіс са збору музея — да 25 мая.
■ Выстава **«Кераміка Палесціны»** (прадстаўлена традыцыйная кераміка з горада Хеўрона — традыцыйнага ганчарнага цэнтра Палесціны) — да 24 красавіка.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

Выстава:

■ **"Віленскі альбом" Яна Казіміра Вільчынскага"** — да 17 красавіка.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Да самага Вялікадня кожную нядзелю музей запрашае на майстар-клас **"Пісанкі"** па роспісе найважнейшага атрыбута свята — размаляваных велікодных яек. Пачатак а 12-й.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выставы:

■ Выставачны праект **"Гандаль Беларусі на шалях гісторыі"** — да 1 чэрвеня.
■ Міжнародны выставачны праект **"Усё жыццё ў адным ровары"**.
■ Выстава **"Баявыя нагалоўі засцерагальнага ўзбраення і харугвы беларускіх зямель XI — XVII стст."** — да 10 чэрвеня.
■ Выставачны праект **"Беларусь. 30 год пасля Чарнобыля"** — з 5 да 20 красавіка.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыі:

■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".
■ Выстава **"Зброя і гонар. Татары на службе ВКЛ"** — да 3 красавіка.
■ Інтэрактыўная выстава **"Вар'яцкая лабараторыя"**, падрыхтаваная сумесна з мінскім музеем папулярнай навукі "Элемента" — да 3 ліпеня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9а. Тэл.: 237 46 94.

■ Выстава **"Мумміі свету"** — да 6 мая.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.

■ Выстава **"Лукамор'е"** (фігуры, якія рухаюцца) — да 1 чэрвеня.
■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 5 верасня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
■ Выстава **"Грані майстэрства"** — да 18 красавіка.
■ Выстава **"Верасковы мёд у парыжскім "Вуллі"** — да 30 красавіка.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выставы:

■ **"Аўтамабіль на далоні"**.
■ Выстава аўтарскіх і абераганочых лялек **"Таямніцы чароўнага лесу"** — да 10 красавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
■ Выстава па матывах новага беларускага анімацыйнага фільма **"Марк Шагал. Пачатак"** — да 10 красавіка.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе:
пн. — выхадны,
аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,
сер. — ад 12-й да 20-й.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Беларусь — радзіма марскіх герояў"** — да 24 красавіка.
■ Выстава **"Не жанчыны прыдумалі вайну..."** — да 24 красавіка.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Мастацтва ў камені"** — да 1 мая.
■ Выстава **"Фрагменты"** — да 3 красавіка.

Выставачная зала сектара экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці

■ Выстава **"Адлюстраванне"** — да 24 красавіка.

Ратуша

■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Уецца веер акрылены"** (сумесны праект музея "Замкавы комплекс "Мір" і вядомага калекцыянера Ігара Сурмачэўскага) — да 5 верасня.
■ Выстава **"Скарбы князёў Радзівілаў у Скарбцы Мірскага замка"** — да 28 мая.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выставы:

■ Выстава работ пецярбургскага мастака Ігара Шаймарданава **"Вясёлы Пушкін"** — да 23 красавіка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:

■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстава:

■ **"Узнагароды краін свету"** (з фондаў Тракайскага гістарычнага музея) — да 10 красавіка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва".**

Выстава:

■ Выстава твораў Маргарыты і Людмілы Шчамялёвых **"Фарбы і ніці"** — да 3 красавіка.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганараваму грамадзяніну г.Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выставы:

■ Выстава работ Галіны Сакалоўскай **"Прыгажосць свету ў бляску камянёў Swarovski"** — да 3 красавіка.
■ Выстава **"Свет імпрэсіянізму"** — да 3 красавіка.
■ Выстава Ўладзіміра Масленікава **"Прастора і час"** — з 6 да 24 красавіка.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстава:

■ Выстава графікі і скульптуры Уладзіміра Даўгялы і Сяргея Аганава **"Гонар. Годнасць"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыі:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ "Народныя іконы Беларусі 2-й пал. XIX ст.".

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЯСТА"

г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

■ Выстава ў рамках праекта **"KOLO-ART"** (работы мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія працуюць у кірунку мастацкага тэкстылю) — да 27 красавіка.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея".**
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст.".**
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выставы:

■ Выстава работ вядомага ізраільскага фотамастака Барыса Равіча **"Маімі вачыма"** — да 10 красавіка.
■ Выстава **"Мумміі свету"** — да 8 мая.
■ Выстава пейзажнай фатаграфіі Віктара Босака **"Палескія матывы"** — да 3 красавіка.
■ Выстава **"Керамічны цуд з Гжэлі"** — творы майстроў мастацтва і дызайну Гжэльскага дзяржаўнага ўніверсітэта — да 24 красавіка.

Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выставы:

■ Выстава **"Кнігі ў белых халатах"** — медыцынскія выданні XIX — пачатку XX стст. з аддзела рэдкай кнігі Гомельскай абласной бібліятэкі.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстава:

■ Выстава **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад

■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл".**

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Па праве Памяці"**, прысвечаная Чырвонай арміі першай паловы XX стагоддзя, з фондаў музея.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выставы:

■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Музейна-вобразная зала **"Як жылі нашы продкі"**.
■ Выстава **"Праваслаўныя храмы Лідскага краю"**.
■ Выстава **"Ад пяра гусінага да камп'ютара сучаснага"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.

ГАЛЕРЭІ

"Універсітэт культуры"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Выстава **"Прыпавесці"** міжнародных майстар-класаў іканапісу ў Навіцы (Польшча) — да 9 красавіка.
■ Выстава ласкутнага шыцця ў рамках міжнароднага праекта **"Трыкатажныя куплеты-2016"**) — да 9 красавіка.
■ Выстава жывапісу Генадзя Сухамлінава — да 9 красавіка.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.

■ Выстава жывапісу Алы Каласенцавай **"Колер. Рэальнасць. Фантазія"** — да 12 красавіка.
■ Выстава секцыі БСМ "Традыцыя" **"Наша сучаснасць"** — да 12 красавіка.
■ Юбілейная мастацкая выстава Мікалая Кухарэнкі — да 12 красавіка.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

■ **2 — "Турандот"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Пучыні.
■ **3 — "Чыпаліна"** (балет у 3-х дзеях) К.Хачатурана. Пачатак а 12-й.
■ **3 — "Травіята"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Вердзі.
■ **5 — "Макбет"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Вердзі. Прэм'ера.
■ **6 — "Трыстан і Ізольда"** Р.Вагнера; **"Шапэніяна"** Ф.Шапэна; **"Балеро"** М.Равэля (балеты ў адной дзеі).
■ **7 — "Кармэн"** (опера ў 3-х дзеях) Ж.Бізэ.
■ **8 — "Жар-птушка"** І.Стравінскага, **"Шахразада"** М.Рымскага-Корсакава (балеты ў адной дзеі).
■ **8 — "Гармонія дуэта"** — музычныя вечары ў Вялікім (камерная зала імя Л.П. Александроўскай).
■ **9 — "Жар-птушка"** (балет у адной дзеі) І.Стравінскага. Пачатак а 12-й.
■ **9 — "Паяцы"** Р.Леанкавала (опера ў 2-х дзеях).

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.

■ **2 — "А мне не сорамна!.."** (больш, чым казка) Л.Усцінава. Пачатак а 12-й.
■ **2 — "Сталіца Эраўнд"** (парадаксальная камедыя) С.Гіргеля.
■ **3 — "Адэль"** (гісторыя кахання) Я.Таганава.
■ **5 — "Тры Жызэлі"** (драма) А.Курэйчыка.
■ **6 — "Кантракт"** (камедыя) Ф.Вэбера.
■ **7 — "Любоў людзей"** (пасялковая меладрама пасярод 70-х) Д.Багаслаўскага.
■ **8 —"Ціхі шоргат сыходзячых крокаў"** (сон у 2-х дзеях) Д.Багаслаўскага.
■ **9 — "Гісторыя двух сабак"** (спектакль для дзяцей і дарослых) Я.Конева. Пачатак а 12-й.
■ **9 — "Нязваны госць"** (сямейная меладрама) С.Бартохавай.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

■ **3 — "Баль у Савое"** (аперэта ў 2-х дзеях) П.Абрахама.
■ **4 — "Дуброўскі"** (мюзікл у 2-х дзеях) К.Брэйтбурга.
■ **6 — "Блакітная камея"** (мюзікл у 2-х дзеях) К.Брэйтбурга.
■ **7 — "Бабін бунт"** (музычная камедыя ў 2-х дзеях) Я.Пцічкіна.
■ **8 — "Юнона" і "Авось"** (рок-опера) А.Рыбнікава.
■ **9 — "Бураціна.BY"** (мюзікл для дзяцей і дарослых у 2-х дзеях) А.Рыбнікава. Пачатак у 11.30.
■ **9 — "Шалом Алейхем! Мір вам, людзі!"** (мюзікл у 2-х дзеях) А.Хадоскі.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **2 — "Цудоўная скрыня з зялёным гарошкам"** (для дзяцей ад 5 —7 гадоў). Пачатак аб 11-й.
■ **3 — "Умка"** (кранальная гісторыя на адну дзею) Ю.Якаўлева. Пачатак аб 11-й.
■ **9 — "Папялушка, або Крышталёвыя чаравічкі"** Ш.Пяро. Пачатак аб 11-й.